
ШТО ХВАЛЮЕ ПЕДАГОГАЎ? 2

ЯКІЯ ПРАЕКТЫ ПРАПАНУЕ ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ МС




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 СНЕЖНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 237 (29351)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ШУМІЛІН, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:**

*«Моладзь у нас таленавітая, заўсёды ёсць шмат ідэй, задумак, пры гэтым неабходна аддаваць увагу пытанням камерцыялізацыі навукова-тэхнічных распрацовак, бізнес-адукацыі. Важна ствараць умовы для арыентацыі распрацовак не толькі з пункту гледжання тэарэтычнай і практычнай навукі, але і стварэння камерцыйных структур».*

# «ВОЛАТАЎ» РОБЯЦЬ У БЕШАНКОВІЧАХ



Фота БелТА.

«Волат» у нашым выпадку — не нейкая магутная машына. Гэта маленькая гліняная свістулька-бразготка, якую са старадаўніх часоў рабілі на Віцебшчыне. І яна мае статус антрапаморфнай (падобнай на чалавека), што таксама сведчыць аб яе старажытнасці. Тэхналогію вырабу «Волата» аднавіла Алеся АЎЧЫННІКАВА, дырэктар Бешанковіцкага раённага дома рамёстваў. Дзякуючы стараннем майстрыхі, тэхналогія вырабу гліняных народных цацак аршанскага Падняпроўя і віцебскага Прыдзвіння нядаўна была ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі.

## КОРАТКА

- Цэнтр біятэхналогій адкрыўся ў НАН Беларусі.
- **Дабрачынны марафон «Сагрэем дзіцячыя сэрцы» праходзіць у Магілёўскай вобласці.**
- Сёння ў цэнтры культуры «Віцебск» пройдуць рэгіянальныя адборы да XXX Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2021» і XIX Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2021».
- **Выстаўка да 250-годдзя з дня нараджэння Бетховена праходзіць у Акадэміі музыкі.**
- Лясгасы плануюць паставіць для рэалізацыі ў Мінску каля 30 тысяч жывых елак.



Па палічках

# ЕЖА ЯК ЛЯКАРСТВА

Што з'есці, каб стаць здаравейшым?



СТАР. 5

Размова па сутнасці

# Спажыўца паслугі трэба пачуць і зразумець

**Міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ аб закрыцці палігонаў, уплыве каранавіруса, закліках да неплацяжу за камунальныя паслугі і найбліжэйшых перспектывах**

**Андрэй Хмель — з катэгорыі маладых ды перспектыўных кіраўнікоў: узначаліў жыллёва-камунальную гаспадарку краіны ў 37-гадовым узросце параўнальна нядаўна — усяго паўгода мінула з моманту яго прызначэння на гэтую высокую дзяржаўную пасаду. Да міністэрскага крэсла працаваў намеснікам міністра іншага ведамства — прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, але жыллёва-камунальная гаспадарка для яго не новы, а хутчэй добра вядомы кірунак работы. Некалькі гадоў таму Андрэй Валер'евіч пераехаў у сталіцу з пасады гендырэктара «Гродзенскай гарадской ЖКГ». Менавіта яму на той час была адведзена адна з ключавых роляў у так званай смеццевай вайне абласнога цэнтра — гаворка аб заваранні смеццеправодаў у шматпавярховіках і ўкараненні прынцыпаў паасобнага збору смецця гараджанамі. Тады ўсё атрымалася, і наша інтэрв'ю распачалося з тэмы маштабавання гэтага вопыту на ўсю краіну.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

Трэнды

# МЕДЫЯ НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

## Куды рушаць айчынныя СМІ?

**У Палаце прадстаўнікоў прайшоў круглы стол на тэму «Сродкі масавай інфармацыі ў палітычным працэсе. Актуальныя аспекты заканадаўчага рэгулявання».**

Асноўныя бітвы за Беларусь сёння праходзяць не на вуліцы, а ў інфармацыйным полі. Такое меркаванне падчас круглага стала выказаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ,** перадае БелТА.



Фота БелТА.

«Нам не ўпершыню сутыкацца з адкрытай праваакатарскай дзейнасцю прадстаўнікоў шэрагу апазіцыйных і замежных медыя. Але 2020 год для нашага інфаполя выдаўся асабліва напружаны. У пагоні за сенсацыямі асобныя СМІ, якія больш правільна называць сродкамі масавай маніпуляцыі, а не інфармацыі, неаб'ектыўна асвятлялі падзеі ў нашай краіне, станавіліся памагатымі арганізатараў несанкцыянаваных выступленняў, імкнучыся надаць ім радыкальны, антыдзяржаўны характар», — адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Андрэй Кунцэвіч падкрэсліў, што падзеі 2020 года паказалі, наколькі важна мець не толькі актуальную заканадаўчую базу, але і напрацоўваць адпаведную практыку яе прымянення. «На жаль, і гэта трэба адкрыта прызнаць, на пэўным этапе мы сутыкаліся з непаваротлівасцю, некампетэнтнасцю і пасіўнасцю ў адстойванні дзяржаўных інтарэсаў з боку асобных ведамстваў. Часта Міністэрству інфармацыі даводзілася змагацца ў адзіночку. Больш за тое, у Адміністрацыі Прэзідэнта па-ранейшаму няма ўпэўненасці ў тым, што мы цалкам выбудавалі гэты працэс. Яшчэ раз падкрэслю, што ў сітуацыі, калі ёсць пагроза інфармацыйнай бяспецы краіны, усе без выключэння дзяржаўныя органы абавязаны прымаць меры па яе абароне. Пры гэтым па-ранейшаму лічу недапушчальным пакідаць па-за ўвагай факты, калі пад сцягамі «свабоды слова і дэмакратыі» штучна нагнятаецца напружанасць у грамадстве, ідзе мэтанакіраванае нацкоўванне адных беларусаў на іншых», — заявіў ён.

Асобная тэма для абмеркавання — інтэрнэт-супольнасці. «З майго пункту гледжання, патрэбны сапраўды новыя рашэнні, у тым ліку і на заканадаўчым узроўні, якія дазваляюць рэгламентаваць работу з кантэнтам у сацыяльных сетках і месенджараў, якія для многіх замяняюць традыцыйныя крыніцы інфармацыі. Шэраг краін не саромеюцца ісці такім шляхам. Я мяркую, што іх вопыт можа быць карысны і ў нашых рэаліях», — адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

«Мы ўпершыню ў гісторыі суверэннай Беларусі апынуліся ў стане зацяжной, шырокамаштабнай, не намі развязанай інфармацыйнай вайны, — такую думку падчас круглага стала выказаў **міністр інфармацыі Ігар ЛУЦКІ.** — Вайны вельмі разнастайнай па наборы



Фота БелТА.

прымяняемых метадаў і спосабаў яе вядзення, нацэленай не проста на нанясенне шкоды дзяржаве, а на яе знішчэнне». У эпоху фэйкавых канвеераў важнай задачай з'яўляецца развіццё нацыянальнай медыяпрасторы, перакананы Ігар Луцкі. «Падзеі апошніх месяцаў выразна вызначылі праблемы будаўніцтва новай медыяпрасторы. Перш за ўсё, за кошт фарміравання пула моцных інфармацыйных рэсурсаў кросплатформенных СМІ, здольных аднолькава паспяхова працаваць у розных асяроддзях па распаўсюджванні інфармацыі — ад тэлевяшчання да сацсетак і Telegram. Плюс сістэмная падтрымка, магчыма, грантавая, ужо сапраўды інфармацыйная, малых медыйных фарматаў, напрыклад блогераў», — лічыць міністр інфармацыі.

Разам з тым, паводле яго слоў, у эпоху татальнай постпраўды і фэйкавых канвеераў аднымі мерамі абароны не абысціся. «Важная задача — развіццё ўласнай нацыянальнай інфармацыйнай прасторы. І туды трэба ўкладваць значна больш інтэлектуальных і матэрыяльных рэсурсаў. Мне здаецца, што на цяперашні момант мы ў гэтым сэнсе недапрацоўваем. І тут пытанне не толькі ў новых тэхналогіях і абсталяванні, а ў заваёўванні і ўтрыманні аўдыторыі шляхам правільнай рэдакцыйнай палітыкі, арыентаванай на актуальныя запыты грамадства, на дасягненне максімальнай цікавасці і даверу грамадзян. Толькі такім чынам мы зможам падняць канкурэнтаздольнасць сваіх медыйных рэсурсаў і зможам актыўна пацясніць апанентаў на іх полі», — дадаў міністр.

Па словах міністра, медыяландшафт за апошнія паўгода больш чым істотна змяніўся». Я кажу паўгода, таму што рашучыя змены, якія нясуць відавочную пагрозу нацыянальнай бяспецы дзяржавы, з'явіліся да прэзідэнцкіх выбараў. Цяпер мы маем справу з новай інфармацыйнай рэальнасцю, да якой, будзем шчырыя, аказаліся не зусім гатовыя, у тым ліку і ў частцы прававога рэгулявання», — адзначыў ён.

Ігар Луцкі падкрэсліў, што інфармацыйная вайна, як паказвае вопыт нашых суседзяў, патрабуе іншых падыходаў. «У найбліжэйшай перспектыве нам трэба будзе стварыць эфектыўна дзеючы механізм аператыўнага заканадаўчага рэагавання на змены інфармацыйнай абстаноўкі. Мэта — максімальна хутка адказваць на выклікі і пагрозы праз удасканаленне прававых інструментаў», — дадаў ён.

Падчас круглага стала прагучала інфармацыя наконт новых інфармацыйных фарматаў работы парламента. Напрыклад, разглядаецца пытанне арганізацыі інтэрнэт-трансляцый пасяджэнняў з Авальнай залы, паведаміў **старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўні-**



Фота БелТА.

**коў Генадзь ДАВЫДЗЬКА.** «На вясновую сесію, хутчэй за ўсё, мы ўжо выйдзем з трансляцыямі ў інтэрнэт-фармаце на сайце Палаты прадстаўнікоў», — расказаў парламентарый.

Сацыяльны ракурс

# ШТО ХВАЛЮЕ ПЕДАГОГАЎ?

## Якія крытэрыі робяць датэрміновую прафесійную пенсію — недасягальнай...

**Па даных статыстыкі, сярэднямесячная заработная плата за студзень—кастрычнік бягучага года ў галіне адукацыі склала 852,7 рубля, або 69,6 % ад узроўню сярэдняй заработнай платы ў краіне (1224,5 рубля). У педагагічных работнікаў сярэдні заробак за гэты перыяд склаў 979,1 рубля, або 80 % ад сярэдняга заробку па краіне: у тым ліку ў настаўнікаў — 1030,1 рубля, або 84,1 % і ў прафесарска-выкладчыцкага саставу — 1492,1 рубля, або 121,9 % ад сярэдняга заробку па краіне. За дзевяць месяцаў рост намінальнай налічанай заработнай платы склаў 105,9 %, а рэальнай — 101,1 %. Гэтыя лічбы былі агучаны падчас пленума Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.**

### НОВАЯ СІСТЭМА АПЛАТЫ

Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі, якія аказваюцца насельніцтву, у верасні 2020 года ў параўнанні са снежнем 2019-га склаў 104,7 %. Такім чынам, рост намінальнай заработнай платы ў галіне адукацыі пакрывае толькі рост цэн на тавары і паслугі, а рэальнай — яшчэ ніжэйшы...

— З 1 студзеня бягучага года ў краіне дзейнічае новая сістэма аплаты працы работнікаў бюджэтных галін, якая спачатку выклікала нямала пытанняў, — канстатавала **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Тацціяна РАМАНОВІЧ.** — Для аператыўнага рэагавання на іх з 23 студзеня да 28 лютага мы арганізавалі «гарачую лінію», падчас якой было разгледжана больш як 300 зваротаў работнікаў адукацыі, якія датычыліся памераў налічанай заработнай платы. Усе яны правяраліся з выхадам на месца, і факты зніжэння заработнай платы не пацвердзіліся. Гэта вельмі важны момант, бо яшчэ на этапе распрацоўкі новай сістэмы аплаты працы пазіцыя галіновага прафсаюза і Міністэрства адукацыі была адзіная — не дапусціць зніжэння памераў заработнай платы ў работнікаў нашай сферы. Маніторынг выканання дзеючага заканадаўства па аплаце працы працягваецца.

Тацціяна Якубовіч паведаміла, што ў ходзе сустрэч кіраўнікоў тэрытарыяльных арганізацый з калектывамі быў складзены пералік праблемных пытанняў, якія ёсць на месцах. Усе яны былі накіраваныя ў Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі і Міністэрства адукацыі.

Так, у прыватнасці, была ўнесена прапанова па ўмацаванні тарыфнай часткі заработнай платы работнікаў шляхам перагляду базавай стаўкі ў бок павелічэння для таго, каб узровень заработнай платы быў не ніжэйшы за мінімальную заработную плату. З 1 студзеня 2020 года заработная плата, ніжэйшая за мінімальную заработную плату, на жаль, засталася ў арганізацыях сістэмы адукацыі, прычым не толькі ў абслуговага персаналу.

### ПРАЦЯГЛАСЦЬ АДПАЧЫНКАЎ

Застаюцца праблемнымі таксама пытанні прафесійнага пенсійнага страхавання педагагічных работнікаў. Для іх вырашэння патрабуецца перагляд Пераліку ўстаноў, арганізацый і пасад, а таксама крытэрыяў ацэнкі ўмоў працы педагагічных работнікаў для мэт прафесійнага пенсійнага страхавання.

Цяпер у Пераліку засталіся пасады настаўнікаў, выхавальнікаў, выхавальнікаў дашкольнай адукацыі, настаўнікаў-дэфектолагаў, выкладчыкаў і бацькоў-выхавальнікаў. Выйсці на датэрміновую прафесійную пенсію можна пры ўмове ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці ў аб'ёме не менш за 18 гадзін у тыдзень (не менш за 20 гадзін у тыдзень — для настаўнікаў-дэфектолагаў), выканання арганізацыйна-выхаваўчай работы і ажыццяўлення дадатковага кантролю за вучэбнай дзейнасцю вучняў. Зыходзячы са спецыфікі навучальных прадметаў немагчыма выканаць крытэрый — ажыццяўленне дадатковага кантролю за вучэбнай дзейнасцю вучняў — настаўнікам працоўнага навучання, музыкі і спеваў, фізічнай культуры і здароўя ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Службовымі абавязкамі выхавальнікаў школ, школ-інтэрнатаў, настаўнікаў-дэфектолагаў не прадугледжана выкананне арганізацыйна-выхаваўчай работы і ажыццяўленне дадатковага кантролю за вучэбнай дзейнасцю вучняў.

— Намі таксама прапанавана вярнуцца да разгляду пытання па вяртанні ранейшай працягласці працоўных адпачынкаў (42 каляндарныя дні) педагагічным работнікам устаноў дадатковай адукацыі, метадычных службаў, прафесарска-выкладчыцкаму саставу і педагагічным работнікам устаноў дадатковай адукацыі дарослых з мэтай недапушчэння адтоку высокакваліфікаваных спецыялістаў з гэтых пасад і павышэння іх сацыяльнага статусу, — падкрэсліла Тацціяна Якубовіч.

З мэтай замацавання на месцах выпускнікоў і задавальнення патрэб эканомікі і сацыяльнай сферы ў спецыялістах, рабочых і служачых галіновым прафсаюзам была ўнесена прапанова аб вызваленні маладых спецыялістаў ад выплаты падаходнага падатку на перыяд абавязковай адпрацоўкі або зніжэнні стаўкі падатку да 50 %.

### ГАРАНТЫІ ПАДАЎЖЭННЯ КАНТРАКТАЎ

Сістэматычна, як правіла, два разы на год (па стане на 1 красавіка і 1 лістапада) ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ладзіць маніторынг прымянення кантрактнай формы найму, падчас якога асаблівая ўвага аддаецца заключэнню кароткатэрміновых кантрактаў. Па стане на 1 лістапада кантрактнай формай найму было ахоплена 89,1 % ад агульнай колькасці работнікаў у галіне. У параўнанні з красавіком колькасць кантрактаў, заключаных тэрмінам на адзін год, зменшылася на 0,7 % і на пачатак бягучага месяца згаданы паказчык складае 73 324, або 21,5 % ад агульнай колькасці заключаных кантрактаў.

Як правіла, кароткатэрміновыя кантракты прымяняюцца да работнікаў, зноў прынятых на работу, пераведзеных на іншую пасаду (прафесію), або да асоб, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, а таксама па пісьмовых заявах альбо са згоды саміх работнікаў.

Тацціяна Якубовіч падкрэсліла, што ў мэтах абароны інтарэсаў работнікаў і зніжэння колькасці кароткатэрміновых кантрактаў Галіновае пагадненне з Міністэрствам адукацыі на 2019—2022 гады прадугледжвае пэўныя гарантыі, якія знаходзяць адлюстраванне ва ўсіх абласных і Мінскім гарадскім пагадненнях.

Улічваючы, што ініцыятыва Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі па пашырэнні гарантый падаўжэння кантрактаў з добрасумленнымі работнікамі падтрымана і з 28 студзеня 2020 года замацавана на заканадаўчым узроўні, работа ў гэтым кірунку патрабуе далейшай пільнай увагі, у тым ліку пры ажыццяўленні прафсаюзнымі арганізацыямі грамадскага кантролю.

Як заўважыла Тацціяна Якубовіч, у бягучым годзе ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй вялікая частка прафсаюзных сродкаў была накіравана на падтрыманне здароўя членаў прафсаюза. Яго арганізацыйныя структуры з красавіка да кастрычніка ўключна на выдаткавалі на гэтыя мэты амаль 2,4 мільёна рублёў, з іх 645 267 рублёў — на набыццё сродкаў аховы, бескантактавых тэрмометраў, сродкаў асабістай гігіены, сродкаў дэзынфекцыі, дазатараў і іншае. Таксама членам прафсаюза была аказана матэрыяльная дапамога на суму 1,7 мільёна рублёў (яе атрымалі 30 834 чалавекі).

### НАДБАЎКІ І ДАПЛАТЫ

**Намеснік міністра адукацыі Сяргей РУДЫ,** які прыняў удзел у пленуме, праінфармаваў, што ўрадам краіны распрацаваны падыходы па паэтапным павышэнні заработнай платы педагагічных работнікаў да 2025 года. Яны былі падтрыманы кіраўніком дзяржавы. Плануецца, што да 2025 года сярэдняя заработная плата педагагічных работнікаў вырасце да 100 працэнтаў ад узроўню сярэдняй заработнай платы па краіне, а прафесарска-выкладчыцкага саставу — да 150 працэнтаў.

Цяпер падрыхтаваны праект пастановы, згодна з якой плануецца павышэнне акладаў выхавальнікам устаноў дашкольнай адукацыі і памочнікам выхавальнікаў. Таксама падрыхтаваны праект дакумента, які прадугледжвае перагляд надбавак і даплат розным катэгорыям работнікаў сістэмы адукацыі.

Ва ўмовах каранавіруснай інфекцыі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі працягваюць функцыянаваць. Па словах Сяргея Рудага, з улікам спецыфікі сённяшняга дня Міністэрства адукацыі накіравала на месцы рэкамендацыі па дадатковым стымуляванні педагагічных работнікаў, якія ажыццяўляюць дадатковую работу з навучэнцамі, што не наведваюць установы адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Бобруйсктранс»

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Станок токарный 1К625, 1971 г. в. Мощность электродвигателя главного привода – 10 кВт, габаритные размеры (длина*ширина*высота) – 3212*1216*1349 мм, масса – 2410 кг | 1075,20 | 107,52 | 53,76 |
| 2 | Электротельфер, высота подъема – 18,0 м (инв. № 3023/1) | 310,80 | 31,08 | 15,54 |
| 3 | Электротельфер ТЭ-0,5, высота подъема – 6,3 м (инв. № 2229/1) | 294,00 | 29,40 | 14,70 |
| 4 | Электротельфер ТЭ-0,5, высота подъема – 6,3 м (инв. № 2209/1) | 294,00 | 29,40 | 14,70 |
| 5 | Прицеп Шмитц заводской номер 035810, длина – 7055 мм, ширина – 2530 мм, высота – 2040 мм, снаряженная масса – 4600 кг, максимально допустимая масса – 18000 кг, грузоподъемность – 13400 кг, количество осей – 2 (инв. № 67288/1) | 1 596,00 | 159,60 | 79,80 |
| 6 | Автомобиль МАЗ -555102, двухосный самосвал для перевозки и разгрузки грузов, г/п – 10 т (инв. № 10400) | 7 476,00 | 747,60 | 453,60 |
| 7 | Автомобиль ГАЗ-3307 холодильная установка, г/п – 4500 кг, (инв. № 115091/1/11410) | 2 604,00 | 260,40 | 130,20 |
| 8 | Подъемник ПТО-16, г/п-10т, рабочий ход стоек – 575 мм, редуктор – червячный, мощность электродвигателя – 3кВт. Габаритные размеры мм: 1174*1110*1310. высота с выдвинутыми стойками – 1885 мм (инв. № 2385/1) | 1 344,00 | 134,40 | 67,20 |
| 9 | Подъемник ПП-3, макс. г/п – 3 т, номин. г/п 3 т, макс. высота подъема подхватов от уровня пола – 1900 мм. Установленная мощность – 3 кВт, количество стоек – 2 шт., количество электродвигателей – 2 шт. Габариты стойки, мм – 1400*1180*2900. Привод ходового винта от червячного редуктора. Масса подъемника – 900 кг (инв. № 10703) | 1 814,40 | 181,44 | 90,72 |
| 10 | Электротельфер ТЭ-0,5, высота подъема – 6,3 м, мощность двигателя 1,7+0,18 кВт, радиус поворота пути – прямой путь, наибольшая нагрузка на каток – 3 кН, масса тали – 184 кг | 310,80 | 31,08 | 15,54 |
| 11 | Кран-балка электрическая опорная г/п 2 тонны. Пролет 9 м, высота подъема 6 м. | 907,20 | 90,72 | 45,36 |
| 12 | Кран-балка электрическая опорная г/п 1тонна. Пролет 7м, высота подъема 6 м. | 814,80 | 81,48 | 40,74 |
| 13 | Электротельфер ТЭ-200 Высота подъема – 6,3 м, мощность двигателя 1,7+0,18 кВт, радиус поворота пути – прямой путь, наибольшая нагрузка на каток – 7,0 кН, масса тали – 213 кг | 579,60 | 57,96 | 28,98 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся вторые повторные торги. Цена снижена на 30 %. Ранее публикации размещались в газете «Звязда» по лотам № 1-13 – № 143 от 25.07.2020 г., № 174 от 08.09.2020 г., по лотам №№ 2–13 – № 201 (29315) от 15.10.2020 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **16 декабря 2020 года в 13.00 (регистрация с 12.30 до 12.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1121 |
| **Прием заявлений** | **Начало приема заявлений в 10.00 04.12.2020 г. Окончание приема заявлений в 16.00 15.12.2020 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121** |
| **Местонахождение имущества** | г. Бобруйск ул. Минская, 123/1 |
| **Условия для участия в торгах** | 1. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info.**<br>2. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту №_, принадлежащему ОАО «Бобруйсктранс», проводимых __.__.____. **Срок внесения задатка: – с 04.12.2020 в 10.00 по 15.12.2020 в 16.00.**<br>3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).<br>4. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (пять процентов от конечной цены предмета торгов) и затрат по размещению публикации в газете на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.<br>Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.<br>Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 5 (пяти) дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов.<br>5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться к Сергею Григорьевичу (+375 29 157 51 90) и Людмиле Ивановне (+375 29 642 42 10).<br>7. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.<br>8. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества возлагаются на Победителя аукциона |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Бобруйсктранс», 213830, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул Минская,123/1 (ликвидатор – Луковская Ирина Степановна, 212030, Могилев-30, а/я 27, +375 29 629 95 02)** |

В **суд Ошмянского района Гродненской области** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим СНЕЖКО Олега Збигневича (персональный номер 3090371K047PB4), 09 марта 1971 года рождения, уроженца г. Ошмяны Гродненской области, проживавшем в д. Повишни Ошмянского района Гродненской области, ул. Светлая, д. 8.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Снежко Олеге Збигневиче, сообщить их суду Ошмянского района Гродненской области (231103, г. Ошмяны, ул. Советская,39) в течение двух месяцев с момента публикации данного объявления.

### Сацыяльны вектар

# АДУКАЦЫЯ І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

## Перспектыва для людзей з інваліднасцю

**На дзяржпраграму «Сацыяльная абарона» плануецца накіраваць больш за 4 млрд рублёў, аб гэтым паведаміла міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ падчас круглага стала «Сацыяльная падтрымка сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў», што праходзіў у Беларускім пратэзна-артапедычным аднаўленчым цэнтры. Там міністр абмяркоўвала з бацькамі дзяцей-інвалідаў як дзейсныя, так і планаваныя меры дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, дзе выхоўваюць дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.**

«Галоўнай задачай дзяржавы стала стварэнне для людзей з інваліднасцю ўсіх умоў для паўнавартаснага жыцця ў соцыуме, — сказала Ірына Касцевіч.— Падчас рэалізацыі праграмы сацыяльнай падтрымкі за бягучую пяцігодку была праведзена вялікая работа па многіх кірунках».

За перыяд з 2016 да 2020 года больш за 13 млрд рублёў накіравалі на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама на выплату пенсій, дапамог па доглядзе інвалідаў I групы і аказанне падтрымкі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.

Акрамя таго, падчас рэалізацыі праграмы пяцігодкі каля 2,3 млрд рублёў выдаткавана на падпраграмы «Папярэджанне інваліднасці і рэабілітацыя інвалідаў», «Безбар'ернае асяроддзе жыццядзейнасці інвалідаў і фізічна аслабленых асоб», «Сацыяльная інтэграцыя інвалідаў і пажылых грамадзян». На арганізацыю сацыяльнага абслугоўвання сышло каля 1,6 млрд рублёў.

«На наступную пяцігодку ўжо падрыхтавана новая дзяржпраграма «Сацыяльная абарона», у рамках якой рэалізуем дзве падпраграмы — «Сацыяльнае абслугоўванне і сацыяльная падтрымка» і «Даступнае асяроддзе жыццядзейнасці інвалідаў і фізічна аслабленых асоб». Агульны аб'ём фінансавання складзе больш за 4 млрд рублёў», — паведаміла Ірына Касцевіч.

Павышаць якасць жыцця інвалідаў у найбліжэйшай перспектыве будуць па некалькіх кірунках. Гэта стварэнне ўмоў для атрымання асобамі з абмежаванымі магчымасцямі адукацыі, а таксама наступнае працаўладкаванне па атрыманай спецыяльнасці. Удзеляць увагу паляпшэнню якасці і эфектыўнасці рэабілітацыйных мерапрыемстваў, працягнуць павышаць узровень даступнасці для інвалідаў аб'ектаў сацыяльнай, транспартнай і вытворчай інфраструктуры, жылых памяшканняў.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

### Надвор'е

# СНЕГ З ДАЖДЖОМ, А ПОТЫМ ХОЛАДНА

## На наступным тыдні ўначы падмарозіць да мінус 10 градусаў

**Ужо традыцыйна ў снежні слаба марознае надвор'е досыць хутка чаргуецца з працяглымі адлігамі. Але снег ужо выпаў. Паводле апошніх звестак, паўсюдна ў Беларусі ўсталявалася снежнае покрыва вышынёй 1–7 сантыметраў, а на паўночным усходзе Віцебскай вобласці таўшчыня снегу складае 12 сантыметраў. І гэтым разам — усё як пад капірку, спачатку ў выхадныя пацяплее, а на наступным тыдні маразы ўзмоцняцца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Бліжэй да выхадных надвор'е пачне мяняцца. На нашы метэаўмовы ў асноўным будзе ўплываць перыферыя антыцыклону з цэнтрам над Сярэдняй Волгай, толькі ўначы ў суботу яшчэ захаваецца ўплыў вільготнай паветранай масы. У суботу будзе пераважна воблачна. Уначы месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень без істотных ападкаў. Па ўсходзе на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, ва ўсходніх раёнах — 1–3 марозу, аднак удзень па захадзе — 6–8 цяпла.

Больш халоднага ветру варта чакаць ужо ў нядзелю. У гэты дзень будзе воблачна з праясненнямі і пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні парывісты, у асобных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 7 градусаў па ўсходзе да 5 цяпла па захадзе краіны. Удзень будзе ад мінус 4 градусаў да плюс 3, у паўднёва-заходніх раёнах — 4–6 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня маразы ўзмоцняцца. Такім чынам, у панядзелак–аўторак, пры павышаным фоне атмасфернага ціску, паўднёва-ўсходні вецер пачне прыносіць паветра з Ніжняга Паволжа, дзе ўсталявалася анамальна халоднае надвор'е. Будзе пераважна без ападкаў. Месцамі на дарогах чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1–8 марозу, па ўсходзе пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Удзень будзе 1–6 градусаў ніжэй за нуль, у крайніх заходніх раёнах — ад нуля да плюс 2 градусаў.

Сіноптыкі адзначаюць, што снежань самы «несамавіты» і нясветлы месяц года. У сярэднім у Мінску за месяц бывае толькі 27 сонечных гадзін. Пры сярэдняй працягласці светлавога дня крыху больш за 7 гадзін зусім яснага надвор'я ў нашых шыротах у снежні не бывае. Толькі выпаўшы снег стварае дадатковае падсвятленне. Гэта працуе, калі ён сапраўды ёсць...

**Сяргей КУРКАЧ.**

### Блізкая ўлада

## У СУБОТУ, ДА АБЕДУ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 5 снежня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алёйзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Сусветныя цэны на прадукты харчавання рэкордна выраслі



Сусветныя цэны на харчовыя тавары выраслі ў лістападзе да самага высокага ўзроўню амаль за шэсць гадоў. Аб гэтым паведамілі ў Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАО). Індэкс цэн на прадукты харчавання ФАО ў лістападзе склаў 105 пунктаў, што на 3,9 % больш, чым у кастрычніку бягучага года, і на 6,5 % вышэй, чым у лістападзе мінулага года. У лістападзе выраслі ўсе субіндэксы. ФАО адзначае, што ўплыў пандэміі COVID-19, асабліва з пункту гледжання страты даходаў, з'яўляецца важным фактарам, які вызначае ўзровень харчовай бяспекі ў свеце. Пандэмія пагаршае і без таго нестабільныя ўмовы, выкліканыя канфліктамі, шкоднікамі і прыроднымі катаклізмамі, уключаючы нядаўнія ўраганы ў Цэнтральнай Амерыцы і паводкі ў Афрыцы.

## Долар упаў да шматгадовага мінімуму

Пра гэта паведаміў Bloomberg. Долар амаль дасягнуў самай нізкай адзнакі за год да брытанскага фунта стэрлінгаў. Да еўра, канадскага і аўстралійскага долараў, а таксама карэйскай воны долар ЗША знізіўся да мінімуму больш чым за два гады. Да швейцарскага франка долар апусціўся да мінімуму за пяць гадоў. Як вядома, амерыканскі долар з'яўляецца галоўнай сусветнай рэзервовай валютай. Попыт на яе рэзка ўпаў на фоне аптымізму з нагоды перамоваў аб стымуляванні амерыканскай эканомікі, з'яўлення эфектыўных вакцын ад каранавіруса і аднаўлення эканомікі Кітая. Раней найлепшай сёлетняй альтэрнатывай долару назвалі шведскую крону, якая за апошнія 11 месяцаў вырасла больш чым на 9 працэнтаў да амерыканскай валюты. Акрамя таго аналітыкі прапанавалі звярнуць увагу на юань.

## Навукоўцы высветлілі, што неандэртальцы вымерлі не з-за дыму ад вогнішчаў

Навукоўцы Лейдэнскага і Вагенінгенскага ўніверсітэтаў (Нідэрланды) абверглі гіпотэзу аб тым, што выміранне неандэртальцаў звязана з непераноснасцю таксічных кампанентаў дыму вогнішча. Аб гэтым паведаміла выданне Сібірскага аддзялення РАН «Наука из первых рук». Аказалася, што ў неандэртальцаў было больш варыянтаў генаў, якія нейтралізуюць шкоднае ўздзеянне таксінаў, а сучасныя людзі проста страцілі некаторыя з іх, «нягледзячы на больш моцную залежнасць ад агню», адзначаецца ў публікацыі.

Па звестках палеаантрапалогаў, неандэртальцы жылі ў Еўразіі 400—30 тысяч гадоў таму. Сучасным жыхарам гэтага кантынента ад 2 да 4 працэнтаў генаў дасталося менавіта ад неандэртальцаў.

# Спажыўца паслугі трэба пачуць і зразумець

## АДМОВІЦЦА АД МІНІ-ПАЛІГОНАЎ І АРГАНІЗАВАЦЬ РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ЦЭНТРЫ

***— Андрэй Валер'евіч, заварванне смеццеправодаў і ўстаноўка ў дварах кантэйнерных пляцовак — дзейсны спосаб для паасобнага збору смецця?***

— Механізм вырашаецца на мясцовым узроўні: калі выканкам бачыць, што ў яго больш гарадскога насельніцтва, то можна заварваць смеццеправоды, ставіць кантэйнеры для паасобнага збору смецця. Калі гэта сельскі населены пункт — пры распрацоўцы схемы абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі (далей — ЦКА) ён павінен вызначыць: ці будзе ставіць паасобныя кантэйнеры ў кожны дом (як мы рабілі ў Гродне), ці будаваць кантэйнерныя пляцоўкі, дзе будуць размешчаны кантэйнеры для паасобнага збору смецця. Але што тут важна? Перш за ўсё меркаванне чалавека, спажыўца паслугі па вывазе ЦКА, яго трэба пачуць і зразумець: калі большасць людзей выказваецца за паасобны збор на кожным падворку — калі ласка! Кожны мае права выбіраць сістэму збору.

Іншая праблема, што на сённяшні дзень вялікая колькасць дэпаніравання смецця на палігонах і малы аб'ём адходаў, якія праходзяць сартаванне.

***— Чаму так?***

— Таму што магутнасцяў недастаткова, а тыя, што ёсць — загружаны не цалкам. У Гродне, напрыклад, завод загружаны на 70 %. Ён можа дазагружацца за кошт Гродзенскага раёна. Дарэчы, сартавальныя заводы (бытавое сартаванне тут не ўлічваецца) ёсць толькі ў абласных цэнтрах. Ёсць задача, згодна з Канцэпцыяй стварэння аб'ектаў па сартаванні і выкарыстанні ЦКА і палігонаў па іх пахаванні, пабудаваць да 2035 года 27 рэгіянальных цэнтраў. Лагістыка пралічана. Напрыклад, будуем завод у Бабруйску, вязём туды рэсурсы з 3–5 раёнаў, якія знаходзяцца побач.

***— Андрэй Валер'евіч, вы сказалі, што трэба пабудаваць 27 рэгіянальных цэнтраў, а колькі з наяўнасцю існуючых смеццесартавальных заводаў наогул плануецца?***

— Плануецца, што іх будзе 32, у тым ліку адзін аб'ект па энергетычным выкарыстанні камунальных адходаў у Мінску. Іх першасная задача — адсартаваць кожны кілаграм смецця. Усё, што можна выкарыстаць, прадаць, перапрацаваць і нават экспартаваць — усё будзе сканцэнтравана там.

Першая частка па сарціроўцы — гэта арганіка (адходы ежы, трава), натуральна яе трэба буртаваць, перамешваць і выкарыстоўваць для розных мэт. Мне бачыцца, напрыклад, для перасыпкі палігонаў. Калі арганіка паляжыць — біягаз сыдзе, і яна становіцца бясшкоднай. Гэтым ці перасыпаем слаі на палігоне, ці выкарыстоўваем для рэкультывацыі кар'ераў. Такая тэхналогія існуе. Атрымліваецца выкарыстанне часткі смецця.

Далей. Усё шархоткае, якое не прадаецца (пакеты з крамаў, упакоўка ад тортаў, маскі і гэтак далей), сёння ідзе на палігоны. Трэба надаць гэтаму энергетычнае выкарыстанне: дзе ёсць заводы па вытворчасці цэменту (пасёлак Краснасельскі, Крычаў) рабіць з такіх адходаў RDF-паліва. То-бок яно перамолваецца ў фракцыю да 10 мм і дасушваецца да вільготнасці 10—15 %, каб потым стаць палівам пры вырабе клінкера. На сённяшні дзень лінія ў Краснасельскім практычна гатова, будзем спрабаваць укараняць гэтую тэхналогію.

Там, дзе эканамічна немэтазгодна па лагістыцы вазіць RDF-паліва, будзем рэканструяваць кацельні, як плануем зрабіць у Віцебскай вобласці. Пакуль рыхтуем тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне на рэканструкцыю кацельні, дзе будзем спальваць гэты від адходаў не для вытворчасці клінкера, а як крыніцу цеплавой энергіі для ацяплення жылых дамоў.

***— Давайце сарыентуем чытача па лічбах: колькі палігонаў зараз выкарыстоўваецца ў Беларусі і да якой колькасці мы імкнёмся?***



фота sb.by

— Сёння выкарыстоўваецца 160 палігонаў і 560 міні-палігонаў (для параўнання, у 2010 годзе іх было 171 і 3200 адпаведна). Задача з разраду першачарговых — закрыць усе міні-палігоны да 2022 года, пакінуць толькі палігоны. А далей і іх закрыць, каб функцыянавалі толькі палігоны пры рэгіянальных цэнтрах, якія адпавядаюць сучасным экалагічным патрабаванням. То-бок прыйсці ў перспектыве да 30 у краіне. Галоўнае — гэта рух наперад і паступовае скарачэнне колькасці палігонаў.

## ЗАВАРЫЎ І ЗАБЫЎ?

***— Хацелася б вярнуцца да тэмы заварвання смеццеправодаў і паасобнага збору смецця: Гомель ужо даўно «заварыўся», Гродна некалькі гадоў таму пазбавіліся ад смеццеправодаў — хто наступны?***

— Шмат гарадоў завараны: напрыклад, у Лідзе, Смаргоні, Ваўкавыску, амаль усе ў Магілёве. У Мінску працэнтаў 20 ужо завяршылі гэты працэс. Але тут павінна быць прынцыповае рашэнне мясцовай улады. Напрыклад, у Гродне зараз кантэйнерныя пляцоўкі чыстыя, людзі карыстаюцца, большасць задаволеная. Калі мы будуем кантэйнерную пляцоўку, робім паасобны збор смецця, а пры гэтым прыязджае смеццявоз і ўсё ссыпае ў адзін кузаў — адназначна, гэта няправільна.

***— А наколькі эфектыўным вы лічыце метад падземнага размяшчэння кантэйнераў, напрыклад, для сталіцы?***

— Такая практыка ёсць у Наваполацку, Пінску, Брэсце. Маё бачанне, калі гэта адзін населены пункт — рашэнне павінна прымацца комплексна. Для падземных кантэйнераў патрэбны ліфт (машына з іншым абсталяваннем), адпаведна, падыходзіць трэба аднолькава.

Што датычыцца сталіцы, тут іншая складанасць — з насычанасцю камунікацыямі кропкава арганізаваць падземныя кантэйнеры ў двух–трох месцах, напэўна, не зусім эканамічна мэтазгодна. Кантэйнеры 3–4-кубовыя і калі іх рабіць у чатыры шэрагі (змешаныя адходы, пластык, папера і шкло) — гэта выглядае эстэтычна, але палігоны застаецца. Акрамя таго, праблематычны пад'езд машын — яны больш габарытныя, чым звычайныя смеццявозы. Як мы казалі напачатку: тут трэба падыходзіць канкрэтна да кожнага рэгіёна і населенага пункта, аналізаваць, зыходзячы з асаблівасцяў, што і дзе зручна. Пры распрацоўцы схемы абыходжання з ЦКА мясцовыя ўлады прадугледжваюць дэталі гэтага працэсу. Немалаважна тут і меркаванне людзей — яго трэба ўлічваць.

## ПРА ЎПЛЫЎ ВІРУСА І ДЭСТРУКТЫЎНЫХ ІДЭЙ

***— Звярнула ўвагу на партале камунальнай адукаванасці, што з'явіўся інфаграфіка для неплацельшчыкаў жыллёва-камунальных паслуг аб наступствах гэтага кроку: усё ж такі рост ёсць?***

— Масава народ на заклікі не аплачваць паслугі ЖКГ не адрэагаваў. За 10 месяцаў 2020 года ўзровень аплаты склаўся каля 99,1 % ад налічаных плацяжоў. Калі ў жніўні, верасні быў невялікі рост даўгоў па паслугах ЖКГ, то за кастрычнік, наадварот, іх зніжэнне. Пазіцыя «не буду аплачваць, бо так заклікаюць тэлеграм-каналы» — дэструктыўная па сваёй прыродзе. Перш за ўсё трэба разумець, куды накіроўваюцца гэтыя грошы. Яны не ідуць у бюджэт: гэта заробкі дворнікаў, якія прыбіраюць нашы двары і пад'езды, сантэхнікаў, якія абслугоўваюць жылы дом, гэта рамонт даху, які цячэ, гэта замена ліфтаў, якія адпрацавалі свой тэрмін, ацяпленне дамоў і гэтак далей. Калі сёння не аплаціць — заўтра ёсць верагоднасць застацца без гэтых выгод. Спачатку арганізацыі будуць недаатрымліваць грошы, потым, натуральна, калі гэты працэс будзе мець масавы характар, людзі могуць аказацца без заробку і на вуліцы. Потым сістэма аказання жыллёва-камунальных паслуг зламаецца рана ці позна. Сапсаваць лёгка, а аднавіць?

***— Паўплываў нейкім чынам каранавірус на дзейнасць галіны ці не?***

— Непасрэдна ўплыву не адчулі: жыллёва-камунальныя паслугі як аказваліся рытмічна, так і аказваюцца. Прыбытак не знізіўся, планы практычна ўсе выконваюцца. Безумоўна, рыхтаваліся і адпрацоўвалі верагоднасць, што ў рамонтна-аварыйных брыгадах людзі могуць хварэць, дакладна вызначалі замену, каб ні ў якім разе не зрываць аварыйныя работы. Уплыву не адчулі і ў планавых работах, калі толькі крыху. Так, людзі выказваюць пазіцыю не дапускаць у кватэры работнікаў, і гэта ўплывае на тэрміны выканання капітальных рамонтаў. Падвышаная ўвага аддаецца зараз і санітарнаму ўтрыманню месцаў агульнага карыстання і правядзенню іх дэзынфекцыі. Ёсць рост зваротаў па гэтай тэматыцы ў рамках службы 115.

Уплыў адчулі камунальныя гасцініцы, якія знаходзяцца ў галіне, яны былі схільныя да гэтага ўплыву як і ўсе. Паслугі лазняў таксама — людзі хадзілі менш. Тут мы недаатрымалі пэўны прыбытак, але сума некрытычная. Гасцініцы, як правіла, не асобныя адзінкі — а ў комплексе аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гэта як адзін з відаў паслуг. Недахоп, каб вы разумелі, быў перакрыты за кошт развіцця іншых паслуг.

## ЯК СІСТЭМА ВЫВЕЛА «НА ЧЫСТУЮ ВАДУ»

***— Калі мы закранулі тэму службы 115, паколькі яна бліжэй за ўсё да звычайных людзей, спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг, ці ўсё ў яе дзейнасці адладжана ці штосьці яшчэ патрабуе ўдасканалення?***

— З пункту гледжання метадалогіі ўсё наладжана: арганізацыйных пытанняў няма. Што датычыцца своечасовай рэалізацыі заявак і выканаўчай дысцыпліны, то яны ёсць. Зварот паступіў, мы яго сёння бачым, як на далоні.

***— А калі параўноўваць з пункту гледжання «было — стала»: рост зваротаў ёсць?***

— Фактычна немагчыма сказаць ёсць ці няма — сістэма пачала працаваць і працуе ўжо год, толькі ў супастаўных умовах бачна дынаміка. Калі мы летась пачыналі пераводзіць дыспетчарскія з раённага на абласны ўзровень, натуральна, колькасць зваротаў вырасла на 30 і нават 40 %, але правільна казаць вырасла не колькасць зваротаў, а колькасць зарэгістраваных зваротаў. Гэта сведчыць аб тым, што мы рухаемся ў правільным кірунку.

Другі факт — у нас адбылося зніжэнне па структуры зваротаў. Калі браць тэматыку, якая ў нас была, ёсць і будзе асноўнай — эксплуатацыя жылфонду (уцяпленне, капітальны, бягучы рамонты, прыборка пад'ездаў і гэтак далей), то ў 2015 годзе гэтыя пытанні ў структуры ўсіх зваротаў, якія траплялі ў міністэрства, займалі каля 50 %. На сённяшні дзень ужо па выніках 9 месяцаў на іх долю прыпадае 38 %. І нават калі браць у параўнанні з мінулым годам — лічба была на 11 % вышэй.

Я лічу, што такі спад адбыўся з-за таго, што пачала дзейнічаць служба 115. Тое, што звароты прымаюцца, рэгіструюцца, усё зразумела і празрыста, і самае галоўнае — ёсць кантроль за іх выкананнем.

## УСЕ СТАРЫЯ ЛІФТЫ ЗАМЕНЯЦЬ НОВЫМІ

***— Якія асноўныя перспектывы развіцця галіны на найбліжэйшы час?***

— Мы мыслім пяцігодкамі: цяпер заканчваецца фарміраванне Дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021—2025 гады, адна з асноўных задач — забеспячэнне якаснай пітной вадой да канца пяцігодкі 100 % спажыўцоў, задача па замене цеплавых і водаправодных сетак па 4 % і 3 % адпаведна штогод, капітальны рамонт не менш за 3 % штогод ад эксплуатуемага жыллёвага фонду, зніжэнне зваротаў грамадзян і зноў жа, павелічэнне выкарыстання ДМР і шэраг іншых.

***— Дастаткова амбіцыйная задача: забеспячэнне якаснай пітной вадой да 100 % спажыўцоў — справіцеся?***

— Для яе выканання трэба да 2025 года каля 800 станцый абезжалезвання. Сёлетняя задача адкрыць да канца года 278 станцый, 235 з іх ужо ўведзены ў эксплуатацыю. Трэба разумець, што гаворка ідзе не аб 100 % насельніцтва, а аб спажыўцах. Калі ў цябе ёсць цэнтралізаванае водазабеспячэнне, то да 2025 года па гэтай цэнтралізаванай сістэме атрымаеш ачышчаную ваду, калі яна патрабуе такой ачысткі.

У перыяд пяцігодкі (2016 — кастрычнік 2020) пабудавана 562 станцыі абезжалезвання вады, ажыццёўлена перападключэнне шасці населеных пунктаў да існуючых цэнтралізаваных сісмтэм водазабеспячэння з вадой нарматыўнай якасці, выканана бурэнне новых свідравін у сямі населеных пунктах.

**«Сёння выкарыстоўваецца 160 палігонаў і 560 міні-палігонаў. Задача з разраду першачарговых — закрыць усе міні-палігоны да 2022 года, пакінуць толькі палігоны».**

Мерапрыемствы, што праводзяцца, дазволілі забяспечыць каля 420 тысяч чалавек, якія пражываюць у гарадскіх пасёлках, сельскіх населеных пунктах, аграгарадках якаснай пітной вадой.

Акрамя таго, адной з галоўных задач з'яўляецца навучанне кадраў. Штогод з пяцітысячнага складу арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі неабходна павысіць узровень ведаў да 20 %, і вельмі сур'ёзна адносімся да прафесійнай атэстацыі пры прызначэнні на пасады: сёння забаронена прызначаць на вызначаны шэраг пасад асоб, якія не прайшлі кваліфікацыйны іспыт.

У шэрагу прыярытэтных задач таксама аднаўленне тэхнікі: цяпер рыхтуецца адпаведны ўказ. Гаворка ідзе аб аднаўленні камунальнай тэхнікі для прыборкі, рухомага саставу, смеццявозаў і гэтак далей.

***— Наколькі мне вядома, у гэтым спісе ёсць і рэканструкцыя і замена ачышчальных збудаванняў...***

— 36 ачышчальных збудаванняў будзе заменена. Сітуацыя змяняецца, у нас больш за сто ачышчальных збудаванняў патрабуюць рэканструкцыі і замены. Ёсць ужо падпісанае крэдытнае пагадненне з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, наколькі яны будуць там адлюстраваныя, паглядзім...

***— Замена ліфтаў — адна з актуальных тэм: ці будзе працягнута рэалізацыя дзяржпраграмы па замене гэтага вертыкальнага транспарту?***

— Працягнецца замена ліфтаў, якія эксплуатуюцца звыш неабходнага тэрміну, за пяцігодку мы павінны закончыць гэтую работу.

***— Такім чынам ліфтаў, якія адслужылі свой тэрмін ужо ў краіне быць не павінна?***

— Так. На два гады запланавана работа па паскоранай праграме, потым па неабходнасці: скончыўся тэрмін — адразу будзем яго мяняць, і эксплуатавацца з перавышаным нарматыўным тэрмінам ліфт не будзе.

**Гутарыла Вольга АНУФРЫЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЕЖА ЯК ЛЯКАРСТВА

**Не сакрэт, што менавіта харчаванне з'яўляецца асновай нашага здароўя і даўгалецця. І калі раней слова «дыета» асацыявалася толькі з пазбаўленнем ад лішніх кілаграмаў, то сёння распрацаваны самыя розныя дыет-планы харчавання, эфектыўнасць якіх пацверджана маштабнымі навуковымі даследаваннямі і якія сапраўды могуць дапамагчы падтрымаць і ўмацаваць здароўе. Але некаторыя з іх могуць быць і небяспечныя. Аб плюсах і мінусах папулярных дыет — для ўмацавання сэрца і сасудаў, супраць раку, для захавання яснасці розуму, а таксама аб сыраядзенні — мы вырашылі распытаць спецыяліста.**

## ЧЫМ «ПАЧАСТАВАЦЬ» МОЗГ І СЭРЦА?

### Нізкавугляводная дыета супраць раку

— Сёння гэтая дыета (яе таксама называюць кетагеннай) шырока абмяркоўваецца ў медыцынскіх колах, — распавядае **намеснік генеральнага дырэктара па стандартызацыі і якасці прадуктаў харчавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні» Алена МАРГУНОВА.** — Яна заснавана на абмежаваным спажыванні вугляводаў.

***Як гэта працуе?***

— Паколькі вугляводаў з ежай пастурае мала, арганізм пачынае актыўна здабываць энергію з тлушчу: гэты працэс называецца кетоз. Мэта такой дыеты — пазбавіць ракавыя клеткі крыніцы глюкозы, якую яны актыўна спажываюць для росту і размнажэння, і ў той жа час павысіць узровень кетонавых цел для вытворчасці энергіі ў здаровых клетках.



***Што трэба есці?***

— Асноўны рацыён тут складаюць мясныя і малочныя прадукты сярэдняй тлустасці (2,5—3,5 %) як крыніца бялкоў. Нізкавугляводная дыета супраць раку ўключае таксама раслінныя алеі, арэхі, авакада, аліўкі як крыніцы тлушчаў. Абмяжоўваецца ўжыванне хлеба і макаронных вырабаў, а ад салодкіх прысмакаў рэкамендуецца адмовіцца наогул.

***На што звярнуць увагу?***

— На маю думку, цалкам адмаўляцца ад вугляводаў не варта, іх трэба менавіта абмяжоўваць. Абавязкова ў рацыёне павінны прысутнічаць гародніна і садавіна з нізкім утрыманнем крухмалу. Прысмакі варта замяніць садавінай і ягадамі (клубніцы, парэчкі, апельсіны, грэйпфруты).

### Дыета для захавання яснасці розуму

— Гэтая дыета распрацавана амерыканскімі дыетолагамі і ўрачамі. Цяпер яна на піку папулярнасці ў многіх краінах і паступова набірае папулярнасць у нас.

***Як гэта працуе?***

— Дыет-план харчавання для яснасці розуму ўяўляе сабой гібрыд міжземнаморскай дыеты і DASH (дыеталагічны падыход да лячэння гіпертаніі). Даказана, што яна зніжае рызыку развіцця хваробы Альцгеймера на 35—50 % і запавольвае іншыя кагнітыўныя парушэнні ў людзей сталага ўзросту, абараняе ад дэменцыі і захоўвае працаздольнасць мозга.

***Што трэба есці?***

— Асноўны рацыён складаюць нятлустае белае мяса, рыба на пары, арэхі і ягады, раслінныя алеі, садавіна і гародніна без абмежаванняў. Таксама рэкамендавана чырвонае сухое віно (адзін келіх у дзень пры адсутнасці супрацьпаказанняў). Захаваць вастрыню розуму ў сталым узросце дапамагае зялёная ліставая гародніна, якая ўтрымлівае лютэін, і ў цэлым любая гародніна. У лік абмежаванняў уваходзяць чырвонае мяса і насычаныя тлушчы, крыніцы якіх — тлустае мяса, малочныя прадукты высокай тлустасці, а таксама транстлушчы (маргарын, кандытарскія вырабы, фастфуд).

***На што звярнуць увагу?***

— Мінімум раз на тыдзень рэкамендуецца есці рыбу, двойчы ў тыдзень — мяса птушкі. Запраўляйце салаты раслінным алеем, а ў якасці перакусу выкарыстоўвайце арэхі і ягады.

### Дыета для абароны сэрца і сасудаў DASH

— Гаворка ідзе аб тым самым дыеталагічным падыходзе да лячэння гіпертаніі, які мы згадалі крыху раней.

***Як гэта працуе?***

— Такі план харчавання дапамагае знізіць рызыку развіцця інсультаў, інфарктаў, палепшыць самаадчуванне людзей, што маюць высокі артэрыяльны ціск. Дапамагае кантраляваць вагу, спрыяе паніжэнню ціску, памяншае рызыку развіцця захворванняў сэрца і нырак.

***Што трэба есці?***

— У асноўны рацыён тут уваходзяць прадукты з цэльнага зерня, з неачышчаных і неабсмажаных круп або мукі грубага памолу, нятлустае белае мяса, рыба і морапрадукты, нятлустыя малочныя прадукты — але не абястлушчаныя (да 2,5 % тлустасці). Рэкамендуецца таксама ўжываць аліўкавы, рапсавы і льняны алей, гародніну і садавіну, арэхі. Абмежаваць варта ў першую чаргу соль: не больш за 5 г у суткі, уключаючы соль ва ўсіх прадуктах, а пры павышаным ціску — не больш за 3 г у суткі. Таксама варта абмяжоўваць спажыванне масла, тлустых малочных і мясных прадуктаў. Пры дыягназе «гіпертанія» тлушч неабходна скараціць максімальна.

***На што звярнуць увагу?***

— Раслінныя алеі лепш выбіраць нерафініраваныя. У нерафініраваных алеях утрымліваюцца фітастэрыны і фітастэролы, якія спрыяюць паляпшэнню ліпіднага балансу арганізма і перашкаджаюць развіццю атэрасклерозу.

### Міжземнаморская дыета

— Гэтая дыета была на піку папулярнасці некалькі гадоў таму. Яна заснавана на ўжыванні прадуктаў харчавання, тыповых для Італіі.

***Як гэта працуе?***

— Дадзены тып харчавання на самай справе просты і не залежыць ад кліматычных умоў. Перавага дыеты ў тым, што яна прадугледжвае вялікую колькасць поліненасычаных тлушчаў (іх крыніцамі з'яўляюцца раслінныя алеі: ільняны, рапсавы, кукурузны, сланечнікавы, рыба, арэхі), мала жывёльных насычаных тлушчаў і цукру.

***Што трэба есці?***

— Асноўны рацыён складаюць прадукты з цэльнага зерня (неачышчаныя і неабсмажаныя крупы, хлеб і спагеці з мукі грубага памолу), рыба і морапрадукты, аліўкавы і іншыя алеі, гародніна і садавіна, арэхі. Прыемны бонус — чырвонае сухое віно (адзін келіх у дзень пры адсутнасці супрацьпаказанняў). Дыета абмяжоўвае ўжыванне чырвонага мяса, масла, яек, салодкіх прысмакаў.

***На што звярнуць увагу?***

— У Беларусі да міжземнаморскай дыеты ставяцца скептычна, спасылаючыся на тое, што ў нас зусім іншы клімат і генатып людзей. Але гэта не зусім так. Напрыклад, паўночнаеўрапейскія краіны адаптавалі гэтую дыету пад свае ўмовы і назвалі яе скандынаўскай. Атрымалі выдатныя вынікі па зніжэнні ўзроўню сардэчна-сасудзістых захворванняў і росту працягласці жыцця.

## 3 ПАЗІЦЫІ ЗДАРОВАГА СЭНСУ

Ёсць дыеты, якія лічацца аздараўленчымі, але ставіцца да іх трэба з вялікай асцярогай: далёка не заўсёды іх плюсы пераважваюць мінусы. Яскравы прыклад — **сыраядзенне**, аб якім размаўляем больш падрабязна.

***— Алена Міхайлаўна, сыраядзенне мае шмат прыхільнікаў сярод людзей рознага ўзросту. Чаму?***

— Рост колькасці хвароб, выкліканых няправільным харчаваннем, прымушае шукаць спосабы захаваць здароўе з дапамогай кардынальнай змены рацыёну. Сыраядзенне — гэта вяртанне да вопыту вельмі далёкіх продкаў. Але цудадзейныя ўласцівасці сырых пладоў так і не пацверджаны навукай аб харчаванні.

***— У чым прынцыпы сыраядзення?***

— Калі не закранаць ідэалагічных асноў розных відаў сыраядзення, то сістэма харчавання выглядае як ужыванне прадуктаў, якія не прайшлі ніякай тэрмічнай апрацоўкі. Асноўны пасыл: высокая тэмпература разбурае вітаміны і іншыя карысныя рэчывы і істотна пагаршае іх засваяльнасць. У гэтага кірунку ёсць разнавіднасці.

Вегетарыянскае сыраядзенне — яго прыхільнікі ядуць толькі сырую раслінную ежу, выключаюць з рацыёну мяса і рыбу, але ўжываюць яйкі і малочныя прадукты. Зразумела, не апрацаваныя тэрмічна.



Усёеднае сыраядзенне дапускае ўжыванне любых сырых прадуктаў. У тым ліку малака, яек, сырых або вяленых на сонцы мяса і рыбы, сухафруктаў.

«Дыета эпохі палеаліту» мае на ўвазе ўжыванне сырога мяса, рыбы і морапрадуктаў і практычна выключае раслінную ежу.

Фруктарыянства — гэта ўжыванне толькі садавіны і ягад. Уся астатняя раслінная ежа — гародніна, караняплоды і збожжавыя — выключаецца з рацыёну.

***— Даводзілася чуць, што пры пераходзе на сыраядзенне чалавек адчувае прыліў жыццёвых сіл і вылечваецца ад хранічных хвароб...***

— Аналагічныя адчуванні ўзнікаюць у людзей, якія практыкуюць галаданне. У выніку рэзкага абмежавання каларыйнасці рацыёну ў працэсе расшчаплення тлушчавых адкладаў утвараюцца кетонавыя целы, якія ўздзейнічаюць на галаўны мозг, выклікаючы суб'ектыўнае адчуванне эйфарыі, лёгкасці і добрага настрою. Так узнікае памылковае перакананне, што прыўзняты настрой — вынік аздараўлення. На жаль, гэта не так.

***— Значыць, сыраядзенне не дае ніякіх плюсаў?***

— Плюсаў дастаткова. Прывяду аргументы «за». Пры працяглай тэрмічнай апрацоўцы гародніны і садавіны разбураецца большасць карысных рэчываў, напрыклад, антыаксідантаў. У прыватнасці, гэта караціноіды, здольныя абараняць арганізм ад ракавых захворванняў. Сыраядзенне дазваляе выключыць з рацыёну лішак солі, насычаныя тлушчы, транстлушчы і канцэрагены, якія ўтвараюцца пры тэрмічнай апрацоўцы прадуктаў. Такая дыета можа апынуцца карыснай пры гіпертаніі або захворваннях нырак. З сырых прадуктаў лепш засвойваюцца вітаміны і мінеральныя рэчывы. Сыраядзенне спрыяе хуткаму насычэнню за кошт багатых на клятчатку нізкакаларыйных раслінных прадуктаў. Гародніна і садавіна стымулююць жаванне і ўмацоўваюць дзясны. У гэтых прадуктах мала цукру, які спрыяе разбурэнню зубной эмалі. Тэрмічна неапрацаваная гародніна і садавіна стымулююць працу кішэчніка, дапамагаюць размнажэнню карысных бактэрый у страўнікава-кішачным тракце.

***— Але ёсць і аргументы «супраць»?***

— Так, і іх таксама нямала. Сырая гародніна і садавіна супрацьпаказаныя пры некаторых хранічных захворваннях страўнікава-кішачнага тракта (гастрытах, язве, калітах). У рацыёне сыраеда-вегетарыянца недастаткова бялку, паколькі асноўныя яго крыніцы — бабовыя і крупы, а ў тэрмічна неапрацаваным выглядзе яны практычна неядомыя. Сыраеды-вегетарыянцы не атрымліваюць увесь набор незаменных амінакіслот і некаторых вітамінаў, не забяспечваюць арганізм неабходнай колькасцю бялку, бо раслінны бялок саступае жывёльнаму па колькасці і змесце некаторых амінакіслот (трыптафану, метыяніну, лізіну). Ежа сыраедаў змяшчае недастаткова вітамінаў D, B2, B12, кальцыю, цынку, селену. У прыхільнікаў веганскага сыраядзення нярэдка развіваецца недахоп кальцыю і, у выніку, астэапароз. У сырых злакавых і бабовых утрымліваюцца рэчывы, што блакуюць дзеянне стрававальных ферментаў, неабходных для пераварвання бялку. Гэта абцяжарвае засваенне некаторых вітамінаў і мінеральных рэчываў, асабліва жалеза. Таму сыраеды — у групе рызыкі развіцця жалезадэфіцытнай анеміі. Людзі, якія ўжываюць у ежу сырую рыбу і мяса, могуць атрымаць харчовае атручэнне або кішачных паразітаў. Лішак сырой садавіны ў рацыёне можа справакаваць развіццё алергічных рэакцый.

***— Дык ці варта лічыць сыраядзенне аздараўленчай дыетай?***

— Дыеты з сырой гародніны і садавіны прымяняюцца ў практыцы лячэбнага харчавання пры атлусценні, сардэчна-сасудзістых захворваннях, хваробах нырак, паталогіях, якія суправаджаюцца слабай работай кішэчніка. Праўда, харчаванне сырымі гароднінай і садавінай не павінна доўжыцца не больш за два-тры дні. Сыраядзенне ў класічным варыянце супрацьпаказана дзецям і падлеткам, пажылым людзям (якія часам спрабуюць «аздаравіцца» такім чынам), цяжарным жанчынам і маці, што кормяць грудзьмі, спартсменам, а таксама пры запаленчых захворваннях органаў стрававання, нырачна-каменнай хваробе і алергіі. Нельга лічыць сыраядзенне бяспечнай сістэмай харчавання. Падобныя эксперыменты здольныя сур'ёзна парушыць абмен рэчываў. Самае важнае ў правільным харчаванні — навучыцца слухаць свой арганізм, забяспечваць індывідуальныя біялагічныя патрэбы і сачыць за ўласнымі адчуваннямі пры тых ці іншых пераменах у харчаванні.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 16 декабря 2020 года в 11.00 проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| №п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 40 %, бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Бульдозер «ДЗ-110», тип ТС – бульдозер гусеничный, 1988 г. в. | 3780,00 | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156 | 378,00 |
| Лот № 4 | Прицеп «2 ПТС-4.5», тип ТС – прицеп тракторный, 1998 г. в. | 900,00 | | 90,00 |
| Лот № 5 | Здание мобильное «М-К1-3», тип ТС – прицеп, 2000 г. в. | 1020,00 | | 102,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **16 декабря 2020 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121194101193300000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **14.12.2020 г.;** время: **17.00.**

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размешены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 16 декабря 2020 года в 12.00 проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 40 % бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Асфальтоукладчик S-750, 2003 г. в. | 24600,00 | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156 | 2460,00 |
| Лот № 2 | Каток дорожный ДУ 47Б, 1998 г. в. | 1980,00 | | 198,00 |
| Лот № 7 | Автомобиль WOLKSWAGEN JETTA, 2006 г. в. | 3300,00 | Могилевская область, г. Могилев, Славгородский проезд, 17 | 330,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **16 декабря 2020 в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121194101193300000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **14.12.2020 г.;** время: **17.00.**

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размешены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Брагинский КБО»** (УНН 400032430) 247632, Гомельская область, г. п. Брагин, ул. Советская, 31, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **15 декабря 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Промышленная гладильная машина PRIMUS Модель 150-200, инв. № 136 | 1300,00 |
| 2 | Нож раскройный Great ocean CZD-3, 2013 г. в., инв. № н/д | 300,00 |
| 3 | Оверлок Gemsy Gem 737F, 2006 г. в., инв. № н/д | 225,00 |
| 4 | Оверлок Typical GN 793, 2007 г. в., инв. № 486 | 225,00 |
| 5 | Швейная машина Minerva 335-221, 2004 г. в., инв. № 280 | 225,00 |
| 6 | Кассовый аппарат Орион-100Ф, 2010 г. в., инв. № н/д | 67,50 |
| 7 | Бойлер Ariston SG30OR, 2008 г. в., инв. № 178 | 45,00 |
| 8 | Установка для ремонта обуви РО-1, 2004 г. в., инв. № 152 | 600,00 |
| 9 | Пресс для приклеивания подошв и подметок РО-2, 2004 г. в., инв. № 150 | 127,50 |
| 10 | Лапа сапожная MX90 CK-05, 2005 г. в., инв. № 185 | 15,00 |
| 11 | Стол обувщика, 2005 г. в., инв. № 183 | 30,00 |
| 12 | Вытяжка обувная УВП-1200С, 2007 г. в., инв. № 187 | 195,00 |
| 13 | Оверлок Global OV816550, 2006 г. в., инв. № 161 | 1200,00 |
| 14 | Швейная машина CHNKI CBH-781N, 2008 г. в., инв. № 180 | 1200,00 |
| 15 | Швейная машина Orsha 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 144 | 60,00 |
| 16 | Швейная машина Orsha 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 365 | 60,00 |
| 17 | Швейная машина Orsha 1022 кл, 2007 г. в., инв. № 151 | 60,00 |
| 18 | Швейная машина Orsha 1022 кл, 2004 г. в., инв. № 180 | 60,00 |
| 19 | Швейная машина Orsha 1022 кл, 2007 г. в., инв. № н/д | 60,00 |
| 20 | Швейная машина Orsha 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 180 | 75,00 |

**Местонахождение – Гомельская обл., г. п. Брагин, ул. Советская, 31. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 9.00 05.12.2020 г. по 17.00 14.12.2020 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 27.10.2020 г.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Добрушский КБО»** (УНН 400003508) 247050, Гомельская обл., г. Добруш, ул. кн. Паскевича, 12, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **15 декабря 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 311/С-38771 площадью 156,0 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – комплексный приемный пункт, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 5. Кадастровый номер земельного участка, на котором расположено капитальное строение: 321250100003001863 | 19 650,00 |
| 2 | Изолированное помещение с инв. № 311/D-12009 площадью 53,5 кв. м, назначение – помещение бытового обслуживания населения, наименование – изолированное помещение № 6, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. кн. Паскевича, 6-6 | 4 583,34 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 311/С-6661 общей площадью 75,1 кв. м, назначение – здание комплексного приемного пункта, наименование – комплексный приемный пункт, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Ленинский с/с, аг. Красный партизан, ул. 70 лет Октября, 15. Информация о земельном участке: кадастровый номер 321284402601000003 общей площадью 0,1345 га – для постоянного пользования (доля в праве 1/1) | 800,00 |

**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 05.12.2020 г. 09.00 по 14.12.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 19.11.2020 г.

УНН 190431606

## УП «Белконфискат»

**объявляет о проведении электронных торгов 05.01.2021 г. по продаже имущества Бабенко И.Л.**

**легковой универсал «Фольксваген Пассат», 1992 г. в., начальной стоимостью 1 128 рублей.**

На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о торгах. Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606

## УП «Белконфискат»

**объявляет о проведении электронных торгов 06.01.2021 г. по продаже имущества Селянта О.Е.**

**грузовой автомобиль «Вольво FL7», 1995 г. в., начальной стоимостью 8 600 рублей.**

На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о торгах. Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ООО «БелВЭБ Капитал», г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 66, пом. 21а, ком. 1** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1: капитальные строения, реализуемые одним лотом, по адресу:** Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, 10, 10Б **(здание банка** общ. пл. 581,7 кв. м, инв. номер 630/С-18374, **здание гаража на 3 автомобиля** общ. пл. 58,1 кв. м, инв. номер 630/С-47339, **здание архива, склада, служебного кабинета и комнаты отдыха** общ. пл. 107,4 кв. м, инв. номер 630/С-39886)

**Сведения о земельном участке**: 1. Предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,3542 га для содержания и обслуживания зданий и сооружений по ул. Виленская, 10 в г. Молодечно.
2. Предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0225 га для содержания и обслуживания административно-хозяйственного здания

**Начальная цена с НДС 20 % – 1 226 670,17 бел. руб.**

**Лот № 2: 1/10 доли в праве собственности на капитальное строение** с общ. пл. капитального строения 2486,7 кв. м, инв. номер 422/С-3271 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26. **Сведения о земельном участке:** пл. 0,5681 га предоставлен продавцу для содержания и обслуживания административного здания на праве постоянного пользования (доля 1/10)

**Начальная цена с НДС 20 % – 41 344,03 бел. руб.**

**Лот № 3: отделение лифтового узла с боксом разгрузки ценностей** общ. пл. 135,9 кв. м, инв. номер 200/D-121766 по адресу: г. Витебск, ул. Замковая, 4-1

**Начальная цена с НДС 20 % – 48 841,44 бел. руб.**

**Лот № 4: здание банка** общ. пл. 784 кв. м, инв. номер 240/С-34300 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Мира, д. 30. **Сведения о земельном участке:** пл. 0,2784 га предоставлен продавцу для использования под здание офиса на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 1 057 242,16 бел. руб.**

**Лот № 5: гараж № 10** общ. пл. 49,3 кв. м, инв. номер 342/С-32185 по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Привокзальная, в районе базы УКСа, гараж № 10. **Сведения о земельном участке:** пл. 0,0070 га предоставлен продавцу для размещения автостоянок и гаражей на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 26 971,10бел. руб.**

**Лот № 6: административное помещение № 3** общ. пл. 1 112 кв. м, инв. номер 500/D-687333 по адресу: г. Минск, ул. Гуляма Якубова, д. 10, пом. 3

**Начальная цена с НДС 20 % – 2 490 437,88 бел. руб.**

**Лот № 7: здание банка** общ. пл. 721 кв. м, инв. номер 130/С-26337, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 9. **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0422 га для обслуживания административного здания

**Ограничения (обременения)** прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Начальная цена с НДС 20 % – 930 090,00 бел. руб.**

**Лот № 8: изолированные помещения, реализуемые одним лотом, по адресу:** г. Минск, ул. Скрыганова, 6 (пом. 3, 5,16, 7, 14, 12, 2, 13, 9, 11, 10, 6/3-17, 6/3-18, 6/3-19, 6):
**1. Изолированное помещение технического этажа** общ. пл. 628,9 кв. м, инв. номер 500/D-7115208. **2**. **Изолированное помещение машинного отделения в административном здании** общ. пл. 78 кв. м, инв. номер 500/D-7115210. **3. Изолированное помещение в подвале административного здания** общ. пл. 20,1 кв. м, инв. номер 500/D-7115345. **4**. **Изолированное помещение в подвале административного здания** общ. пл. 96,8 кв. м, инв. номер 500/D-7115212. **5**. **Изолированное помещение на 1-м этаже административного здания** общ. пл. 6,3 кв. м, инв. номер 500/D-7115219. **6. Изолированное помещение на 1-м этаже в административном здании** общ. пл. 5,2 кв. м, инв. номер 500/D-7115217. **7. Изолированное помещение на 1-м этаже в административном здании** общ. пл. 134,2 кв. м, инв. номер 500/D-7115207. **8. Изолированное помещение на пятом этаже административного здания** общ. пл. 14,3 кв. м, инв. номер 500/D-7115218. **9. Изолированное помещение 6-го этажа в административном здании** общ. пл. 568,9 кв. м, инв. номер 500/D-7115214. **10. Изолированное помещение 7-го этажа в административном здании** общ. пл. 567,6 кв. м, инв. номер 500/D-7115216. **11. Изолированное помещение 9-го этажа в административном здании** общ. пл. 568,5, инв. номер 500/D-7115215. **12**. **Нежилое помещение в подвале в административном здании** общ. пл. 331 кв. м, инв. номер 500/D-798802009. **13. Нежилое помещение на 1-м этаже в административном здании** общ. пл. 406,5 кв. м, инв. номер 500/D-798802010. **14. Нежилое помещение на 2-м этаже в административном здании** общ. пл. 570,3 кв. м, инв. номер 500/D-798802011. **15. Изолированное помещение на 5-м этаже в административном здании** общ. пл. 453,6 кв. м, инв. номер 500/D-7115211

**Начальная цена с НДС 20 % – 10 877 126,88 бел. руб.**

**Дополнительная информация:**
**1. Обременения по лотам №№ 1–8: объекты находятся в залоге у ОАО «Банк БелВЭБ».**
**2. В состав лотов №№ 1, 4, 6, 7, 8 входит иное имущество. Перечень имущества размещен на сайте www.ipmtorgi.by.**
**3. Обременения: аренда по лотам 1, 6, 7, 8. Подробная информация у Продавца**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 1 до 5 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.11.2020 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов – **10.00 18.12.2020 г.**
Окончание торгов – **12.00 18.12.2020 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.12.2020 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

4 снежня 2020 г. № 46 (582)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# У ЭКАНОМІЦЫ, ПРАВЕ, НАВУЦЫ І БЯСПЕЦЫ

## Акцэнт на гарманізацыю і ўдасканаленне нацыянальнага заканадаўства

**На мінулым тыдні парламенцкая дэлегацыя на чале са спікерам Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ прымала ўдзел у 51-м пленарным пасяджэнні Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, якое адбылося ў рэжыме відэаканферэнцыі.**



Фота БелТА.

У складзе нацыянальнай дэлегацыі — члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Таццяна Рунец і Сяргей Рачкоў, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Ігар Марзалюк і Валянцін Семяняка, намеснік генеральнага сакратара Савета МПА СНД — паўнамоцны прадстаўнік Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Когут.

### Народнае апытанне і электроннае галасаванне

Падчас пленарнага пасяджэння парламентарыі прынялі 27 тэматычных мадэльных прававых актаў, па якіх беларускім бокам унесена больш за 80 заўваг і прапаноў.

Так, асамблеяй зацверджаны праект міжнароднай дамовы — Канвенцыі аб захаванні аб'ектаў культурнай спадчыны дзяржаў — удзельніц СНД, якая замацоўвае асноўныя механізмы ўзаемадзеяння краін Садружнасці па захаванні і выкарыстанні аб'ектаў культурнай спадчыны, асабліва ў перыяд сацыяльных і прыродных катаклізмаў. Дакумент накіраваны ў Выканаўчы камітэт СНД для разгляду ў адпаведным парадку.

Мадэльны Выбарчы кодэкс для дзяржаў — удзельніц СНД будзе садзейнічаць далейшаму развіццю прававой базы і датычыцца правядзення выбараў у адпаведнасці з міжнароднымі выбарчымі стандартамі. У прыватнасці, як растлумачыў **старшыня Пастаяннай камісіі МПА СНД па вывучэнні вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянцін СЕМЯНЯКА,** дакумент заснаваны на міжнародных абавязацельствах дзяржаў — удзельніц СНД у сферы дэмакратычных выбараў, у першую чаргу, на Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў, выбарчых правоў і свабод у дзяржавах — удзельніцах СНД, абавязацельствах у рамках АБСЕ, Савета Еўропы, рэкамендацыях МПА СНД і Венецыянскай камісіі Савета Еўропы.

Ён устанаўлівае прынцыпы прававога рэгулявання арганізацыі і правядзення выбараў і рэферэндумаў, мэты і задачы такога рэгулявання, прынцыпы іх арганізацыі і правядзення, фарміравання і дзейнасці выбарчых камісій, камісій рэферэндуму, замацоўвае асноўныя правы і абавязкі ўдзельнікаў выбарчага працэсу і гэтак далей.

Каб адлюстраваць усе аспекты развіцця нацыянальнага заканадаўства, з'явілася навела аб правядзенні кансультацыйнага народнага апытання. Дакумент таксама дапоўнены главой «Ўскосныя выбары», дзе знайшлі адлюстраванне апошнія тэндэнцыі магчымага развіцця дэмакратычных інстытутаў, у тым ліку электроннае галасаванне і дыстанцыйнае электроннае галасаванне.

Як адзначыў выступоўца, мадэльны Выбарчы кодэкс узгоднены з нацыянальным заканадаўствам краін Садружнасці, а таксама ўлічвае сучасныя тэндэнцыі яго развіцця.

### Найлепшыя практыкі антыкрызіснага рэгулявання — у Белай кнізе

У эканамічным блоку пытанняў прыняты мадэльныя законы аб інжынірынгу, інжынернай справе, будаўніцтве нерухомых аб'ектаў на долевай аснове.

Валянцін Семяняка прадставіў калегам праект Параўнальна-прававога аналізу інструментарыю антыкрызіснага рэгулявання. Ён адзначыў, што роля дзяржаўнага антыкрызіснага рэгулявання, выпрацоўкі і рэалізацыі стратэгіі развіцця дзяржавы і грамадства, накіраванай на пераадоленне крызісных з'яў і забеспячэнне раўнаважнага стану эканамічных інстытутаў і дзяржаўнай улады, узрастае. Пры гэтым дзяржава выкарыстоўвае метады як прамога ўмяшальніцтва, так і ўскоснага.

— Эфектыўны комплекс інструментаў антыкрызіснага кіравання дае імпульс для эканамічнага росту і ставрае перадумовы для змен гаспадарчых працэсаў на ўсіх узроўнях эканомікі, — падкрэсліў парламентарый. — Выкарыстоўваюцца інструменты аператыўнага рэагавання, накіраваныя на стабілізацыю эканамічнай сітуацыі ў кароткатэрміновы перыяд, і інструменты стратэгічнага рэагавання макраэканамічных працэсаў, якія забяспечваюць сацыяльна-эканамічны працэс у доўгатэрміновай перспектыве.

Параўнальны метад даследавання ўяўляе сабой супастаўленне існуючых характарыстык параўнальных аб'ектаў, якое дазваляе вылучыць агульныя рысы і адрозненні. Аб'ект даследавання — заканадаўчая практыка антыкрызіснага рэгулявання.

Валянцін Семяняка адзначыў, што профільная камісія мае намер працягнуць работу ў гэтым кірунку і падрыхтаваць Белую кнігу найлепшай практыкі антыкрызіснага рэгулявання, заснаваную на вопыце дзяржаў — удзельніц СНД і краін далёкага замежжа.

У сферы абароны і бяспекі профільнай Пастаяннай камісіяй МПА СНД былі прадстаўлены мадэльныя законы аб бежанцах, пакрыцці нанесеных шкоды грамадзянам, якія пацярпелі ад злачынстваў, новыя рэкамендацыі па тыпалогіі злачынстваў, якія здзяйсняюцца з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій.

### Для мінімізацыі рызык, у тым ліку карупцыйных

У гуманітарным раздзеле асамблеяй прыняты мадэльны Працоўны кодэкс, законы аб школьным спорце і допінгу ў спорце, узгоднены слоўнік тэрмінаў у галіне адукацыі.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі МПА СНД па навуцы і адукацыі, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК** прэзентуючы калегам мадэльны закон «Аб кантрактнай сістэме ў сферы даследаванняў і распрацовак» растлумачыў, што адной з задач, якая забяспечвае супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД у навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай сферах, з'яўляецца стварэнне міждзяржаўнай прасторы, якая надае сістэмны характар устойліваму развіццю і спрыяе эфектыўнаму выкарыстанню вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак. «Паспяховаму рашэнню гэтай задачы будзе садзейнічаць аптымальнае і гарманізаванае рэгуляванне механізмаў выкарыстання дзяржаўных фінансавых рэсурсаў», — перакананы парламентарый.

Па яго словах, мадэльны закон вызначае арганізацыйна-прававыя і эканамічныя асновы кантрактнай сістэмы, паўнамоцтвы і адказнасць яе ўдзельнікаў, асаблівасці ажыццяўлення закупак вынікаў даследаванняў і распрацовак. «Дакумент накіраваны на забеспячэнне метадалагічнага адзінства і гарманізацыі прававых патрабаванняў да арганізацыі кантрактнай сістэмы ў сферы даследаванняў і распрацовак, стымулявання заключэння кантрактаў і іх рэалізацыю на выгадных для заказчыка і выканаўцы ўмовах, мінімізацыі рызык, у тым ліку і карупцыйных», — падкрэсліў Ігар Марзалюк.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.**

АКЦЭНТЫ

## 3 мэтай устойлівага развіцця

### ААН чакае паглыблення ўзаемадзеяння з Рэспублікай Беларусь

**На імя старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ прыйшоў падзячны ліст ад генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Антоніу ГУТЭРЫША ў адказ на віншаванні з нагоды 75-годдзя стварэння ААН, паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента.**

Генсек ААН адзначае, што гэтая дата прыпадае на перыяд беспрэцэдэнтных выклікаў — пачынаючы з уздзеяння пандэміі COVID-19 на эканоміку і ахову здароўя да кліматычнага крызісу, узрастаючых геапалітычных напружанасцяў і канфліктаў. Міжнароднае супрацоўніцтва і дух адзінства маюць рашаючае значэнне для пераадолення гэтых і іншых глабальных выклікаў.

«Арганізацыя Аб'яднаных Нацый з нецярпеннем чакае паглыблення ўзаемадзеяння з Рэспублікай Беларусь, што мае першаступеннае значэнне для прасоўвання ўстойлівага развіцця, міру, бяспекі і правоў чалавека для ўсіх», — адзначаецца ў дакуменце.

Антоніу Гутэрыш таксама падкрэсліў, што спадзяецца на падтрымку старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай у сумесным імкненні зрабіць свет лепшым для ўсіх.

## Трэба зрабіць больш

### У сферы ўстойлівага развіцця ў Беларусі зроблена шмат, наперадзе — больш актыўная работа

**Аб гэтым заявіў журналістам віцэ-спікер верхняй палаты парламента, нацыянальны каардынатар на Мэтах устойлівага развіцця Анатоль ІСАЧАНКА. Днямі ён правёў сустрэчу ў фармаце відэаканферэнцыі з пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі Іаанай Казана-Вішнявецкі.**

— Сёння ў сферы дасягнення Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года ў Беларусі зроблена шмат, але нас чакае яшчэ больш актыўная работа, — адзначыў нацыянальны каардынатар.

Па яго словах, у аснове МУР заўсёды знаходзіўся чалавек:

— Ніхто не павінен быць убаку, і на гэта накіраваны ўсе 17 Мэт устойлівага развіцця. Гэта безбар'ернае асяроддзе, ліквідацыя галечы, непісьменнасці, уцягненне кожнага чалавека ў грамадскую дзейнасць. То-бок кожная мэта мае адпаведны кірунак. Хочацца адзначыць, што Беларусь за 2020 год па дасягненні МУР заняла 18-е месца са 166 краін, — падкрэсліў Анатоль Ісачанка.

На парадку дня бакоў знаходзіліся рабочыя пытанні. У прыватнасці, падвядзенне вынікаў сумеснай работы, а таксама разгляд перспектыў далейшага супрацоўніцтва ў сферы падтрымкі нацыянальнай архітэктуры кіравання працэсам дасягнення МУР, імплементацыя Мэт на рэгіянальны ўзровень, абмеркаванне планаў работы на наступны год.

## Будучыня толькі ў кансалідацыі

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ:**

— Ва ўмовах пандэміі, калі ў эканоміках многіх краін адбываецца зніжэнне дзелавой актыўнасці, а значыць, і даходаў насельніцтва, расце беспрацоўе, ад усяго грамадства, як ніколі, патрэбна кансалідацыя намаганняў. Аднак асобныя «дзеячы» з-за мяжы заклікаюць «падліць масла ў агонь», адключыць Рэспубліку Беларусь ад сістэмы SWIFT, спыніць супрацоўніцтва ў банкаўскай сферы і рэалізаваць іншыя крайнія меры, накіраваныя на дэстабілізацыю эканомікі нашай краіны.

Абурае тое, што гэтыя людзі называюць сябе «патрыётамі» Беларусі і пры гэтым, «са скуры вон лезуць», каб «разбурыць» нацыянальную эканоміку, зрабіць жыццё беларусаў яшчэ горшым. Дзе тут патрыятызм, ды і наогул, здаровы сэнс? Яго папросту няма. Каму гэта выгадна?

Любыя цяжкасці паспяхова пераадольваюцца, калі грамадства кансалідаванае дзеля дасягнення сваіх нацыянальных мэт і задач. Толькі ў такога грамадства ёсць будучыня!

РАБОТА Ў РЭГІЁНАХ

# Задача — знайсці грамадскую парадыгму перамен

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Сяргей СІВЕЦ наведаў Рагачоўскі раён. Сенатар правёў у райцэнтры прыём грамадзян і сустрэўся з калектывам Рагачоўскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа будаўнікоў.**



Звяртаючы ўвагу на неабходнасць і важнасць падобнай работы ў рэгіёнах, сенатар адзначыў, — прыёмы грамадзян дапамагаюць выявіць магчымыя прабелы ў выкананні нарматыўна-прававога заканадаўства.

— Магчымы сітуацыі прававой недакладнасці, якія перашкаджаюць рэалізацыі законных правоў грамадзян або ствараюць некаторыя перашкоды ў аказанні ім дапамогі. Савет Рэспублікі з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, таму выязныя прыёмы грамадзян — адзін з важных элементаў нашай паўсядзённай работы, — упэўнены член Савета Рэспублікі.

Між тым падчас прыёму да сенатара звярнулася жыхарка Рагачова Святлана Казакевіч. Жанчына закранула адрасу некалькі пытанняў актуальных як для Гомельшчыны, так і для краіны ў цэлым. Адно з іх — выкананне Указа Прэзідэнта № 127 «Аб кампенсацыі расходаў на электразабеспячэнне эксплуатуемага жыллёвага фонду». Закон рэгламентуе парадак кампенсацыі насельніцтву расходаў пры ўстаноўцы ў дамах электраабсталявання.

— Дакумент атрымаў дастаткова шырокі рэзананс як з боку грамадзян, так і з боку мясцовых улад. Ёсць нюансы правапрымяняльнай практыкі, — лічыць жыхарка Рагачова Святлана Казакевіч.

Як чакаецца, у сувязі з пускам Беларускай атамнай станцыі гэты працэс будзе праходзіць больш актыўна. Разам з тым, для практычнай рэалізацыі гэтага ўказа неабходна прывесці ў адпаведнасць іншыя заканадаўчыя акты. Рэальную дапамогу ў вырашэнні згаданай сітуацыі могуць аказаць у Савеце Рэспублікі. Сяргей Сівец паабяцаў дэталёва вывучыць закранутае пытанне і пры неабходнасці звярнуцца ў галіновыя міністэрствы. Сенатар растлумачыў, гэта актуальная тэма будзе вывучацца на рэспубліканскім узроўні, і ў выпадку юрыдычных калізій або прававой недакладнасці, пытанні разгледзяць у законным парадку.

Усе абазначаныя на прыёме пытанні зафіксаваныя і ўзяты сенатарам на кантроль. Па кожным з іх будзе дадзены поўны і аргументаваны адказ.

Член Савета Рэспублікі Сяргей Сівец правёў сустрэчу з калектывам Рагачоўскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа будаўнікоў. У размове з калектывам установы адукацыі сенатар звярнуў увагу на тое, што цяперашні час, па сутнасці, — перыяд стварэння новай грамадскай дамовы, у якой павінны быць адлюстраваны спадзяванні, меркаванні, памкненні і жаданні большасці грамадзян краіны.

— Наша задача зараз — знайсці грамадскую парадыгму перамен, пра якую так шмат гаворыцца. І работа, якая праводзіцца на дыялогавых пляцоўках, нацэлена менавіта на гэта, — падкрэсліў Сяргей Сівец. Сенатар упэўнены, што ў працэсе грамадскага дыялогу неабходна знайсці залатую сярэдзіну.

— Яна павінна быць ва ўсім, не толькі ў праве, але і працоўных, і грамадскіх адносінах. Важна развівацца не шляхам узрушэнняў або рэвалюцый, якія могуць канцэптуальна змяніць наша жыццё. Як паказвае гісторыя, такога роду змены — трагічныя. У прыватнасці, дастаткова ўспомніць падзеі ў постсавецкай краіне пасля развалу Савецкага Саюза. Многія памятаюць, што ў той час таксама гучалі лозунгі і заклікі да перамен. Ці жывыя ў памяці і наступствы, да якіх гэта прывяло, — звярнуўся Сяргей Сівец.

Сенатар звярнуў увагу, што лозунгі, якія часам дэкларуюцца звонку краіны могуць толькі эмацыянальна расхістваць людзей:

— У гэтай сітуацыі мы павінны ўключаць крытычнае мысленне. Бо гісторыя развіваецца па спіралі. Ці варта наступаць на граблі, на якія аднойчы ў гісторыі наступілі. Ці варта ўсё ламаць і зноў выбудоўваць канструкцыю дзяржаўнасці, якая дазваляе забяспечыць элементарныя базавыя каштоўнасці: бяспеку, магчымасць працаваць, мець дах над галавой? Грамадскі дагавор — гэта і ёсць Канстытуцыя. Важна закласці ў ім базавыя ўстаноўкі. Пры гэтым змена грамадскага дагавора не можа быць зонай адказнасці толькі парламента, Прэзідэнта або кіраўніка палітычнай партыі. Гэта зона адказнасці ўсіх, — падкрэсліў член Савета Рэспублікі.

Сяргей Сівец перакананы, што сёння па сродках дыялогавых пляцовак і грамадскіх прыёмных можна прааналізаваць і выразна адказаць на пытанне, якія канкрэтныя змены патрэбна рэалізоўваць.

— Трэба дакладна разумець, чаго мы хочам і якой бачым краіну праз 10—20 гадоў. Канстытуцыя не прымаецца на год—два, гэта дакумент на дзесяцігоддзі, — звярнуўся да прысутных сенатар.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

НА ПЕРСПЕКТЫВУ

## КАНСТРУКТЫЎНАЯ ДЫСКУСІЯ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ правёў нараду па пытаннях развіцця галіны культуры.**



www.sovrep.gov.by

У ёй прынялі ўдзел міністр культуры Анатоль Маркевіч і яго намеснік Валерый Грамада. Удзельнікі нарады разгледзелі пытанні ўдасканалення нарматыўнай прававой базы ў галіне культуры, развіцця тэатральнай творчасці, аховы гісторыка-культурнай спадчыны, фінансавага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і іншыя.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, канструктыўная дыскусія дала магчымасць атрымаць падрабязную і поўную інфармацыю па тэме абмеркавання, што дазволіць у далейшым прыняць эфектыўныя кіраўніцкія рашэнні.

Акрамя таго, новы міністр культуры азнаёміўся з музейнай экспазіцыяй Савета Рэспублікі, якая пачала дзейнічаць у канцы верасня.

## У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГАВАЙ ПЛЯЦОЎКІ

**Прайшла сустрэча студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта са старшынёй профільнай камісіі Савета Рэспублікі Міхаілам РУСЫМ.**

Так, будучыя аграрыі цікавіліся ў старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні перспектывамі развіцця сельскай гаспадаркі ў нашай рэспубліцы, пытаннямі маладзёжнай палітыкі, сітуацыяй у краіне і іншымі.

Падчас дыялогу сенатар агучыў сваё бачанне тэматыкі ўдасканалення заканадаўства ў кірунку мэтавай падрыхтоўкі студэнтаў, планамі на будучае, а таксама адказаў на пытанні аўдыторыі, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

— Такія сустрэчы будуць працягнуты. Нам важна ведаць, аб чым думае цяперашняе пакаленне, якім яно бачыць будучае Беларусі, — падкрэсліў Міхаіл Русы.

НА СУВЯЗІ

## ПРАПАНОВЫ ПА ПАДАТКАХ І СКАРГІ НА ШУМ

**Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Тацццяна РУНЕЦ правяла прамую лінію.**



www.sovrep.gov.by

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, геаграфія званкоў датычылася розных рэгіёнаў краіны, а іх тэматыка была вельмі разнастайная.

Заяўнікі звярталіся з просьбамі пасадзейнічаць у вырашэнні асабістых пытанняў, у прыватнасці, у пераглядзе крымінальнай справы, правядзенні капітальнага рамонту жылля, атрыманні новай арэнднай кватэры, пераводзе ацяплення ва ўласным жыллі з пячнога на электрычнае, змене юрыдычнага адраса, устаноўцы шлагбаума на дваровай тэрыторыі, выплаце дывідэндаў акцыянерам, разліку па заробку і іншых.

Дарэчы, не ўсе заяўнікі ўзнімалі толькі тэмы, якія датычацца менавіта іх саміх — былі і такія, хто звяртаў увагу сенатара на пытанні, што закранаюць інтарэсы шырокага кола грамадства. Напрыклад, выкарыстання чэкаў «Жыллё», выплат па дагаворах страхавання, асвятлення ў сродках масавай інфармацыі сітуацыі з распаўсюджаннем каранавіруснай інфекцыі, будаўніцтва дарогі ў Мінскім раёне.

Як удакладнілі ў профільнай камісіі, на прамой лініі гучалі і розныя ініцыятывы. У прыватнасці, кіраўнік аднаго з інавацыйных прадпрыемстваў прапанаваў, каб падчас мадэрнізацыі прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці швейнае абсталяванне, якое маральна і фізічна састарэла, не накіроўвалася на метапалом, а атрымлівала новае жыццё, дзякуючы далейшаму пераасначэнню. Ад гэтага ўсе будуць у плюсе: і тыя, хто мадэрнізуецца, і тыя, хто ўдыхне ў састарэлае абсталяванне новае жыццё, і тыя, хто ў далейшым атрымае магчымасць выкарыстання для сваёй вытворчасці яшчэ прыдатнага абсталявання. Цікавую прапанову накіруюць для разгляду і вывучэння перспектыў яе прымянення на практыцы ў канцэрн «Беллегпрам».

Акрамя таго, прагучала прапанова па карэкціроўцы нормы дзеючага падатковага заканадаўства, якая датычыцца вызвалення ад аплаты зямельнага падатку і падатку на маёмасць пенсіянераў па ўзросце, але толькі ў тым выпадку, калі ў жылых дамах, размешчаных на гэтых зямельных надзелах, не зарэгістраваны працаздольныя людзі. Пенсіянер, жыхар мікрараёна індывідуальнай забудовы, прапанаваў распаўсюдзіць гэтую льготу і на пенсіянераў, што жывуць з паўналетнімі членамі сям'і, але ўвесці да пенсіянераў узроставы мінімум — не раней за 70 гадоў.

Дарэчы, як адзначылі ў профільнай камісіі, такое пытанне ўзнімалася ў шматлікіх зваротах. Пры прапрацоўцы змен і дапаўненняў у Падатковы кодэкс гэтая ініцыятыва будзе разгледжана Пастаяннай камісіяй сумесна з зацікаўленымі міністэрствамі.

Акрамя таго, падчас прамой лініі грамадзяне гаварылі і аб палітычнай сітуацыі ў краіне, выказвалі спадзяванні, што ў хуткім часе ўсё вырашыцца на карысць канструктыўнай часткі грамадства і закончацца несанкцыянаваныя мітынгі, шум і абмежаванні руху на дарогах.

Трэба сказаць, што па многіх пытаннях, агучаных на прамой лініі, Тацццяна Рунец давала адказы і тлумачэнні адразу, тыя, што патрабуюць больш шчыльнага вывучэння, накіраваны ў профільныя дзяржаўныя органы для разгляду і прыняцця неабходных мер.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Сядзі і глядзі

# ГАТУЕМ «НА ТЫДЗЕНЬ» АРЫГІНАЛЬНА І СМАЧНА З «БЕЛАРУСЬ 2»

**На тэлеканале «Беларусь 2» заўтра стартуе новае кулінарна-забаўляльнае шоу «На тыдзень», якое дакажа, што дастаткова выдзеліць адзін дзень для прыгатавання ежы, каб уся сям'я засталася сытая.**

Ні для кога не сакрэт, што людзі імкнуцца ісці ў нагу з часам: хочуць быць стыльныя, здаровыя, займацца самаадукацыяй, а не толькі праводзіць свой час на кухні. Але ж як усё паспець, калі нават штодзённае гатаванне адбірае шмат часу? Стваральнікі праграмы «На тыдзень» пераканаюць аўдыторыю, што гэта вельмі проста.



Вядучай шоу стала шэф-повар адной з папулярных сталічных устаноў Ніна Шабан. Яна прадэманструе не толькі прыгатаванне страў рознай ступені цяжкасці, але і падзеліцца прафесійнымі рэкамендацыямі па іх замарозцы для хуткага выкарыстання на працягу ўсяго тыдня.

— Рэцэпты, якія публікуюцца ў кулінарных выданнях ці ў інтэрнэце, часта выкарыстоўваюць даволі фармальны падыход, — кажа вядучая. — Змяшаць усё ў пэўным парадку і ў зададзеных прапорцыях, а потым зварыць, падсмажыць альбо спячы — і гатова. Але, каб гатаваць па-сапраўднаму смачна, важны і творчы падыход, які я і прадэманструю аўдыторыі. Дарэчы, менавіта таму ў праграме будуць сустракацца рэцэпты ўсім знаёмых страў, але ў маёй аўтарскай дапрацоўцы.

Кулінарнае шоу будзе выходзіць на канале па суботах, і прэм'еру чакаем 5 снежня ў 12.20.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота дадзена Белтэлерадыёкампаніяй.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 128

Працягваем бліц-конкурс на найлепшае рашэнне шашачных кампазіцый майстра спорту з Магілёва Дзмітрыя Камчыцкага. Сёння прапануецца пяць пазіцый другога тура. Тэрмін дасылкі адказаў — два тыдні з моманту публікацыі. Рашэнне кожнай пазіцыі ацэньваецца ў адно ачко. За знаходжанне пабочных рашэнняў можна атрымаць дадатковае ачко.

№ 129



**№ 129**

**Белыя простыя шашкі:** c1, b2, e3, d4, f4, d6, h6 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** c3, b6, f6, a7, g7, f8 (6).

**№ 130**

**Белыя простыя шашкі:** f2, e3, b4, d4, c5, h6 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** h2, a3, a7, e7 (4).

**№ 131**

**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, g3, f4, d6, c7, e7 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** f2, h2, b4, d4, c5, h6, g7, b8 (8).

**№ 132**

**Белыя простыя шашкі:** a3, g3, b4, h4, d6, h6, a7 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** h2, d4, c5, e7, g7, b8, f8 (7).

**№ 133**

**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, b2, f2, e3, d4, d6, f6 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** h2, b4, h4, b6, b8, d8, f8 (7).

Яшчэ некалькі кампазіцый, складзеных вядучым аддзела, прапануецца аматарам стаклетачных шашак.

**№ 134**

**Белыя простыя шашкі:** 37, 38, 39, 40, 31, 32, 33, 27, 29 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** 22, 23, 17, 18, 12, 8, 9, 10, 2 (9).

**№ 135**

Белыя простыя шашкі: 48, 44, 37, 40, 32, 33, 27, 28, 23 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** 26, 30, 24, 18, 20, 12, 9, 1 (8).

У анлайн-турніры «Кубак прэзідэнтаў» беларуская шашыстка правяла цікавую камбінацыю супраць расійскага гросмайстра, але, на жаль, прайграла.

№ 136 Шайбакоў А. — Петрусёва П.

**Белыя простыя шашкі:** 43, 44, 36, 39, 31, 32, 33, 34, 35, 26 (10).

**Чорныя простыя шашкі:** 30, 22, 25, 16, 17, 19, 13, 15, 8, 9 (10).

1...19-23 2. 35:24 23-29 3. 34:23 13-19 4. 23:21 16:40 5. 31-27 22:31 6. 36:27+

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 127 ад 20.11.20.

№ 122 b6(c5 A)e1,a1X A(f2) a3,a1X.

№ 123 e7(g1)f8(c5 A)b4,b6(d4 B)c7,b8(c5)a7(b4)e3(c3)c1X B(b4)c7,b8(a3)e5X A(b6) c7,b4,b8(d4)f4(c3)c1X.

№ 124 f6,b6,f8,e1X.

№ 125 f8,b8,e5,h2X.

№ 126 b4, b2, e7, g1(c5) b6, c3X.

№ 127 1. 10-05 37:46 2. 13-08 12:03 3. 14-09 25:14 4. 05:48 03:14 5. 34-30 35:24 6. 44-40 45:34 7. 48:05+

№ 128 1. 40-34 30:28 2. 32:23 12:41 3. 23:03 36:27 4. 03:15+

«Перамога белых, як той казаў, на адным дыханні», — піша Сяргей Бурко з Оршы.

Першымі дакладныя адказы даслалі В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), Э. Дамброўскі, А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), У. Дубінскі (Варонеж, РФ), С. Бурко (Орша), С. Рашэцін (Ашмяны).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск. E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Драма мінулага і яе героі

**Тэлеканал «Беларусь 3» на наступным тыдні ўжо па традыцыі прапаноўвае шэраг мастацкіх фільмаў, якія прайшлі выпрабаванне часам і сталі набыткам савецкага кіно. Сярод іх і беларуска-расійская кінастужка «Сын за бацьку», якая была знята «Беларусьфільмам» у 1995 годзе. Яе рэжысёрамі выступілі Маргарыта Касымава і Мікалай Яроменка-малодшы (гэты фільм з'яўляецца яго адзінай рэжысёрскай работай).**



Вядомы як акцёр у савецкім кінематографе Мікалай Яроменка вырашыў тады паспрабаваць сябе ў рэжысуры і ўзяўся за актуальную для таго часу тэму. Фільм расказвае, як ва ўмовах панучых рынachных адносін у медыцыне пластычны хірург старой загартоўкі (Мікалай Яроменка-старэйшы) аказваецца без работы. Яго паспяховы сын, які ў Маскве кіруе клінікай, прапаноўвае бацьку, хоць у іх і не асабліва цёплыя адносіны, арганізаваць аналагічны медыцынскі цэнтр у Мінску. Але ж тата да патрабаванняў сучаснасці мала прыстасаваны, таму з часам, узначальваючы ўстанову, нажывае сабе непрыемнасці з мафіяй, бо не здольны і не хоча адступіцца ад уласных прынцыпаў. Сын жа спрабуе ўладзіць сітуацыю ў перапынках паміж заляцаннямі да маладой доктаркі. Але ж на справе гэтыя спробы не маюць плёну, а выратоўвае бацьку значна міліцыянер. Аднак тое, што сын праявіў такі клопат, расчульвае мужчыну, і гэта спрыяе таму, што адносіны двух блізкіх людзей мяняюцца ў лепшы бок...

Варта адзначыць, што на экране ролі гэтых герояў таксама выконваюць сапраўдныя бацька і сын Мікалай Яроменка-малодшы і Мікалай Яроменка-старэйшы. Гэтая іх сумесная кінаработа стала і апошняй, бо ў 2000 годзе пайшоў з жыцця бацька, а праз год не стала сына. Акрамя вышэйназваных акцёраў у фільме зняліся таксама Ірына Феафанава, Уладзімір Гасцюхін, Альбінас Келярыс і іншыя. Кінастужка для сучаснага гледача — гэта ўжо не столькі драма, а, хутчэй, магчымасць перанесціся ў часе, каб не толькі пранікнуцца атмасфернасцю пэўнага перыяду, але яшчэ і ўбачыць, напрыклад, Мінск, які ён быў у тыя гады.



Фільм, дарэчы, меў напярэдадні выхаду добрую рэкламную кампанію і не падмануў чаканні гледачоў. Бо «Сын за бацьку» добра перадае атмасферу ліхіх 90-х. Кінастужка не засталася незаўважанай і з боку кінасупольнасці. Напрыклад, у 1998 годзе яе адзначылі Галоўным прызам міжнароднага кінафестывалю ў Карэі, а да гэтага карціна атрымала прыз «Бронзавы Віцязь» як найлепшы ігравы фільм на Міжнародным кінафестывалі славянскіх і праваслаўных народаў «Залаты Віцязь» (Расія, 1996 год), прыз «Крыштальны акт» на Нацыянальным кінафестывалі беларускіх фільмаў у Брэсце (1996 год) і спецыяльны прыз журы ў конкурсе «Панарама» на АРКФ «Кінатаўр» (Расія, 1996 год).

Таму, мяркую, ёсць падставы знайсці час для прагляду кінафільма «Сын за бацьку» на тэлеканале «Беларусь 3» і, магчыма, паразважаць над тым, ці шмат змянілася ў нашым жыцці за гэты час. Альбо ж ёсць рэчы, якія застаюцца пастаяннымі, як бы ні змяняліся правілы гульні навакольнага свету.

**Алена ДРАПКО.**


## «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 студзеня 2021 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 15 студзеня 2021 года будуць разыграны 7 жаночых камізэлек і суперпрыз — маслены радыятар General Climate. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 студзеня 2021 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2021 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» чытайце ў нумары 230 газеты «Звязда» ад 25 лістапада.



**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 01.12.2020 да 31.03.2021 года.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3885 ад 11.11.2020 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10, 21.45 Серыял «След» (16+).**
**10.45** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Меладрама «Айчым» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.50, 15.25 Меладрама «Прыгонная» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.00** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**23.45** Сфера інтарэсаў.
**0.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 16.30** Тэлебарометр.
**9.05** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**10.15, 22.35** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.10, 18.25 Серыял «Унутры» (16+).**
**13.05** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**14.00** «Да пабачэння» (16+).
**14.50, 23.35 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «Пін_код» (12+).
**16.35 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.25** «Панаехалі» (16+).
**20.15 Серыял «Сляпая» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.25** «Трэці лішні» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Малочны суп з агароднінай.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.35** Навіны культуры.
**8.25 «Усяго адзін паварот». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**9.40** «Люблю і памятаю». Аляксандр Моніч.
**10.20, 16.40 «1943». Серыял (12+).**
**12.20** «Беларуская кухня». Казіны сыр.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15** «Апошні дзень». Барыслаў Брандукоў (12+).
**13.55, 21.40 «Арлова і Аляксандраў». Серыял. 1-я і 2-я серыі (16+).**
**15.45** «Спявае Беларусь». Фальклорнае песеннае шоу. Ансамбль народнай песні і музыкі «Бабруйскія музыкі» (г. Бабруйск).
**18.15 «Усяго адзін паварот». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Суразмоўцы». Мікалай Гайба.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Апошні дзень». Юрый Гуляеў (12+).

## Беларусь 5

**7.00, 8.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**9.55** На грані фолу. Футбольны агляд.
**11.25** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Расія — Швецыя.
**13.05** Біятлон. Кубак свету. Кантыялахці. Гонка пераследу. Мужчыны.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — БАТЭ (Барысаў).
**16.00** Фрыстайл. Лыжная акрабатыка. Кубак свету. Фінляндыя.
**17.40** Біятлон. Кубак свету. Кантыялахці. Эстафета. Жанчыны.
**19.10** Спорт-цэнтр.
**19.20** Суддзі УЕФА. Дак. фільм. Эпізод 2.
**20.15** Спорт-кадр.
**20.45, 22.50, 0.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.20, 8.20** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
**9.15** «Тэорыя змовы» (16+).
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.15** «Грамадзянская абарона» (16+).
**13.15, 22.15 Серыял «Гатэль шчаслівых сэрцаў» (12+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.10** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+)
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Скажы што-небудзь добрае» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.20, 0.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.30, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.15, 16.50 «Штрафнік». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».

## МІР

**5.00, 1.50 Серыял «Гастралёры» (16+).**
**7.00, 10.10 Серыял «Пілот міжнародных авіяліній» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 17.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Сусветнае пагадненне» (16+).
**18.15, 19.25 Серыял «Чужы раён» [СЦ] (16+).**
**21.40** Тэлегульня «Гульня ў кіно» (12+).
**22.25** Шоу «Назад у будучыню» (12+).
**23.25** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.15 Маст. фільм «Мы з джаза» [СЦ] (0+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35 Серыял «Вой, ма-мач-кі!» (12+)**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Марозава» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Таямніцы следства—19» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.35, 22.15, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.10** Формы жыцця. Лясныя гісторыі ад Бышнева (6+).
**6.20** Беларусы (6+).
**7.15** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** Нашы (12+).
**9.00** «Навукаманія» (6+).
**9.35, 22.20** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**11.10 Серыял «Каманда» (16+).**
**12.05, 13.45 Баявік «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).**
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.10, 19.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**21.15 Дэтэктыў «Першы аддзел» (16+).**
**22.35 Серыял «Груз» (16+).**
**23.55** «Справа ўрачоў» (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.55, 18.25, 21.05, 1.00** «Надворʼе» + «Эрана».
**7.05, 16.05** «Мультпарад». «Скубі Ду» (0+).
**7.30, 16.00, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Звышнатуральнае» (12+).**
**9.00, 19.20 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**9.45** Дак. фільм.
**10.10** М/ф «Том і Джэры. Прысьба» (0+).
**11.25, 16.50 Серыял «Сямейная сага» (16+).**
**12.55 Драма «Адмірал» (16+).**
**15.00, 18.35 Серыял «Каралеўства» (16+).**
**16.30** «Дзеці пра ежу».
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.10 Трылер «Асобная думка» (16+).**
**23.35 Камедыя «Не мая сабачая гэта работа» (12+).**

## ВТБ

**6.05** «Лаві МОМАНТ» (16+).
**7.35** «Раніца з гумарам» (16+).
**9.25** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.00** «Проста кухня» (16+).
**11.00** «Дзеткі-продкі» (12+).
**12.05** «Пары на Канары» (16+).
**13.05** «Селапаляцела» (16+).
**14.25** Фантастыка «Таймлес-2: сапфіравая кніга» (12+).
**16.50** Фантастыка «Чалавек-павук» (12+).
**19.20** Анімацыйны фільм «Кароль сафары» (0+).
**21.00, 2.50** «Уральскія пельмені» (16+).
**22.30** Камедыя «Краіна цудаў» (12+).
**0.10** Серыял «Сторыз» (16+).
**3.45** «Даеш моладзь» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Біблейскі сюжэт».
**7.05** «Вер-не-Вер». «Сястрычкі-звычкі». «Васьміножкі». Мультфільмы.
**7.50** «Зацішша». Маст. фільм.
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.30** «Сёмае неба». Маст. фільм [СЦ].
**12.05** «Эрмітаж» [СЦ].
**12.35** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**13.15** Зямля людзей. «Вепсы. Танцы з мядзведзем» [СЦ].
**13.45** «Дзікая прырода Уругвая». Дак. фільм [СЦ].
**14.45** Да 175-годдзя Рускага геаграфічнага таварыства. «Ехаў грэка... Падарожжа па сапраўднай Расіі». Дак. серыял [СЦ].
**15.30** Прэм'ера. Вялікі балет.
**17.40** «Энцыклапедыя загадак». Дак. серыял. «Таямніца каменных гігантаў» [СЦ].
**18.10** Да 75-годдзя Яўгена Сцяблова. «Урок літаратуры». Маст. фільм [СЦ].
**19.20** Лінія жыцця. Яўген Сцяблоў [СЦ].
**20.20** Кіно на ўсе часы. «Мэнсфілд Парк». Маст. фільм.
**22.00** «Агора». Ток-шоу.
**23.00** «Архіўныя таямніцы». Дак. серыял.
**23.30** Клуб 37.
**0.35** «Мая ноч у Мод». Маст. фільм.
**2.20** «Жыў-быў Казявін». «Кватэра з сыру». «Кважды Ква». Мультфільмы для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына». «Машина времени» (12+).
**7.00** «Мантаж» (16+).
**8.05** «Рок-н-рол ТБ» (16+).
**8.45, 9.45, 11.00, 12.00, 12.55, 14.10, 15.45, 17.00, 18.00, 19.00, 2.25, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.20, 17.20** Дак. фільм «Чоўны. Школа выжывання» (18+).
**12.10, 18.10** «Да і пасля...» Год 1977-ы (16+).
**13.05** Тэлеспектакль «Міця» (16+).
**16.00** «Колба часу».
**19.55** Канцэрт гуртоў «Машина времени» і «Цветы» (12+).
**21.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**22.00** Маст. фільм «Нянавісць» (16+).
**23.10** Фільм-канцэрт «Зімовы вечар... у Лужніках!» (12+)
**0.00** «Сняем, сябры!» (12+)
**1.00** Маст. фільм «Уваранне» (16+).

## EuroSport 1

**1.05, 3.30, 8.00, 17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету па палётах (12+).
**2.30, 7.00, 15.30** Біятлон. Кубак свету (6+).
**5.00, 9.00, 20.50** Снукер. Scottish Open (6+).
**10.30** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**19.45** Санны спорт. Кубак свету (12+).

## Кінакамедыя

**1.05** Да чорта на рогі (16+).
**2.45** Басаножак па горадзе (18+).
**4.25** Сакавіцкія каты (16+).
**6.15** Ні хвіліны спакою (12+).
**7.50** Мужчыны супраць жанчын (16+).
**10.00** Жанчыны супраць мужчын (16+).
**12.00** Чатыры пакоі (18+).
**13.50** Аперацыя «Тушонка» (16+).



**15.55** Улюбёнцы Амерыкі (16+).
**17.50** Дачка майго боса (12+).
**19.30** Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).
**21.05** Таткі без школьных звычак (16+).
**23.05** Ты ўмееш захоўваць сакрэты? (16+)

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.10** «Улегцы» (12+).
**9.40** «М & S» (12+).
**10.15** «Пагладзім» (12+).
**10.50, 22.30** «Перыскоп» (16+).
**11.10** «Вакол свята. Месцы сілы» (16+).
**12.15, 5.10** «Гучныя справы» (16+).
**13.20, 4.20** «Псіхасаматыка». (12+).
**14.00** «Новы дзень» (16+).
**14.40** «Апошні довад». Маст. фільм (12+).
**16.30** «Апакаліпсіс» (12+).
**17.35** «Якія вярнуліся» (16+).
**18.40** «Мільён на мару» (16+).
**19.55** «Асцярожна, ашуканцы!» (16+)
**20.35** Маст. фільм «Новы сусед» (12+).
**22.50** Маст. фільм «Нябачны бок» (16+).
**1.15** «Грым». Серыял (16+).
**2.45** «Апошні довад». Маст. фільм (12+).

## ТБ1000

**5.00** Жарты ўбок-2: місія ў Маямі (16+).
**6.50** Чырвоная Шапка супраць зла (12+).
**8.15** Я, Франкенштэйн (16+).
**9.50** Яна (16+).
**12.00** Як выкрасці хмарачос (12+).



**13.50** Дзюплекс (16+).
**15.25** Прыгоды Падынгтана (6+).
**17.05** Прыгоды Падынгтана-2 (6+).
**19.00** Чароўная краіна (12+).
**20.45** Таемнае акно (12+).
**22.30** Вобласці цемры (16+).
**0.25** Вялікая гульня (18+).
**2.50** Кліент (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Рок-н-рол для прынцэс. 1-2-я серыі (6+).
**8.15** 9 рота (16+).
**10.40** Адмірал (16+).
**12.50** Глухар у кіно (16+).
**14.30** Стылягі (16+).



**17.00** Гудбай, Амерыка (12+).
**19.00** Каханне ў вялікім горадзе (16+).
**20.35** Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).
**22.15** Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).
**23.45** Аднакласнікі.Ru: НаCLICKай удачу (12+).
**1.50** Удачлівы выпадак (12+).
**3.40** ЖАРА (16+).

## National Geographic

**6.00** Інстынкт выжывання (16+).
**6.45** Панарама 360 градусаў: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
**7.40** Тайвань — востраў рыбы (16+).
**9.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**10.10** НЛА над Еўропай: невядомыя гісторыі (16+).
**11.50** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**13.30** Аўта-SOS (16+).
**15.10** Закінутыя гарады з Альбертам Лінам (16+).
**16.50** Закінутыя скарбы Майя (16+).
**17.40** Егіпет з найвялікшым даследчыкам у свеце (16+).
**18.30** Царства мумій (16+).
**19.20, 21.50** Егіпет з вышыні птушынага палёту (16+).
**20.10** Закінутыя скарбы Егіпта (16+).
**21.00** Жыццё каралевы (16+).
**22.40** Код небяспекі (16+).
**23.30** Зборнік «Гульняў розуму» (16+).
**1.05** Нацыянальныя паркі Амерыкі (16+).
**1.55** Антарктыка (16+).
**3.30** Сведкі катастроф (16+).
**4.20** Асушыць акіян (16+).

## Discovery

**8.00, 11.41, 19.20** Махінатары (12+).
**8.45** Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).
**9.10, 21.27** SpaceX запуск Crew-1 (12+).
**10.50, 2.33** Голыя і напалоханыя (16+).
**12.32, 20.11** Жаночая аўтамайстэрня (12+).
**13.23, 6.28** Сталёвыя хлопцы: аўкцыён (12+).
**14.14, 7.14** Іржавая імперыя (12+).
**15.05** Багажныя войны (12+).
**21.2, 4.10** Як гэта зроблена? (12+)
**23.09** Залатая ліхаманка (16+).
**0.00** Верталётчыкі (12+).
**0.51** Забітыя тачкі (12+).
**3.24** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**4.56** Не спрабуйце паўтарыць (16+).

## Беларусь 1

**6.00** Існасць [СЦ].
**6.30 Меладрама «Шчасце з асколкаў». 1-я серыя (16+).**
**8.25** Сэнс жыцця (12+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Добрай раніцы, Беларусь!» (12+)
**9.55** Здароўе (12+) [СЦ].
**10.50** Дача (12+).
**11.30, 12.10, 23.15** Меладрама «Уціхамірванне свекрыві». 1—2-я серыі (12+).
**12.50, 15.40, 19.10, 21.40 Меладрама «Чужая» (16+).**
**15.10** Краіна.
**21.00** Панарама.
**1.35** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
**8.00, 16.15** Тэлебарометр.
**8.05 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**9.45** Анімацыйны фільм «Ратату́й». (12+).
**11.25** «Вежа» (12+).
**12.15** Камень, нажніцы, папера (16+).
**12.50** «На тыдзень» (16+).
**13.55 Камедыя «Мой сябар Дзед Мароз» (12+).**
**15.20** «Паненка-сялянка» (16+).
**16.20** «Развод і дзявочае прозвішча» (16+).
**17.30** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**18.30** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**19.25 Прыгоды «Кніга Джунгляў» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.25 Фантастыка-прыгодніцкі экшн «Першы мсцівец: супрацьстаянне» (16+).**
**23.55** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).

## Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 13.45** Навіны культуры.
**8.20** «Зноў двойка». Мультфільм.
**8.40 «Дамы запрашаюць кавалераў». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.00** «Жывая спадчына». Абрад «Перанос Міхайлаўскай свечкі» (а. г. Валяцічы, Барысаўскі раён, Мінская вобласць).
**10.25** «Беларуская кухня». Пражонка.
**10.55** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**11.25 «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан». Серыял (12+) [СЦ].**
**14.05** «Навукаманія» (6+).
**14.30** «Сваімі словамі».
**15.10 «Дзяўчына без адраса». Маст. фільм (12+).**
**16.40** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Павел Асмакоўскі [СЦ].
**17.10** Эдвард Грыг. «Пэр Гюнт». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.
**18.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**19.00 «Контрудар». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**20.25** «Суразмоўцы». Вольга Паўлючэнка.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Зайчык». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**22.35** Д. Пучыні. «Віліс». Фатум». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.
**23.45** «Арт-гісторыі». Чатыры жыцці Язэпа Драздовіча [СЦ].

## Беларусь 5

**7.00, 8.50, 13.35, 16.45** Біятлон. Кубак свету. Хохфільцэн.
**8.20** Авертайм.
**10.20** Хакей. КХЛ. «Ак Барс» (Казань) — «Дынама-Мінск».
**12.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэасапоіс.
**12.50** Вялікі спорт.
**15.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Парма» (Перм).
**17.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Гомель» — «Дынама» (Маладзечна). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**20.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Манчэстэр Сіці». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.20** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэасапоіс.
**22.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Чэлсі». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ], **18.00, 20.00** Нашы навіны.
**7.15** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**8.00** «101 пытанне даросламу» (12+).
**8.55** «Беларусь. Геаграфія з біяграфіяй» (12+).
**9.15 Фільм «Каханне на два полюсы» (16+).**
**10.55** «Бачылі відза?» (6+)
**12.25** Да 95-годдзя Уладзіміра Шаінскага. «Здабыткі рэспублікі» (0+).
**14.20** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+)
**16.20, 18.20** «Ледніковы перыяд». Новы сезон (6+).
**20.45** «Метэагід».
**21.05** «Сёння ўвечары» (16+).
**22.45** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых» (16+).

## СТБ

**6.05, 0.50** «Дзіўная справа» (16+).
**7.50** «Анфас».
**8.10** «Самая карысная праграма» (16+).
**9.05** Дакументальны праект (16+).
**10.00** «Мінск і мінчане».
**10.30** «Цэнтральны рэгіён».
**11.00, 13.40, 16.40, 20.40 «Штрафнік». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**20.30** «СТБ-спорт».
**23.55** «Тэрыторыя памылак» (16+).

## МІР

**5.00 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).**
**6.30, 3.30** Мультфільмы (0+).
**6.45** «Сакрэтныя матэрыялы» (12+).
**7.10** «Гульня ў словы» (6+).
**8.10** «Усё, як у людзей» (12+).
**8.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**9.00** Ток-шоу «Слабае звяно» (12+).
**10.00** Надвор'е ў свеце.
**10.10 Маст. фільм «Зіта і Гіта» (12+).**
**13.10 Маст. фільм «Танцор дыска» (12+).**
**16.00. 19.00** Навіны (бягучы радок).
**16.15, 19.15 Маст. фільм «Вялікі перапынак» [СЦ] (0+).**
**22.10 Маст. фільм «Ласкавы май» (16+).**
**0.45 Маст. фільм «Салон прыгажосці» [СЦ] (12+).**
**2.15 Маст. фільм «Цырк» [СЦ] (0+).**

## РТР—Беларусь

**7.05 Серыял «Вой, ма-мач-кі!» (12+).**
**11.00** Весткі.
**11.20** «Таямніцы Беларусі» (16+).
**12.25** «Гумар! Гумар! Гумар!!!» (16+)
**13.30** «Доктар Мяснікоў» (12+).
**14.35** «Алюр». Шоу Людмілы Радзівонавай.
**16.15 Маст. фільм «Пакуль смерць не разлучыць нас» (12+).**
**19.45** «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** «Прывітанне, Андрэй!» (12+)
**22.30 Маст. фільм «Крыўная помста» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.05** Сёння. Галоўнае.
**6.10** За гранню (16+).
**6.25** Беларусы (6+).
**7.20** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «НЗ.by: час вынікаў».
**8.45** «Гарады Беларусі» (6+).
**9.20** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**10.20** Галоўная дарога (16+).
**11.00** «Жывая ежа» (12+).
**11.55** Кватэрнае пытанне (0+).
**12.55** Гісторыі выратавання (12+).
**13.20** «Паедзем, паядзім!» (0+)
**14.00 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата». «Праклён Эдварда Мунка» (16+).**
**16.20** «Сакрэт на мільён». Юрый Куклачоў (16+).
**18.10** «Следства вялі...» (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Суперстар! Вяртанне» (16+).
**22.35** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
**0.10** «Крутая гісторыя» (12+).

## 8 канал

**7.00, 19.00, 21.10, 1.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** «Мультпарад». «Гісторыя цацак» (6+).
**8.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**8.50 Камедыя «Добры дзень, я ваша цётка» (12+).**
**10.30** «Дзеці пра ежу» (12+).
**11.00 Драма «Мурка», 1—6 серыі (16+).**
**16.15** «Надвор'е».
**16.20 «Глядзім усёй сям'ёй»: «Прыгажуня і пачвара» (16+).**
**18.30** «Бьюці дзень» (12+).
**19.05 Трылер «Мой ствараль-нік» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.00** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.15 Драма «Тры метры над узроўнем неба», 1-2 часткі (16+).**





## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00, 14.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**10.35** Трылер «Калектар» (16+).
**12.05, 23.40** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**12.55** «Руса турыста» (16+).
**15.50** Серыял «Нефармат» (16+).
**16.55** «Уральскія пельмені» (16+).
**18.00** Серыял «Сторыз» (16+).
**19.00, 1.00** Серыял «Вечны водпуск» (16+).
**20.30** Серыял «Радкам» (16+).
**21.30** Камедыя «Кухня. Апошняя бітва» (12+).



**0.00** Серыял «Каманда Б» (16+).
**2.25** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**3.40** «Адна за ўсіх» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30,23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква адліжная.
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 18.35** «Жанчыны-ваяўніцы. Амазонкі». Дак. фільм [СЦ].
**8.25** Легенды сусветнага кіно. Максіміліян Шэл.
**8.55, 16.30** «Цяжкія паверхі». Маст. фільм. 1-я серыя [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.40** ХХ стагоддзе. «Іду на дапамогу!..» Дак. фільм. 1984 год.
**12.15** «Сірэна з Місісіпі». Маст. фільм.
**14.15** «Гульня ў бісер».
**15.05** Навіны. Падрабязна. Кніга.
**15.20** «Эрмітаж» [СЦ].
**15.50** «Саці. Нясумная класіка...»
**17.35** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**17.50, 1.40** Да 250-годдзя з дня нараджэння Людвіга ван Бетховена. Канцэрт № 3 для фартэпіяна з аркестрам. Альфрэд Брэндэль, Клаўдыё Абада і Люцэрнскі фестывальны аркестр.
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.50** Колер часу. Надзя Рушава.
**21.00** Урачыстае закрыццё ХХІ Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкантаў «Шчаўкунок».
**23.20** «Такая жыза Аляксея Навасёлава». Дак. фільм.
**0.00** «Уголас». Пра рэп і не толькі...
**2.25** «Алтайскія кержакі». Дак. фільм [СЦ].

## Настальгія

**6.00** «Эліта Краіны Саветаў». Яўген Сцяблоў (12+).
**6.45, 8.40, 9.45, 11.00, 12.55, 15.45, 17.00, 18.50, 20.20, 21.45, 23.00, 0.55, 2.15, 5.45** Музычная настальгія (12+).
**7.10** «Вакол смеху». 1980 год (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** Маст. фільм «Пацалунак» (16+).
**12.00** «СевАлогія». «Міцькі» (18+).
**13.30** Маст. фільм «Не было б шчасця...» (16+)
**14.35** Канцэрт «Спявае ВІА «Синяя птица» (12+).
**16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Быў час». «Іншае жыццё: МПЗ» (16+).
**19.10** Тэлеспектакль «Альманах сатыры і гумару» (16+).
**0.15** «Да і пасля...» Год 1977-ы (16+).
**1.10** Фільм-канцэрт «Маскоўскі тэатр Сатыры на экране» (12+).
**3.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**4.00** Фільм-спектакль «Сваякі» (16+).

## EuroSport 1

**2.05** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету (12+).
**3.30, 12.30** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**4.30** Ралі. ERC (12+).
**5.00, 10.30, 15.00** Снукер. Scottish Open (6+).
**7.30** Біятлон. Кубак свету (6+).

## Кінакамедыя

**0.45** Ананасавы экспрэс: сяджу, палю (18+).
**2.55** Да чорта на рогі (16+).
**4.35** Зялёная кніга (16+).
**7.05** Басанож па горадзе (18+).
**8.45** Ні хвіліны спакою (12+).
**10.15** Чатыры пакоі (18+).
**12.10** Ты ўмееш захоўваць сакрэты? (16+)
**14.00** Дачка майго боса (12+).



**15.40** Сакавіцкія каты (16+).
**17.30** Таткі без школьных звычак (16+).
**19.30** Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі (12+).
**21.25** Аперацыя «Тушонка» (16+).
**23.25** Колькі ў цябе? (16+)



## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.30, 23.40** «Улегцы» (12+).
**9.05, 15.30, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**10.10, 17.15** «Стараць» (16+).
**10.50, 18.25, 2.55** «Сляпая» (16+).

**12.00, 19.35** «Варажбітка» (16+).
**13.10** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.15** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.35** «Знакі лёсу» (16+).
**20.50** «Косці». Серыял (16+).
**22.40** «Грым». Серыял (16+).
**0.15** «90-я» (16+).
**1.05** «28 дзён пасля». Маст. фільм (16+).
**3.50** «Мужчыны...» (16+).

## ТБ1000

**5.00** Прыгоды Падынгтана (6+).
**6.50** Прыгоды Падынгтана-2 (6+).
**8.45** Яна (16+).
**10.55** Я, Франкенштэйн (16+).



**12.25** Дарагі Джон (16+).
**14.20** Тры метры над узроўнем неба (16+).
**16.35** Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу (16+).
**19.00** Кліент (16+).
**21.10** Адночы ў Амерыцы (16+).
**1.15** Вялікая гульня (18+).
**3.25** КІН (18+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Пацалунак скрозь сцяну (16+).
**8.15** Галасы вялікай краіны (6+).
**10.05** Без межаў (12+).
**11.45** Дар (16+).
**13.30, 19.00** Апостал (16+).
**15.35** Як я стаў рускім (16+).
**17.20** Глухар у кіно (16+).
**21.00** Гудбай, Амерыка (12+).
**23.00** Начная змена (18+).
**0.40** Цвярозы кіроўца (16+).
**2.15** ПіраМММіда (16+).
**3.55** Грэцкі арэшак (16+).

## National Geographic

**6.00, 5.40** Навуковыя глупствы (16+).
**6.25, 13.25, 22.40, 1.10** Аўта-SOS (16+).
**7.15, 17.35** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**8.10, 21.00, 3.25** Ледзяная дарога (16+).
**9.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
**9.55** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**10.45. 20.05** Фабрыка ежы (16+).
**11.35** Дзікі тунец (16+).
**12.30, 16.45** Асушыць акіян (16+).
**14.15, 2.40** Інстынкт выжывання (16+).
**15.00, 0.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**15.55** Мяжа (16+).
**18.30** Крывавыя таямніцы Еўропы (16+).
**19.15** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**21.50** Выпрабаванне пустыні (16+).
**23.30** Ліхтугі за мяжой (16+).
**4.10** Служба выратавання Аляскі (16+).
**4.55** Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).

## Discovery

**8.00** Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).
**8.45, 18.03, 23.09** Багажныя войны (12+).
**9.35, 17.12, 22.18** Круты цюнінг (12+).
**10.25, 20.36, 5.42** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**11.15, 15.30, 21.27, 4.56** Як гэта ўладкавана? (12+)
**12.06, 13.48, 19.45, 0.00, 4.10, 7.14** Махінатары (12+).
**12.57** Забытая інжынерыя (12+).
**14.39, 6.28** Жаночая аўтамайстэрня (12+).
**16.21, 1.42** Музейныя загадкі (12+).
**18.54** Чыгунка Аўстраліі (16+).
**0.00** SpaceX запуск Crew-1 (12+).
**2.33** Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
**3.24** Гіганцкія будоўлі (12+).

# УРОКІ АД СТАРШАГА

## Што могуць зрабіць жыхары шматкватэрнага жылога дома самастойна, калі ў іх доме жыве ініцыятыўны актывіст

**Пяціпавярховік па вуліцы Савецкай, 12 у Кіраўску, што на Магілёўшчыне, лічы, узорны. Сюды можна вадзіць экскурсіі і расказваць, якія тут самаарганізаваныя людзі. Парадак, чысціня, усё дагледжана і функцыянуе. Па сакрэце, жыхары тут такія ж, як і ўсюды. Але жыве побач з імі Віктар КАЛЯСНЁЎ — старшы па доме. А ён ніколі не будзе цярпець бязладдзе. Вось жыхары і бяруць з яго прыклад.**



### Урок першы

— Усё адбылося гадоў 15 таму, — кажа ён. — Праводзіўся сход з удзелам прадстаўнікоў райвыканкама, райсавета і «Жылкамгаса». Вырашалася пытанне, хто ж будзе старшым па доме. Усе адмаўляліся — адзін працуе, другі заняты, трэці не можа. І тады я прапанаваў сваю кандыдатуру. Пры адной умове, каб мяне ўсе слухаліся. І людзі пагадзіліся. З таго часу мы разам шмат чаго зрабілі.

Дом вялікі — шэсць пад'ездаў, 60 кватэр, 170 жыхароў. І ўсе розныя, яшчэ трэба ведаць як да кожнага знайсці падыход. Але, як той казаў, «калі ўлез у дугу, не кажы «не магу». Вось і Віктар Рыгоравіч пачаў выбудоўваць свае партнёрскія адносіны з суседзямі. Кажа, што нікто яму не расказваў, як дзейнічаць, з чаго пачынаць — да ўсяго даходзіў сам, карыстаўся цвярозым розумам і гаспадарчым разлікам. І першай справай, за якую ўзяўся, была замена дзвярэй у пад'ездах і ўстаноўка дамафонаў. Пагутарыў з жыхарамі і пачаў збіраць грошы. Вядома, што знайшліся і такія, якія адмовіліся фінансаваць гэты праект. Маўляў, нам і так добра.

— Яны далучыліся потым, пасля таго, як мы паставілі дзверы, — усміхаецца суразмоўнік. — Працвержанне наступіла пасля таго, як зразумелі, што да іх цяпер не могуць ні знаёмыя трапіць, ні ўрач з хуткай дапамогі. Паслуга, праўда, абышлася ім крыху даражэй. Адна справа рабіць разам і зусім іншая паасобку. Першы ўрок, лічы, прайшоў на выдатна. Людзі разабраліся што да чаго і сталі болей уважліва ставіцца да прапаноў старшага па доме.

### Урок другі

Першы памочнік Віктара Рыгоравіча ў грамадскіх справах яго жонка — Валянціна Уладзіміраўна. Вось і зараз яна далучылася да нас, каб асабіста пацвердзіць, што работа вядзецца не фармальная. Сёння вакол кожнага пад'езда дагледжана і прыгожа — кветнікі да позняй восені вока радавалі. А раней, кажуць, адно пустазелле расло.

— Мая жонка першая выйшла з рыдлёўкай і пачала саджаць кветкі, — кажа Віктар Калясноў. — Некаторыя нават спачатку абураліся: навошта, усё роўна затопчуць. А яна адзін кветнік зрабіла, другі, а трэці ўжо старала з суседкамі, якія прыйшлі на дапамогу.

Калі стала прыгожа каля пад'ездаў, актывіст пайшоў у «Жылкамгас» прасіць сметніцы. Там паглядзелі, што дом сапраўды змагаецца за парадак, і пайшлі насустрач. Затым няўрымслівы старшы па доме дабіўся, каб адрамантавалі вадасцёкі. Яны наогул былі ў вельмі занядбаным стане. А вось за стаянку для аўто прыйшлося пазмагацца. Раней каля дома была толькі вузенькая стужачка асфальту. Калі хтосьці пакіне сваё аўто пад вокнамі, ніхто больш пад'ехаць не можа. Каляснёў і ў райвыканкам хадзіў, і з жыхарамі размаўляў, каб нешта тапраўіць, але нічога не атрымлівалася. Чалавек дзесяць з дома «за», астатнія — «супраць». У кожнага свая адгаворка — то машыны няма, то ў гаражы ставіць. Летась, як той казаў, лёд скрануўся. Актыўнага прадстаўніка мясцовага самакіравання падтрымала старшыня райсавета Галіна Слабоднікава. Было вырашана, што жыхары збіраюць грошы на будматэрыялы, а дарожнікі будуюць дарогу бясплатна. Сказана — зроблена. Потым Каляснёў дамогся, каб перанеслі ліхтары. Дарога пашыралася, а слупы засталіся на тым жа месцы. Непарадак. Энергетыкі ж за так працаваць адмаўляліся, толькі за грошы. І тады старшы па доме зноў рушыў у райсавет дэпутатаў. Там дапамаглі вырашыць пытанне бясплатна. Засталося зрабіць толькі дзіцячую пляцоўку. Хутка з'явілася і яна. Арэлі і горку ўстанавіла за свой кошт мясцовае ДЭУ.

### Урок трэці

Для старшага па доме не павінна быць дробязяў. Калі ўнікаеш у праблемы суседзяў, яны хутка становяцца ўласнымі.

— Паглядзіце, як у нас стала культурна, — дэманструе Віктар Рыгоравіч адзін з пад'ездаў. — Тут усё было чорнае, абшарпанае, абмаляванае. Мы купілі фарбу, і сцены набылі прыемны для вока бэзавы колер.

У пад'ездах фіранкі на вокнах, жывыя кветкі ў гаршочках, нідзе няма стыхійных попельніц. Старшы па доме паклапаціўся, каб у агульных месцах пражывання наогул не курылі. На вуліцы таксама ўсё па-гаспадарску. Прыступкі высокія, і Віктар Рыгоравіч паклапаціўся, каб для зручнасці і бяспекі зрабілі парэнчы. У адным з пад'ездаў жыве дзяўчына-інвалід, там парэнчы манціравалі з улікам таго, каб ёй было зручней карыстацца. Тры гады таму па ініцыятыве Віктара Рыгоравіча памянялі вокны. Некалькі жыхароў адмовіліся, і зараз іх пачарнелыя рамы выглядаюць на фоне астатніх асабліва недарэчна і неахайна. Напэўна, зараз шкадуюць, што сэканомілі.

— Пытанняў узнікае шмат, пачынаючы ад няспраўнага водаправода і заканчваючы смеццем, якое выкінулі не туды, — кажа суразмоўнік. — Падказваю, куды звярнуцца, або сам звяртаюся куды трэба. Нешта магу і адрамантаваць, я ж па прафесіі сантэхнік шостага разраду. Але ёсць праблемы з ліку невырашальных. У доме стаяць газавыя калонкі, і ў кватэрах на апошнім пятым паверсе па вечарах з паловы шостай да паловы восьмай няма гарачай вады. Нам тлумачаць, што так спраектаваны дом і нічым дапамагчы не могуць. Жыльцы ставяцца да гэтага з разуменнем, але ёсць адзін чалавек, якога такі парадак не задавальняе. І я тут нічым дапамагчы не магу. Іншая справа, калі даюць ацяпленне і сцяжк не грэе. Тут я выклікаю спецыялістаў і не адпускаю іх да таго часу, пакуль яны ўсё як трэба не зробяць.

Яднаюць жыхароў не толькі агульныя праблемы, але і добрасуседскія традыцыі. Напрыклад, калі ў кагосьці вяселле, усе скідваюцца на падарунак, а віноўнік урачыстасці арганізуе стол. У бядзе таксама разам. Дапамагчы ў цяжкай сітуацыі чалавеку — святая справа.

### Працуем за ідэю, і прыемна, калі за гэта заахвочваюць

Сёлета па выніках штогадовага спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання старшы па доме Віктар Каляснёў атрымаў дыплом за трэцяе месца і аднаразовую грашовую ўзнагароду ў памеры 30 базавых велічынь. Падтрымка аказалася важкая. Частку грошай ён патраціў на падарункі актывістам. «Такіх у нас каля дзесяці. Гэта наш касцяк, асноўныя мае памочнікі», — кажа пра іх мужчына. Яшчэ частка грошай пайшла на фарбы і энергазберагальныя лямпачкі для пад'езда і вулічных ліхтароў.

— Дапамога была нечаканая і таму вельмі прыемная, — кажа Каляснёў. — Камусьці, магчыма, здаецца, што наша роля не такая і значная, але гэта толькі на першы погляд. Ведаю, што некаторыя значацца на гэтай грамадскай пасадзе намінальна, але не ўсе. Ёсць людзі, якія самааддана працуюць, і мне заўсёды вельмі цікава з імі пагутарыць, нешта ўзяць на заметку. На жаль, мала хто па сваім жаданні пагаджаецца пакаштаваць гэтага хлеба.

На думку Віктара Каляснёва, каб мясцовае самакіраванне ўзнялося на новы якасны ўзровень, трэба, каб дэпутаты жылі ў тых акругах, адкуль яны вылучаюцца. «У маім доме чатыры дэпутаты, а такога, да якога я мог бы звярнуцца, няма», — аргументуе ён. А што датычыцца платы за грамадскую дзейнасць, то яна, лічыць актывіст, не патрэбна. Чалавек павінен працаваць за ідэю. Калі ўжо і выдзяляць нейкія грошы, то лепш мэтанакіравана на нейкія канкрэтныя справы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

**Галіна СЛАБОДНІКАВА, старшыня Кіраўскага райсавета дэпутатаў:**

— Кожны грамадзянін мусіць усведамляць сваю адказнасць за забеспячэнне камфортнага асяроддзя жыццядзейнасці і прымаць актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні, азеляненні дваровых тэрыторый, навядзенні парадку на індывідуальных дваровых тэрыторыях. Менавіта такіх пазіцый прытрымліваюцца самыя актыўныя прадстаўнікі органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання нашага горада. Яны дапамагаюць арганізаваць насельніцтва для ўдзелу ва ўсіх гэтых вельмі важных справах. Частковае фінансаванне з бюджэту плюс добраахвотны ўдзел жыхароў у фінансаванні дазваляюць выконваць значныя аб'ёмы работ па рамонце і абсталяванні дваровых тэрыторый і дзіцячых пляцовак. Стымулам, як і раней, з'яўляюцца агляды-конкурсы санітарнага стану і добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, населеных пунктаў, конкурсы «Усё найлепшае для малой Радзімы», «Найлепшае афармленне дваровай тэрыторыі шматкватэрнага жылога дома Кіраўска», спаборніцтвы сярод ОТГС.

Вялікую дапамогу Саветам дэпутатаў аказваюць старшыя па сваіх дамах Галіна Спірыдонава, Людміла Лукановіч, Наталля Мурашка і іншыя. Рэзультатыўна працуюць з насельніцтвам дэпутаты раённага Савета дэпутатаў Святлана Шчэрбіч, Таццяна Арцюхова, Алена Глекава, Святлана Сарока і іншыя.

# З клопатам пра ветэранаў працы

## Ветэранская арганізацыя Лышчыцкага сельсавета адна з самых вялікіх у Брэсцкім раёне

**Старшыня ветэранскай арганізацыі Лышчыцкага сельсавета Святлана В'ЮН са шкадаваннем адзначыла, што цяперашняя эпідэмічная сітуацыя прымусіла скарэктаваць планы работы арганізацыі. У іншыя гады ў гэтую пару праходзіла нямала цікавых сустрэч, змястоўных мерапрыемстваў на базе бібліятэкі, Дома культуры, іншых устаноў. Але ж усе спадзяюцца, што ўвесну становішча выправіцца, і атрымаецца навярстаць многае з упушчанага.**

Гэтая арганізацыя налічвае каля 700 чалавек. Касцяк яе, паводле слоў Святланы Цімафееўны, складаюць ветэраны вытворчасці ААТ «Астрамечава». Ёсць у арганізацыі таксама пенсіянеры сацыяльнай сферы, былыя чыгуначнікі, будаўнікі, — адным словам, людзі самых розных прафесій. Многіх падтрымліваюць установы і арганізацыі, дзе яны раней працавалі. Ёсць у гэтым ліку катэгорыя людзей, якія асабліва маюць патрэбу ў клопаце і падтрымцы, гэта адзінокія грамадзяне і тыя, хто пражывае адзінока. Клопат пра іх бярэ на сябе мясцовая ўлада, падтрымка ідзе па лініі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны, ім па меры неабходнасці аказваюць матэрыяльную дапамогу.

— Раней вясковыя пенсіянеры мелі патрэбу ў забеспячэнні дровамі, брыкетам, нават сена для каровы часам прасілі дапамагчы нарыхтаваць, — разважае Святлана Цімафееўна. — Цяпер сітуацыя кардынальна змянілася. Большасць нашых вёсак газіфікаваныя, цяпло ёсць у доме, пажылыя людзі амаль не трымаюць дапаможную гаспадарку. Цяпер многім сталым людзям патрэбныя маральная падтрымка, магчымасць з карысцю бавіць вольны час, адчуваць запатрабаванасць у грамадстве. Для гэтага і працуе наша арганізацыя з іншымі ўстановамі і арганізацыямі, якія размешчаны на тэрыторыі сельскага Савета.

Вядома, найбольшую падтрымку ад сваёй гаспадаркі адчуваюць былыя працаўнікі ААТ «Астрамечава». Летась падчас святкавання 70-гадовага юбілею сельгаспрадпрыемства многіх ветэранаў ушаноўвалі нароўні з цяперашнімі работнікамі. Перад урачыстым мерапрыемствам для ветэранаў вытворчасці была праведзеная экскурсія па новых аб'ектах гаспадаркі. Дарэчы, падобныя экскурсіі сталі добрай традыцыяй. Такім чынам цяперашнія работнікі трымаюць своеасаблівую справаздачу перад папярэднікамі, як падтрымліваюць і развіваюць створаную імі вытворчасць.

**Намеснік дырэктара ААТ «Астрамечава» Жанна ГАРУСТОВІЧ** адзначыла, што работа з ветэранамі гаспадаркі, іх падтрымка заўсёды былі адным з важных складнікаў сацыяльнай палітыкі прадпрыемства. Напрыклад, пенсіянерам, якія за сваю працу адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі, выплачваецца штомесяц — дзве базавыя велічыні ўладальнікам ордэна і адна базавая велічыня ўзнагароджаным медалём. Ёсць цэлы шэраг матэрыяльных заахвочванняў да свят, памятных дат, якія прапісаны ў калектыўным дагаворы. Напрыклад, ветэранаў адзначаюць да Дня пажылых людзей, на прафесійнае свята, і да іншых значных дат. У сувязі з хваробай, цяжкім матэрыяльным становішчам заявы разглядаюцца індывідуальна.

Жанна Гарустовіч адзначае, што для людзей важныя не толькі пэўныя выплаты, але і знакі ўвагі. Кожны ветэран вытворчасці абавязкова атрымае паштоўку на дзень нараджэння альбо віншаванне з прафесійным святам. Гэта азначае, што чалавека не забываюць, памятаюць яго заслугі ў развіцці вытворчасці, цэняць прафесійны вопыт.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**

*Брэсцкі раён.*

ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ

# Маладое дрэва — новая справа

**ЯБЛЫНЕВЫ сад на 300 саджанцаў заклалі ў Брагінскім раёне, што на Гомельшчыне. Гэта сумесны праект па добраўпарадкаванні тэрыторыі, які ажыццявілі супрацоўнікі адкрытага акцыянернага таварыства «Мілкавіта», калектыў сельгаспрадпрыемства «Брагінка» і раённыя ўлады.**



Месцам закладкі пладовага саду была абрана тэрыторыя новага малочнатаварнага комплексу «Касачоў», які ўваходзіць у структуру ААТ «Брагінка». Комплекс пабудаваны ў 2019 годзе па праграме пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Ён разлічаны на ўтрыманне 1,5 тысячы галоў буйной рагатай жывёлы. Поўнае фарміраванне комплексу малочным пагалоўем і выхад на праектную магутнасць плануюць завяршыць да канца года. Тут будзе адкрыта 43 рабочыя месцы. Добраўпарадкаванне тэрыторыі новага малочнатаварнага комплексу — таксама вельмі важны этап стварэння камфортнага асяроддзя для працаўнікоў гаспадаркі.

Саджанцы для саду — а гэта 300 яблынь — набыло адкрытае акцыянернае таварыства «Мілкавіта». Гэта прадпрыемства Гомельшчыны — адна з найбуйнейшых малочных кампаній у краіне. У сваю чаргу сельгаспрадпрыемства «Брагінка» — вядучы пастаўшчык малочнай сыравіны для прадпрыемства-перапрацоўшчыка. Больш за 80 % малака ААТ «Брагінка» пастаўляе на перапрацоўку гатункам экстра.

Як адзначылі ў сельгаспрадпрыемстве, летась работнікі гаспадаркі пасадзілі на прылеглай тэрыторыі новага малочнатаварнага комплексу «Касачоў» 250 яблынь. Ініцыятыву па добраўпарадкаванні сельскай мясцовасці падтрымала прадпрыемства «Мілкавіта».

Гэтая акцыя, па словах **дырэктара ААТ «Брагінка» Тамары КУДАН,** мае сімвалічнае значэнне. Новыя сады — сімвал міру і працвітання, пераемнасці пакаленняў, саюза маладосці і мудрасці.

— Мы разам будуем шчаслівую будучыню роднай Беларусі, разам з усёй краінай выступаем за мір і дабрабыт, за магчымасць спакойна працаваць і глядзець з аптымізмам у заўтрашні дзень, — адзначыла кіраўнік гаспадаркі. — Наш сад таму пацвярджэнне.

Між тым удзел у закладцы новага саду ў Брагінскім раёне прынялі генеральны дырэктар «Мілкавіты» Віталь Нікулін і супрацоўнікі адкрытага акцыянернага таварыства, старшыня раённага выканаўчага камітэта Аляксандр Кохан і начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Сяргей Даўгулявец.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

ІНІЦЫЯТЫВА З МЕСЦАЎ

# «АДПАЧЫНАК У КНЯЗЕВЕ», «ЭКАСМАРТЛЭНД» І «ГРАМАДСКАЯ ПРАСТОРА «СЕРАФІМОВА»

## Прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці азнаёмілі са сваімі праектамі

**ЦЯЖКА пераацаніць значэнне ініцыятыў грамадзян у вырашэнні пытанняў мясцовага значэння. Менавіта іх намаганнямі з кожным годам становіцца больш прыгожай, утульнай, камфортнай малая радзіма, павышаецца якасць жыцця і адпачынку мясцовых жыхароў. На іх рахунку — уладкаванне закінутых тэрыторый, сквераў, паркаў, стадыёнаў, стварэнне безбар'ернага асяроддзя для інвалідаў-калясачнікаў, месцаў адпачынку і заняткаў спортам для людзей розных узростаў і катэгорый — усяго не пералічыш. Менавіта аб сваіх дасягненнях расказалі прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці ўсіх абласцей Беларусі падчас выніковай канферэнцыі.**

### Другое дыханне старога парку

**Старшыня Крамяніцкага сельскага Савета дэпутатаў Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці Аляксандр ДЗЕРАЧЭНІК** прэзентаваў праект «Адпачынак у Князеве». У аграгарадку з аднайменнай назвай знаходзіцца стары парк, які вядзе сваю гісторыю з канца XIX стагоддзя. Яго заснавальнікі — знакаміты род князёў Журавых. Гэта ўнікальны парк, дзе растуць рэдкія рэліктавыя дрэвы. У савецкія часы ён быў месцам культурнага жыцця. На шматлікія мерапрыемствы збіралася мноства людзей розных узростаў. Кіраўнік праекта прызнаўся, што мару вярнуць былую славу гэтаму ўнікальнаму прыродна-гістарычнаму кутку выношваў даўно. Але, каб ажыццявіць яе, неабходны былі фінансавыя рэсурсы. Падказку падкінула жыццё. Старшыня падаў заяўку на конкурс сацыяльных праектаў «TANDEM», арганізаваны асветніцкім грамадскім аб'яднаннем «Фонд імя Льва Сапегі» і выйграў грант.

Уладкоўвалі аб'ект сумеснымі намаганнямі: моладзь, мясцовыя жыхары, валанцёры, супрацоўнікі раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці. Сельскагаспадарчае прадпрыемства «Князева» выступіла суінвестарам праекта, выдзяляла тэхніку для розных работ.

Канешне, прыйшлося нялёгка, каб удыхнуць у гэты ўнікальны парк другое дыханне. Але, як кажуць, вочы баяцца, а рукі робяць. І цяпер зялёны масіў не пазнаць. Тэрыторыю ачысцілі ад звалак, смецця, прыбралі прыбярэжную зону возера, зрабілі пірс. Для водных прагулак закупілены лодкі, катамараны. У парку з'явілася сучасная зона адпачынку з дзіцячай, спартыўнай, танцавальнай пляцоўкамі, альтанкі, лаўкі, мангал для прыгатавання шашлыку, пракладзены дарожкі. Як прызнаўся Аляксандр Дзерачэнік, давялося спілаваць мінімальную колькасць дрэў у парку, але ўся драўніна пайшла ў справу. Больш за тое, спатрэбіліся і валуны, якія размалявалі студэнты. Вулічныя сведкі гісторыі толькі ўпрыгожылі тэрыторыю.

Абноўлены парк здадзены ў верасні. І менавіта ва ўсёй сваёй велічы ён сустракаў раённыя «Дажынкі», якія сабралі шмат гасцей.

Аляксандр Дзерачэнік кажа, што зацікаўлены ў далейшым развіцці тэрыторыі. Яго падтрымліваюць і землякі. Ён спадзяецца, што для гэтага знойдуцца інвестары.

### Спартыўны комплекс для ўсіх

Па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле групы грамадзянскіх актывістаў, настаўнікаў створаны культурна-спартыўны комплекс «ЭкаСмартЛэнд», — расказала **спецыяліст аддзела па адукацыі Віцебскага райвыканкама, прадстаўнік грамадскага аб'яднання садзейнічання сацыяльна-эканамічнаму развіццю Віцебскага раёна «Прыдзвінскі край» Вольга ЧЭРАПАВА.** Комплекс узнік на стадыёне Даўжанскай школы, але займацца, тут могуць, як вучні, так і ўсе ахвотныя. Разлічаны ён на розныя спартыўныя густы і схільнасці наведвальнікаў. Збудаванне ўключае наступныя сектары: спартыўных вулічных трэнажораў, для правядзення святочных мерапрыемстваў са сцэнай, для настольных гульняў, дзіцячую пляцоўку.

З'яўленне аб'екта такога тыпу стала магчыма дзякуючы перамозе ў конкурсе мясцовых ініцыятыў і атрыманаму гранту.

### У вёсцы стала прасторней

Непадалёк ад Мінска на тэрыторыі Міханавіцкага сельсавета знаходзіцца населены пункт Серафімова. У савецкія часы гэта была звычайная вёска. Затым на ўскрайку вырас пасёлак катэджнага тыпу для трактаразаводцаў. Тут былі праведзены газ, электрычнасць, водаправод, цэнтральную вуліцу заасфальтавалі, пачалі вырашаць пытанне з каналізацыяй. Але развал Савецкага Саюза перапыніў планы. Інфраструктура з цягам часу рабілася непрыгоднай. Больш за тое, тут не было ніводнага месца, дзе можна пагуляць з дзецьмі, сабрацца разам мясцовым жыхарам. Аляксей Галубовіч і яго жонка задумаліся над тым, як зрабіць Серафімова лепшым і паказаць прыклад тым беларусам, якія мараць, каб іх радзіма была прыгожай і ўтульнай. А пачалося ўсё з таго, што Аліна стала пераможніцай дабрачыннага конкурсу «Актывія 2.0» у намінацыі «Урбаністыка» і атрымала 5,5 тысячы рублёў. Іх вырашылі ўкласці ў развіццё грамадскай прасторы на двух закінутых пажарных вадаёмах, якія ператварыліся ў звалку. Каб прывесці тэрыторыю ў прыстойны выгляд, давялося чысціць вадаёмы ад ілу, выразаць на берагах зараснікі, хмызнякі, праводзіць добраўпарадкаванне, падрыхтаваць і выраўнаваць участак. Для чаго спатрэбілася не адна машына зямлі. Затым тут уладкавалі дзіцячую пляцоўку з гульнявымі прыстасаваннямі, паставілі лаўкі, зрабілі рознаўзроўневыя ляжанкі, дзе можна пабегаць дзецям і адпачыць дарослым.

Да распрацоўкі праекта сямейная пара прыцягнула маладых архітэктараў. Але ажыццявіць усе іх задумы не ўдалося, у працэсе рэалізацыі планы карэктавалі з прычыны недахопу сродкаў. Дарэчы, грошы Аляксей збіраў і шляхам краўдфандынгу. І яго здзівіла, што адгукнуліся нават незнаёмыя людзі, якія не маюць адносін да гэтых мясцін.

На адкрыццё аб'екта сабралася шмат бацькоў з дзецьмі. Мясцовыя жанчыны частавалі ўсіх дамашняй выпечкай ды рознымі ласункамі.

Праект працягваецца, у Аляксея Галубовіча шмат задум, на ажыццяўленне якіх патрэбны грошы. Зрэшты, пра гэта казалі і іншыя ўдзельнікі канферэнцыі. На іх думку ў фінансаванні грамадзянскіх ініцыятыў павінны прымаць удзел больш зацікаўленых дзяржаўных інстытуцый. Для чаго павінен быць прыняты адпаведны закон.

### Платформа для зносін з уладай

— Прававое рэгуляванне формаў удзелу грамадзян у працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні ў Беларусі у многім не адпавядае сучасным рэаліям і патрабаванням, паколькі большасць прававых нормаў была падрыхтавана і ўкаранёна ў 1991—1995 гадах. Неабходны іх карпатлівы аналіз і абнаўленне, накіраваныя на дэбюракратызацыю, павышэнне эфектыўнасці, актывізацыю і матывацыю грамадзян для ўдзелу ў працэсе вырашэння праблем на мясцовым узроўні, — лічыць **старшыня праўлення асветніцкага грамадскага аб'яднання «Фонд імя Льва Сапегі» Міраслаў КОБАСА.**

На яго думку, адсутнасць механізмаў фінансавання грамадзянскіх ініцыятыў за кошт бюджэтных сродкаў стрымлівае актыўны ўдзел насельніцтва ў вырашэнні мясцовых праблем. Для стымулявання іх актыўнасці і ўстойлівага развіцця грамадзянскай супольнасці неабходна адпаведная дзяржаўная палітыка і падтрымка. Першымі крокамі ў гэтым кірунку маглі б быць заканадаўчыя інавацыі, накіраваныя на ўдасканаленне і лібералізацыю рэгулявання дзейнасці грамадзянскіх аб'яднанняў. У прыватнасці, укараненне ў практыку Бюджэтаў грамадзянскага удзелу, як аднаго з механізмаў падтрымкі грамадзянскіх ініцыятыў.

— Па вялікім рахунку размова ідзе не аб тым, як патраціць частку мясцовага бюджэту. У першую чаргу гэта размова аб стварэнні платформы для зносін грамадзян з уладай і паміж сабой, якая дасць магчымасць больш абмяркоўваць развіццё сваёй вуліцы, мікрараёна, горада, знаходзіць узаемаразуменне, браць адказнасць за якасць свайго жыцця, — падсумаваў суразмоўнік.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 3 снежня 2020 года.




## ХТО Ў КАЛГАСЕ НЕ ЗЛОДЗЕЙ...

Рознага насення цяпер — хоць вазамі вазі! Толькі сей ды садзі, калі час надыдзе і жаданне ёсць. А то ж многія ў гэтым сэнсу не бачаць: навошта, маўляў, гарбаціцца, калі ўсё прадаецца. Купіў нейкую баначку-пластыначку, кіпнем заліў — і пюрэ гатовае. Не трэба з вясны да восені зямельцы кланяцца — бульбу вырошчваць, а спачатку, як вядома, — насенне выбіраць.

...У продажы цяпер шмат новых сартоў з'явілася. Праўда, у большасці і як мне здаецца, нейкіх «аднаразовых»: завёў, год-другі пасадзіў — усё пры іх, як быццам. А потым — куды што дзелася: і смак ужо іншы, і ўраджай не той. Тут, я думаю, адно тлумачэнне: людзі грошы робяць, свайго роду бізнес на насенні, а добрую справу, як прызнаў Задорнаў, гэтым словам не назавуць. Вось некалі раней новыя сарты (той жа бульбы) гадоў з дзесяць выводзілі! Але ж потым іх і садзілі, пакуль не збрыдзее: у многіх любімая бульба з часоў «камунізму» расце.

...Нехта можа спытаць, як жа яе заводзілі? То я раскажу. Спачатку нейкія навінкі ў калгасах-саўгасах з'яўляліся, — на людскія гароды пазней пераходзілі... Сваім ходам: гэта значыць, з работы, з агульнага поля чалавек прынёс і на сваім пасадзіў.

Начальства — у прыватнасці, у асобе нашага брыгадзіра — на гэты пераход глядзела паблажліва, можна сказаць, з разуменнем. Ну, набралі жанкі пакрысе... Дык як жа тут усрымаешся? Хто ў калгасе не злодзей, той дома — не гаспадар...

Праўда, у той дзень ён нейкі злосны быў, да ўсіх чапляўся... «Мусіць, галава ў жонкі балела?!» — пасмяяліся жанчыны і далей працуюць, бульбу перабіраюць на буйную, насенку і дробную.

Адпрацавалі да вечара, набралі па трохі ў адмысловыя торбачкі ды пайшлі па дамах. Адна хіба затрымалася, каб болей бульбачкі ўзяць.

І ўжо ж выбрала! А толькі разагнулася — з-за кустоў, як чорт з табакеркі, брыгадзір на сваім трактарку. Заглушыў яго ля жанчыны ды кажа:

— Ну зусім ты, Наталля, сумленне страціла!

Тая хацела спытаць: як гэта — усе бяруць і ва ўсіх яно ёсць, а ў яе дык раптам няма?!

Але ж змаўчала — панесла бульбу дахаты, а то, напэўна ж, высыпаць прыйшлося б...

Нараніцу зноў на работу ідзе, нікому нічога не кажа — разам з усімі працуе. Брыгадзір яшчэ прыехаў і праверыў. А захацеў ад'язджаць, — трактарок не заводзіцца — нават не чмыхае!..

Наталля, як на ліха, найбліжэй да яго сядзела, — паклікаў нешта там патрымаць, сам — па інструмент палез. Нішу пад сядзеннем адкрыў, каб каробку ўзяць, а там (Наталля добра ўбачыла) мех бульбы ляжыць...

Што дзіўна было, трактарок адразу ж завёўся, і брыгадзір адразу ж ад'ехаў... Так што не паспела Наталля пра сумленне спытаць. А потым падумала, што, можа, яно і не трэба было. Брыгадзір жа таксама чалавек, і гаспадар, прычым вельмі нядрэнны...

А добрай бульбы завесці нават дрэннаму хочацца!

Насенне яе калісьці так здабывалі: па-свойму весела, па-свойму сумна.

**Вольга Сарокіна,**
*Жлобінскі раён.*

## ДУМАЙ, ГАЛАВА!

Цяжка жыць таму, хто жартаў не разумее.

Ды і тым, хто побач — таксама не мёд.

...У далёкія ўжо 60-я ў нашай раённай міліцыі старшына адзін быў, у мінулым — ваенны разведчык і служака, якіх пашукаць. Людзі яго, як агню баяліся — за любое парушэнне ў аддзел цягнуў. Бывала, рады не дасць, каб нейкага п'янога прывесці, дык тады на плечы яго і валачэ — як тога языка нямецкага... А на месцы, глядзіш, ужо пратакол напісаны, справа заведзена — суд з прысудам, што важна, — дзе трэба, а дзе, можа, і не... Ну вось найпрасцейшы прыклад: насварылася жонка на мужа (альбо наадварот). І ў тую ж ноч ці назаўтра хутчэй за ўсё памірыліся б... Ды ў міліцыі ўжо заява ляжыць. Старшына пастараўся.

Карацей, стамілася начальства ад вось гэтай руплівасці, — хацела яго на пенсію адправіць — рыбу лавіць. Ды не тут тое было: нейкімі сваімі таемнымі сцежкамі ён да генерала дайшоў... І з перамогай назад вярнуўся! Яшчэ і прыгразіў: маўляў, пабачым, хто каго на рыбу адправіць...

Зрэшты, вось тут і зараз — трохі не аб тым.

Поруч з тым старшыной сяржант Ягорай служыў — рэдкі хахмач і балабол! У яго часцяком не разабраць было, дзе ён праўду кажа, а дзе жартуе. Але ж людзі слухалі, бо ён складна баяў... Ды і разумныя высновы, бывала, рабіў.

Аднойчы, напрыклад, стаў расказваць, што нейчы там брат з цаліны вярнуўся, што камбайнерам быў, што з сабой паўвагона пшаніцы прывёз і цяпер не знае, дзе яе дзець...

Старшыны, як быццам, паблізу не было? А здалёк — можа, сам чаго недачуў, можа, не так данеслі, толькі пасля дзяжурства падыходзіць ён да сяржанта і кажа:

— А давай мяняцца...

— ?!

— Я табе мех бульбы, а ты мне — пшаніцы?

Сяржант, нічога не зразумеўшы, толькі хмыкнуў яму ў адказ. А старшына падумаў, што ён згадзіўся... І таму не пазней як назаўтра (з жонкай раіцца ён моды не меў) сам палез у склеп, набраў там аж пяць мяшкоў бульбы (яна ж, калі з зімы застанецца, дык летам прападзе, а пшаніца — тая колькі хочаш ляжыць!)...

Ну і далей — ускінуў мяшкі на воз ды паехаў мяняцца.

А сяржант якраз на вуліцы быў — здалёк яшчэ воз убачыў. Сказаў старшыне: «Ну зусім ты людзей не ведаеш! Адкуль у мяне якая пшаніца? У мяне ж нават брата няма... Я ў дзетдоме вырас...»

Плюнуў старшына, маціокнуўся і (што тут будзеш рабіць?) паехаў назад.

Пакуль сноўдаў туды, а потым сюды (на вуліцы добры марозік быў), яго бульба ў мяшках памерзла. Жонка з раніцы ў печ яе, каб свінням зварыць, — а з гаршкоў толькі пена ўверх і смурод на ўсю хату...

Ну, яна і не стрымалася: нейкай чапялой адхадзіла свайго мяняглу. Той на работу з фінгалам прыйшоў.

Некага з іншых мужчын у такім выпадку паслужыўцы дасталі б жартамі, а тут папыталіся, ці будзе ён на жонку заяву пісаць, ці сціхлі. Хай чалавек падумае.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

## НАЧАЛЬСТВА — ЯНО ДАСТАНЕ

...У рабоце камбінатаў бытавога абслугоўвання (далей — КБА), відаць, розныя часы бывалі. Пасля перабудовы — дакладна — не найлепшыя. Хутчэй наадварот і па многіх прычынах. Але ж галоўная, мусіць, тая, што ў камбінатаў з'явіліся канкурэнты з боку прадпрымальнікаў. Менавіта яны сталі ствараць фірмы, вырабляць прыгажэйшыя і, вядома ж, больш дыхтоўныя помнікі з граніту і мармуру, гандляваць рытуальнымі таварамі...

У бытавікоў такім чынам заказаў стала менш, а значыць, менш прыбыткаў, менш сродкаў на зарплату. Людзі панеслі заявы на звальненне, хоць, вядома ж, не ўсе. Саша, напрыклад, па-ранейшаму працаваў — выпрабляў помнікі з цэменту з дабаўленнем мармуровай крошкі, потым, калі заказчыкі прасілі, выязджаў на месцы, на могілкі — дапамагаў устанавіць... Затое адно і абгародку... Не без таго — часта выпіваў, бо грэх было не памянуць нябожчыкаў...

Аднак у тым, што цвярозым яго амаль ніхто не бачыў, была яшчэ адна важкая прычына: Санёк — невысокі і шчупленькі — болей піў, чым еў. Так жонка яго казала. А начальства...

Начальства неяк цярпела, бо калі іншага спецыяліста на такую зарплату не возьмеш, хай тады будзе гэтакі...

Хоць кліентаў, трэба сказаць, ён і распуджваў...

Неяк, у будны дзень (як вядома, смерць ды радзіны не чакаюць рады) у той КБА прыехалі мужчыны з недалёкай вёскі — хацелі купіць дамавіну, сёе-тое з рытуальных тавараў.

Іх ды некалькі вянкоўкарзінак загадчыца склада аддала пакупнікам на месцы, па труну — павяла ў сталярны цэх.

Дзверы ў ім былі расчынены, унутры — аніводнай жывой душы: людзі пайшлі на абед. А дамавіна — тая ля сцяны стаяла — гатовая, абабітая чырвонай саржай.

Каб далёка не цягнуць, дзядзькі падагналі грузавік, паспрабавалі падняць труну.

— Цяжкая, халера! — заўважыў адзін.

— Дошкі сырыя, — прызнала загадчыца склада. — Не было сухіх.

«Значыць, трэба забіраць з сырых», — моўчкі вырашылі мужчыны. І толькі прыўзнялі, — з труны вечка з'ехала...

А за ім — грымнула на зямлю і сама труна, у якой... ляжаў (!), уставаў (!) жывы чалавек.

— Варвары! — казаў ён вяскоўцам, абтрасаючы пілавінне. — Па-іншаму што — пабудзіць не маглі? Вам гркнуць трэба?

Мужчыны ашалела маўчалі. Затое загадчыца склада...

— Сашка, п'янтос! — на ўвесь цэх крычала яна. — Каб цябе звіло ды скруціла! Знайшоў дзе схавацца, дзе легчы!..

— А што, — стаў даводзіць Санёк, — іншых жа мы кладзём? Кладзём. Яны ж неяк спяць і не скардзяцца... Значыць, добрае месца — я так падумаў... Аж выходзіць, не! Начальства — яно і тут дастане! Во часы пайшлі! У труне спакою няма!

— Дык гэта ж жывым, — суцешылі Сашу вяскоўцы, што хацелі забраць дамавіну. — А вось калі памрэш...

Што з ім будзе потым, калі тое здарыцца, не ведае, на жаль, ніхто.

**Ніна Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж:** «Апошнія лісткі ў календары, сыходзіць год самотны і стары...». Гэта значыць, што фінішуе звяздоўскі конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю.*

*Нагадаем, што яго пераможцаў мы вызначаем разам з чытачамі, то-бок кожны ахвотны можа далучыцца да работы вялікага чытацкага журы: з добрай сотні выбраць дзясятку — на яго погляд — самых цікавых гісторый і на пачатку новага 2021-га даслаць у рэдакцыю. Так што чытайце, пішыце!.. У тым ліку і аб тым, конкурсу быць? Ці не быць?*

Неасабісты суб'ектыў



# Па першым снезе

## Казкі хаця б аднойчы ў жыцці здараюцца

НАРЭШЦЕ. Пасыпаўся з неба — спачатку няўпэўненымі замерзлымі драбнюткімі кропелькамі, пасля, асмялеўшы, — пушыстымі белымі камячкамі. Прыбраў у белае мокрую зямлю, зялёную яшчэ траву, дрэвы і дахі. Ад яго неяк адразу пасвятлела — і на вуліцы, і на душы. Першаму снегу заўжды радуешся, нібы здараецца ён у жыцці ўпершыню. Не хочацца нават думаць, што заўтра-паслязаўтра прыйдзе наша заўсёднае ў апошнія зімы «каля нуля», і ўсё белае харастко знікне, ператварыўшыся ў шызы туман. Але пакуль да выхадных два дні, вільготныя сняжынкі лезуць пад шырокі капюшон проста ў твар, казычуць лоб, на некаторыя імгненняў павісаюць на веях, каб потым ператварыцца ў кроплі і сапсаваць макіяж. Нічога. Усё роўна. Таму што хораша. І амаль святочна. Бы ўпершыню. Адчуванне палёту і казкі. Хоць мімаходзь. Хоць на некалькі імгненняў.

А самая казачная казка, амаль сапраўдная, здарылася са мной гадоў мо дзесяць назад таксама ў самым пачатку снежня недзе паміж Гомелем і Бабруйскам. Звычайная службовая камандзіроўка ператварылася тады ў прыгоды з разраду «знарок не прыдумаеш». Цяпер, калі прайшоў час, я ўсё роўна, згадваючы тую гісторыю, не магу сама сабе адказаць на простае пытанне: што гэта было? Пасля, праўда, кажу сама сабе штосьці накшталт: жыццё цудоўнае — і супакойваюся. Да наступнага года — пакуль з неба белымі камячкамі не пасыпле першы снег.

МЕНАВІТА ён, першы снег — шыкоўны, пушысты, які павольна і ўпэўнена засыпаў гомельскія вуліцы, і збіў мяне ў той дзень з панталыку. Правёўшы ў мясцовым каледжы круглы стол па праблемах адукацыі, я ўжо збіралася ехаць на вакзал — у кішэні ляжаў білет на гродзенскі цягнік, які да поўначы прывёў бы мяне ў сталіцу. Але на вуліцы было такое незвычайнае харастко і так захацелася ўбачыць у гэтых цудоўных дэкарацыях палац Румянцавых-Паскевічаў, што замест вакзала я рушыла ў парк. Карацей, мой цягнік сышоў без мяне.

Давялося браць білет на маршрутку. Выехалі з горада ўжо ў цемры, і толькі тут стала заўважна, што павольны пушысты снегапад ператвараецца ў моцную мяцеліцу, якая бязлітасна хвошча наўскос у шыбы, заляпляе іх рыхлай шэрай кашай, перамятае дарогу. Пару разоў маршрутку заносіла на трасе юзам, а дзесьці пад Бабруйскам мы, як і астатнія нешматлікія машыны, увогуле сталі. Адносна ненадоўга — мо на гадзіну. Пасля прыехаў трактар з мігалкай, расчысціў дарогу, і ўсе паехалі далей. За выключэннем нас — пяці пасажыраў той злашчаснай маршруткі. Яна зламалася. На гадзінніку было ўжо гадзін дзевяць вечара, мяцеліца не сціхала, яшчэ і падмарожваць пачало, мы стаялі сярод чыстага поля. Кіроўца пачаў званіць начальству, мае нешматлікія спадарожнікі — сваякам (аказалася, усе, акрамя мяне, ехалі ў Бабруйск). Па іх крыху пазней прыехалі на машынах і забралі. Мы з кіроўцам засталіся чакаць ці то падменную маршрутку, ці то проста машыну, якая адвязе нас хоць куды-небудзь. Спачатку жартам, а пасля ўсё больш і больш усур'ёз, мы пачалі абмяркоўваць, як гэта нам пераначаваць і не змерзнуць. Хацелася есці, выпіць гарачага, залезці пад коўдру —- карацей, хацелася дадому!

ІРАПТАМ з узбочыны, ужо цалкам засыпанай снегам, пачулася сапенне, рыпенне, шпоканне — карацей, нешта вельмі падобнае на тое, што хтосьці едзе на запрэжаных санках. Падумалася: здалося, хто на ноч гледзячы ў такую непагадзь куды паедзе. Але ў святле нашых фар ужо маячыў і ладны чырвоны з чорнай грыўкай конік, і ўтульныя сані са спінкай, і постаць мужчыны ў шапцы і кажуху. «Што, змерзлі? — гукнуў нам здалёк. — Сядайце, паехалі!» Кіроўца маршруткі адмовіўся, а я (была-не была!) укулілася побач з дзядзькам у духмяное храбусткое на холадзе сена. Конік весела затупаў па неўтаптаным снезе, і толькі тады я падумала, куды і з кім я еду. Але ж не скакаць было з тых санак.

Ехалі мы чамусьці моўчкі і зусім нядоўга. Спыніліся на ўскраіне ці то нейкай маленькай вёсачкі, ці то зусім хутара, каля дыхтоўнага дома. У доме было цёпла і светла, але нікога не было, акрамя вялікага калматага сабакі, што радасна кінуўся пад ногі, ды лянівага рабога ката на падаконні. Гаспадар, скінуўшы кажух, аказаўся нізкім не дзядзькам, а прыемнага выгляду маладым мужчынам, які прадставіўся Сяргеем і пайшоў гатаваць чай. «Во прыехала!» — толькі і змагла падумаць спалохана...

Мы пілі гарбату з нейкімі зёлкамі і гаварылі ні пра што. Ад фантастычнасці сітуацыі я нават не спыталася, дзе менавіта мы знаходзімся. Яно і зразумела: мяне больш цікавіла, як сябе паводзіць і што рабіць, калі справа дойдзе да начлегу... Але выратавальнік, забраўшы пусты кубак, раптам спытаў: «Дык вам у Мінск трэба? Апранайцеся, выходзьце на вуліцу». Так і не зразумеўшы толкам, што ўвогуле адбываецца, я ўссунула на сябе куртку і боты ды выйшла на асветлены ганак. Раптам з цемры двара загуло, засвяціла фарамі нейкая вялікая (пэўна, джып), машына. «Сядайце, паехалі». «Куды?» «Як куды — у Мінск». Не паспеўшы апомніцца, я ўжо сядзела ў машыне. І мы памчалі праз мяцеліцу, спачатку па нейкай амаль лясной дарозе, пасля па трасе. Мы амаль не размаўлялі, перакідваліся нейкімі дзяжурнымі фразамі — пра надвор'е, пра Гомель. Было чамусьці так утульна і спакойна, што я праз нейкі час заснула.

Ён разбудзіў мяне ўжо на Партызанскім праспекце, спытаўца адрас. Падвёз прама да дома. На ўсе мае спробы заплаціць ці проста ад душы падзякаваць адказаў цвёрда: «Ведаеце, я столькі ў жыцці дрэннага нарабіў, што не парлавіш. І дапамагчы камусьці — гэта самае малое, каб выкупіць маю віну»... Сеў у сваю вялізную машыну і з'ехаў у тое невядомае месца, адкуль прыехаў. А я ў тую ноч доўга не спала, стаяла каля акна і глядзела, як першы снег, дагнаўшы мяне ўрэшце, пачынае засыпаць пустыя мінскія вуліцы...

КАЗКІ хаця б аднойчы ў жыцці здараюцца. Нават калі ў іх не асабліва верыш, першы снег адным сваім існаваннем нагадвае, што яны магчымыя.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# «САЦЫЯЛЬНАЯ

*Ад рэдакцыі.* ***Працягваем паглыбляцца ў таямніцы беларускай гісторыі разам з вядомым даследчыкам Аляксандрам Гужалоўскім. На гэты раз нас чакае вельмі «нязручная» тэма, якую доўгі час нельга было закрануць. Але на тое і сапраўдная навука, каб аднаўляць мінулае без прабелаў і ханжаства.***

Дарэвалюцыйныя ўлады і грамадства Беларусі ставіліся да прастытуцыі як да непазбежнага ліха. Гандаль жаночым целам рэгламентаваўся і кантраляваўся, пры гэтым сачылі за тым, каб ён займаў у беларускіх гарадах маргінальнае становішча. Тым не менш, гэтая з'ява атрымала вялікае распаўсюджанне ў беларускіх губернях. У 1889 г. у гарадах Беларусі прастытуцыяй займаліся 624 жанчыны. У 1908 г. ужо толькі ў адным Мінску была зарэгістравана 531 прастытутка. Але каб атрымаць рэальную карціну, гэтыя лічбы трэба павялічваць у пяць, а то і ў дзесяць разоў. Падчас Першай сусветнай вайны, акрамя армій краін, што ў ёй удзельнічалі, сфарміравалася яшчэ адна армія, якая была запатрабавана вайскоўцамі ўсіх нацыянальнасцяў, — армія «жанчын з нізкай сацыяльнай адказнасцю». Беларусь, якую вайна падзяліла лініяй фронту, з'яўлялася месцам іх вялікай канцэнтрацыі. Пачынаючы з 1914 г. Мінск стаў цэнтрам прыцягнення жрыц кахання з усёй Расійскай імперыі.

Такім чынам, беларускім савецкім уладам у дадатак да разбуранай вайной эканомікі, а таксама сацыяльных, нацыянальных і культурных праблем, у спадчыну ад былой імперыі дасталася складаная сацыяльная з'ява, якая зусім не ўкладвалася ў праграму пабудовы камуністычнага грамадства.

## Сярод прыхільнікаў тэорыі вольнага кахання было шмат высокапастаўленых бальшавікоў і бальшавічак

Неўзабаве пасля ўсталявання савецкай улады і з пачаткам правядзення палітыкі ваеннага камунізму прастытуцыя, для вызначэння якой улада пачала выкарыстоўваць рэвалюцыйны эўфемізм «сацыяльная хвароба», дэ-факта апынулася па-за законам. Бальшавіцкае кіраўніцтва лічыла работу прастытутак невытворчай, сацыяльна шкоднай, і таму ўспрымала іх як класавых ворагаў. Пры адсутнасці агульнай дзяржаўнай палітыкі ў гэтым пытанні мясцовыя ўлады адпаведна з уласным стаўленнем да яго накіроўвалі прастытутак на прымусовыя грамадска карысныя работы, змяшчалі іх у працоўныя лагеры альбо праводзілі з імі асветніцка-выхаваўчую работу. Адначасова былі распачатыя рэпрэсіўныя дзеянні ў адносінах да арганізатараў секс-бізнесу і гаспадароў публічных дамоў.

У Мінску дамы распусты былі забароненыя 9 жніўня 1920 г. адной з першых пастаноў Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. 17 жніўня гэтага самага года мінская міліцыя правяла масавыя арышты прастытутак і гаспадынь дамоў распусты. Падобныя акцыі праводзіліся таксама мясцовымі савецкімі ўладамі. Напрыклад, Бабруйскі рэўкам пастанавіў «...адправіць усіх гаспадынь дамоў распусты ў Смаленскі канцэнтрацыйны лагер, маёмасць жа іх канфіскаваць. Ахвяр прастытуцыі накіраваць у павятовы камітэт працы». Арганізаваная летам 1920 г. барысаўская гарадская міліцыя першапачаткова знаходзілася ў будынку нацыяналізаванага міліцыянерамі публічнага дома.

Ва ўмовах афіцыйнай забароны прастытуцыі ўтрымліваць бардэлі стала небяспечна, таму аказанне сексуальных паслуг хутка перайшло на кватэры прастытутак альбо кліентаў, у гасцініцы, лазні, паркі і іншае. Забароненая прастытуцыя пачала маскіравацца пад легальныя віды дзейнасці. Увядзенне ў 1918 г. усеагульнай працоўнай павіннасці, а таксама грамадскае асуджэнне з'явы прывялі да паступовага ператварэння гандлю жаночым целам у галіну ценявой эканомікі, якая кантралявалася сутэнёрамі. Пры гэтым адбылося рэзкае скарачэнне колькасці прафесійных жрыц кахання пры адначасовым павелічэнні колькасці «аматарак», у тым ліку непаўналетніх.

Парадаксальна, але з'яўленню на панэлі новай катэгорыі прастытутак — разведзеных жанчын, паспрыяў Кодэкс законаў РСФСР аб актах грамадзянскага стану, шлюбным, сямейным і апякунскім праве 1918 г., які пэўны час дзейнічаў таксама на тэрыторыі БССР. Шлюб не ствараў агульнай маёмасці сужэнцаў, а памеры аліментаў на дзяцей вызначаліся ў кожным асобным выпадку судом. Імкнучыся да знішчэння прыватных маёмасных адносін падчас ваеннага камунізму, заканадаўцы паставілі сабе на мэце на прававым узроўні зафіксаваць вызваленую ад усялякіх маёмасных ланцугоў сям'ю, якая павінна была грунтавацца на ідэальным каханні дзвюх асобаў рознага полу. У рэальнасці Кодэкс 1918 г. юрыдычна дазваляў мужу пакінуць былую жонку ні з чым. Становішча разведзеных жанчын ускладнялася, калі яны з'яўляліся хатнімі гаспадынямі, а таксама заставаліся з дзецьмі.

Падчас абмеркавання на сесіі ЦВК БССР у чэрвені 1926 г. праекта ўласнага беларускага Кодэкса аб шлюбе, сям'і і апецы, выступоўцы выказвалі думкі пра тое, што менавіта юрыдычная неабароненасць жанчыны ў яе шлюбных адносінах з мужчынам вядзе да «пашырэння і развіцця прастытуцыі як на вёсцы, так і ў горадзе». Падчас шырокага абмеркавання праекта на старонках беларускага друку выказвалася думка аб тым, што вельмі распаўсюджаны ў той час «фактычны» (гэта значыць без рэгістрацыі) шлюб, які паводле праекта павінен быў атрымаць юрыдычнае прызнанне, паспрыяе «павелічэнню прастытуцыі і беспрытульнасці». Логіка ў працоўнай фактычнага шлюбу была наступная: легітымізацыя шлюбападобных незарэгістраваных адносін падштурхне палігамную большасць мужчын да мнагажэнства, да чаго яны не будуць здольныя фінансава. Цярпець жа ад матэрыяльных цяжкасцяў ізноў будзе жанчына.

Нягледзячы на скептычнае стаўленне да праекта новага Кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы БССР з боку значнай часткі насельніцтва рэспублікі, ён быў прыняты ў 1927 г. і крыху палепшыў маёмаснае становішча жанчын, прынамсі тых, якія вырашылі скасаваць шлюб. У прыватнасці, артыкул 21 Кодэкса, пакінуўшы норму аб паасобнай маёмасці сужэнцаў, набытай імі да шлюбу, уводзіў роўны падзел у выніку разводу маёмасці, нажытай у грамадзянскім альбо фактычным шлюбе, незалежна ад укладу кожнага сужэнца. Аліменты на ўтрыманне дзяцей, паводле Кодэкса, таксама спаганяліся незалежна ад формы шлюбу (грамадзянскага альбо фактычнага), у якім знаходзіліся іх бацькі.




Плакат «Узмоцнім барацьбу з прастытуцыяй». 1920-я гг.

Не спрыяла барацьбе з прастытуцыяй таксама тэорыя вольнага кахання, сярод прыхільнікаў якой было шмат высокапастаўленых і шараговых бальшавікоў і бальшавічак. Рамантыка вольнага, не абцяжаранага буржуазнымі забабонамі кахання вельмі хутка дала негатыўныя вынікі ў выглядзе шматлікіх абортаў і безбацькоўства. Інстынктыўна баронячыся ад іх, «жаночыя масы» пачалі «амшчаньваць», а ўжо прывучаная да разнастайнасці мужчыны звярталіся па сексуальныя паслугі да прастытутак.

## «Чыста таварыскае палавое жыццё пачаў толькі ў мінулым годзе з прастытуткай»

Афіцыйную савецкую палітыку ў дачыненні да прастытуцыі на працягу эпохі НЭПа можна сфармуляваць наступным чынам. З аднаго боку, дзяржава ў асобе праваахоўных органаў засяроджвалася на барацьбе з арганізатарамі нелегальных формаў секс-бізнесу. У 1922 г. гэтая барацьба атрымала заканадаўчы падмурак. Артыкул 171 новага Крымінальнага кодэкса РСФСР, які таксама дзейнічаў на тэрыторыі БССР, уводзіў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам не менш за тры гады з канфіскацыяй маёмасці за сутэнёрства, утрыманне прытонаў, а таксама ўцягванне ў прастытуцыю. З другога боку, Народным камісарыятам аховы здароўя была разгорнута рэабілітацыйная работа. Юрысты, урачы, грамадскія дзеячы на старонках перыядычнага друку выступалі за вяртанне прастытутак да нармальнага жыцця, усё радзей разглядаючы іх у якасці «грамадскіх паразітаў». Яны меркавалі, што з пабудовай новага грамадства гандаль жаночым целам знікне, а перавыхаванне «ахвяр капіталістычнага ладу» і ёсць адпаведны гэтаму метад.

Абмяркоўваючы прычыны развіцця прастытуцыі як сацыяльнай з'явы ў СССР эпохі НЭПа, большасць тагачасных аўтараў пісала пра складанасць для многіх жанчын здабываць у гарадах сродкі для існавання іншымі спосабамі. Адзін з іх наступным чынам пісаў пра гэта ў сваім артыкуле, які з'явіўся ў 1923 г. у газеце «Звязда»: «Скарачэнне штатаў выкінула на вуліцу найменш кваліфікаваную рабочую сілу — работніцу. Стварыўся кадр беспрацоўных жанчын, якія папаўняюць шэрагі прастытутак».

Афіцыйная ідэалогія выключала магчымасць абмяркавання на старонках перыядычнага друку адвечнага антрапалагічнага фактару — генетычнай запраграмаванасці, схільнасці да заняткаў прастытуцыяй. Замест гэтага пашыраўся погляд на яе як на сродак зарабіць не на звычайнае, а на багатае жыццё. У той жа час прэса 1920-х дазваляе нам зірнуць не толькі на прастытутак таго часу, але таксама і на іх кліентаў. У прыватнасці, мы сустракаем дзве выразныя катэгорыі карыстальнікаў паслуг савецкіх прастытутак эпохі НЭПа: першы — «рыцары прыватнага капіталу», высокааплачваемыя чыноўнікі і спецыялісты, якія ўтрымлівалі дзяўчыну «ў шаўковых панчохах» альбо саўдаму (савецкую даму), узнаўляючы такім чынам дарэвалюцыйныя нормы сацыяпалавых адносін; другі — студэнты і рабочыя, якія карысталіся паслугамі танных прастытутак з-за нястачы грошай.

Каларытны партрэт прадстаўніка першай катэгорыі мы знаходзім на старонках аднаго з нумароў газеты «Полесская правда» за 1923 г. Яе карэспандэнт даў апісанне начнога загулу ў мясцовым доме адпачынку камісара Рагачоўскага павятовага харчовага камітэта таварыша Маркевіча з «саўпаненкамі», якіх ён прывёз на казённым экіпажы. Галасы тых, хто належаў да другой катэгорыі, гучаць у анкетах, якія запаўнялі барысаўскія маладыя рабочыя падчас сацыялагічнага апытання, што праводзілася ў горадзе ў 1928 г. Вось некаторыя вытрымкі з тых анкет: «Чыста таварыскае палавое жыццё пачаў толькі ў мінулым годзе з прастытуткай»; «З дзяўчатамі не гуляю, таму што няма ніякай карысці, а калі і ёсць, дык прыйдзецца плаціць адну трэць, а прырода сваё патрабуе. Даводзіцца шукаць такую, якая за рублёўку»; «Пачаў з 11-ці гадоў з сялянскай дзяўчынай, цяпер маю рэгулярныя зносіны з вучаніцамі».

## «Жрыцы кахання» дзяліліся на тры класы

Нягледзячы на ўсе намаганні савецкай улады, у буйных беларускіх гарадах на працягу 1920-х захоўвалася класічная трохузроўневая іерархія прастытутак. На найбольш нізкай прыступцы знаходзіліся вулічныя жанчыны, якіх кантралявалі сутэнёры і адбіралі ў іх большую частку заробку. Гэтую найбольш шматлікую катэгорыю прастытутак у гарадах БССР утваралі вясковыя дзяўчаты, якія пасля «першага падзення» былі вымушаныя сыходзіць з роднай вёскі, часта з дзіцем на руках і без матэрыяльных сродкаў. Другую, сярэднюю, прыступку займалі жанчыны, якія працавалі ў падпольных бардэлях і таксама да паловы сваіх «ганарараў» аддавалі гаспадару патаемнага лупанарыя. Нарэшце, верхнюю прыступку іерархіі займалі «савецкія паненкі» — маладыя, прывабныя, ідэалагічна не абцяжараныя сакратаркі, швачкі, эстрадныя артысткі, якія маглі задаволіць не толькі фізіялагічныя патрэбы мужчын, але таксама дапамагчы ім добра правесці час.

Карэспандэнт газеты «Звязда» наступным чынам апісваў норавы начнога Мінска ў 1923 г.:

«Прастытуцыя пышна заквітнела ў Мінску. Знакамітая Нова-Красная вуліца — асяродак распусты і венерызму дарэвалюцыйнага часу — перанесла сваю «яму» бліжэй да НЭПа, на Савецкую вуліцу. Па вечарах маса прастытутак шырокаю лаваю нясецца па цэнтральных вуліцах і алеях сквера. «Начная біржа» паказвае вялікую актыўнасць. Вярбоўка «гасцей» ідзе на ўсю моц. Мінск мае значны кадр «патэнтаваных» прастытутак. Па прыблізных даных, мінімум іх у Мінску каля 50-ці, не кажучы ўжо пра незарэгістраваных. Як памежны горад, Мінск прыцягвае таксама прастытутак і з іншых гарадоў, якія прыязджаюць сюды, спадзеючыся на лёгкую наживу. У вір трапляе таксама няўстойлівы элемент са «скарочаных». Прастытуткі ўваскрасілі ўласныя старыя традыцыі: каля кожнай утварыліся цэлыя чароды сутэнёраў і іншых «рыцараў ночы», якія неміласэрна эксплуатуюць сваіх сябровак.

Барацьба з прастытуцыяй сёння вельмі ўскладнілася. У мінулым годзе большая частка прастытутак канцэнтравалася вакол утрымальнікаў прытонаў. Гэтыя прытоны былі раскрытыя... Тады прастытуткі рассеяліся па прыватных кватэрах і гасцініцах, дзе яны пачалі працаваць «на працэнты» альбо па «дзяржразліку». Цяпер яны ў медыцынскіх адносінах зусім бескантрольныя [...] прастытуткі трапляюць да ўрача выпадкова пасля прымусу з боку міліцыі [...] У бягучы час адміністрацыйных мер уздзеяння на прастытуцыю няма. Крымінальны кодэкс прадугледжвае пакаранне толькі за ўтрыманне прытона распусты альбо за наўмыснае заражэнне венерычнаю хваробаю».

Суровая праўда сталічнага жыцця, апісаная карэспандэнтам «Звязды», не падабалася прад-

# ХВАРОБА»

## Каханне за грошы ў БССР у часы НЭПа

стаўнікам вышэйшай улады, у тым ліку тым, якія непасрэдна адказвалі за санітарны стан горада. Праз два тыдні ў "Звяздзе" з'явіўся адказ на вышэйзгаданы артыкул, падрыхтаваны намеснікам народнага камісара аховы здароўя БССР Баркусевічам, які ўбачыў у ім заклік да легалізацыі прастытуцыі. Ігнаруючы відавочныя факты, што прыводзіліся ў артыкуле, Баркусевіч безапеляцыйна заяўляў — «прастытуцыі пры сацыялізме проста не можа быць».

### Загадчык мінскага кінатэатра «Інтэрнацыянал» арганізаваў «спецыяльнае памяшканне для прастытутак» у кінабудцы

Медыкі, якія сутыкаліся з гэтай сацыяльнай з'явай не ў высокіх чынавенскіх кабінетах, а ў палявых умовах, мелі на яе зусім іншы погляд. Беларускі ўрач-венеролаг Шапіра даваў наступныя лічбы прастытутак, выяўленых у 1928 г. у гарадах БССР: Мінск — 65, Віцебск — 53, Гомель — 22, Бабруйск — 37, Слуцк — 12, Полацк — 8, Быхаў — 8, Рагачоў — 7. Але гэтыя лічбы, на думку Шапіры, былі далёка не поўныя, бо прастытуткі хавалі ўласны занятак, выдаючы сябе, напрыклад, за хатніх гаспадынь. Уласную думку доктар аргументаваў колькасцю прастытутак (каля 100), якія стацыянарна лячыліся ў той час у мінскім венералагічным дыспансеры. Гэта азначае, што для атрымання блізкай да рэальнасці карціны савецкія статыстычныя лічбы, што адлюстроўвалі ўзровень прастытуцыі, як і дарэвалюцыйныя, трэба павялічваць у разы.

Ускоснае пацвярджэнне гэтаму мы знаходзім у вядомага беларускага сацыёлага Вальфсона, які кажа пра 446 бардэляў, раскрытых міліцыяй толькі за адзін 1927 г. у васьмі акруговых цэнтрах БССР (толькі ў Гомелі іх было выкрыта 120). Той жа аўтар, які ў сваіх работах выступаў супраць "гнюснай тэорыі прыроджанай прастытуткі", дазваляе даведацца пра пэўныя дэталі гандлю жаночым целам у БССР у часы нэпа. Так, сярэдні месячны заробак прастытуткі ў Мінску складаў каля 100 рублёў у месяц (заробкі савецкіх служачых у той час складалі ад 40 да 120 рублёў, рабочых — ад 80 да 190 рублёў) пры сярэднім кошце адной паслугі 40—50 капеек. Часам падпольныя бардэлі ў беларускіх гарадах набывалі экзатычныя формы. Напрыклад, у 1928 г. загадчык мінскага кінатэатра «Інтэрнацыянал» Эйдус разам з памочнікамі, камсамольцамі Гелерам і Райцэсам, арганізавалі ў кінабудцы «спецыяльнае памяшканне для прастытутак», дзе на сродкі Белдзяржкіно заказалі ложак пад выглядам станка для работы».

Урачы Мінскага венералагічнага дыспансера на аснове праведзенага сацыялагічнага даследавання прастытутак, што праходзілі лячэнне ў 1926 г., прапанавалі наступны сацыяльны партрэт сталічнай жрыцы кахання. Яе ўзрост вагаўся ад 18 да 30 гадоў, але палавое жыццё пачыналася значна раней. 50 % апытаных ідэнтыфікавалі сябе як беларускі, 27,8 % — як яўрэйкі, 5,2 % — як полькі, 5,2 % — як рускія, 11,8 % — як прадстаўніцы іншых нацыянальнасцяў. Ва ўмовах жыллёвага крызісу месцам работы большасці мінскіх прастытутак з'яўлялася пераважна вуліца альбо парк, параднае, лесвіца.

### Гаспадыня публічнага дома па мянушцы «Кейле дзі гут» выдавала сябе за прачку

Забарона легальнай прастытуцыі не прадугледжвала пакарання жрыц кахання за занятак ёю. Аднак мяккасць пакарання за гэтае злачынства (да трох гадоў зняволення) правакавала ўсё новыя спробы асоб, не абцяжараных маральнымі якасцямі, арганізаваць прадпрыемствы па аказанні сексуальных паслуг. Неэфектыўнасць артыкула 171 Крымінальнага кодэкса РСФСР паўплывала на рашэнне беларускіх заканатворцаў у канцы 1920-х узмацніць пакаранне за гэтыя злачынствы. Артыкул 236 Крымінальнага кодэкса БССР 1928 г. прадугледжваў пазбаўленне волі ўжо да пяці гадоў за «прымушэнне займацца прастытуцыяй, зводніцтва, утрыманне прытонаў распусты, а таксама ўцягванне жанчын у прастытуцыю».

У 1923 г. былі ліквідаваныя напаўлегальныя публічныя дамы з дарэвалюцыйным стажам на Нова-Краснай вуліцы ў Мінску. Гаспадыню апошняга з іх, Кейлю Левіну па мянушцы «Кейле дзі гут», нягледзячы на яе спробы выдаць сябе за сацыяльна блізкую (прачку), асудзілі на тры гады зняволення з канфіскацыяй маёмасці. Але праз два гады ў Мінску зноў судзілі гаспадыню бардэля мадам Бернгард па мянушцы «Сорэ-дрыпе». У 1926 г. 171-ы артыкул Крымінальнага кодэкса быў прад'яўлены бабруйскім домаўладальнікам Плісу і Мееровіч, як арганізатарам падпольных бардэляў. У чэрвені 1927 г. у Мінску адбыўся суд над вядомай «гаспадыняй прытонаў распусты і вярбоўшчыцай прастытутак» Драздоўскай. У лістападзе таго ж года быў выкрыты яшчэ адзін прытон распусты ў Мінску па вуліцы Шырокай, 21. У студзені 1928 года падпольны публічны дом, арганізаваны грамадзянкай Казарыновіч, быў зачынены на вуліцы Інтэрнацыянальнай у Мінску. Прыкладна такі ж падпольны дом распусты па завулку Волі, 13 міліцыя выкрыла ў Барысаве, прыцягнуўшы яго арганізатарку грамадзянку Круглік да крымінальнай адказнасці. Уладальнік прыватнай гасцініцы «Маскоўскія нумары» ў Оршы Эстрэркін у 1923 г. быў такі ж асуджаны.



Апытанне прастытутак у лячэбна-працоўным прафілакторыі. 1920-я гг.

сама прыгавораны да двух гадоў зняволення за арганізацыю аказання сексуальных паслуг пастаяльцам. У Віцебску ішла перманентная барацьба з «прытонамі прастытуцыі», якія знаходзіліся на Елагаўскай вуліцы.

На негатыўнае стаўленне да прастытуцыі ў грамадстве ўплывалі венерычныя захворванні, на якія хварэла большасць жрыц кахання. Улетку 1919 г. у Мінскім гарадскім савецкім жаночым заразным шпіталі лекаваліся пераважна прастытуткі. Вялікі працэнт з 4 694 хворых на пранцы, зарэгістраваных у БССР у 1925 г., таксама складалі прастытуткі, прычым большасць з іх знаходзілася ў Мінскай, Віцебскай і Полацкай акругах. Найвялікшая колькасць хворых прастытутак жыла ў сталіцы БССР, насельніцтва якога крыху перавышала 100 тыс. чалавек. На працягу першага — 1923 — года работы венералагічнага дыспансера ў Мінску ў ім было зарэгістравана 36 691 наведванне, у 1924 г. — 42 390, у 1925 г. — 70 591, у 1926 г. — 85 641. Планавыя абследаванні ў працоўных калектывах і мінскіх сярэдніх школах таксама выявілі «масу хворых», якія не ведалі пра свае венерычныя хваробы.

У 1925 г. сярэдняя наведвальнасць Віцебскага скурна-венералагічнага дыспансера павялічылася ў параўнанні з 1924 г. са 158 да 190 чалавек у дзень. Урачы дыспансера былі перагружаны аглядам новых пацыентаў, значная колькасць якіх прыязджала з раёнаў. На 1925 г. было запланавана адкрыццё аддзяленняў віцебскага дыспансера ў Лёзненскім і Высачанскім раёнах, дзе «венерычныя захворванні набылі масавы характар».

З верасня 1925 г. па чэрвень 1926 г. у гомельскім венералагічным дыспансеры атрымалі дапамогу 1 557 хворых. У 1927 г. у дыспансеры абслугоўвалі ўжо да ста «венерыкаў» штодня, пры тым, што насельніцтва Гомеля складала каля 70 тысяч чалавек. Сярод пацыентаў-мужчын найбольш шматлікую прафесійную групу ўтваралі міліцыянеры, сярод жанчын — супрацоўніцы ўстаноў грамадскага харчавання. Рэзкае павелічэнне колькасці пацыентаў прымусіла загадчыка гомельскага венералагічнага дыспансера тав. Пальчыкава паставіць перад гарадскімі ўладамі пытанне аб пераўтварэнні дыспансера ў спецыялізаваны шпіталь.

Хвалі сексуальнай свабоды 1920-х даходзілі з горада да беларускай вёскі, што непазбежна прыводзіла да росту венерычных хвароб. Так, у 1925 г. у Аршанскай акрузе ў найбольшай ступені ахоплены пранцамі быў Круглянскі раён. Напрыклад, у вёсцы Радча гэтага раёна было выяўлена 13 хворых мужчын, жанчын і дзяцей. Крыніцай захворвання была мясцовая жанчына, якая патаемна займалася прастытуцыяй. У канцы 1926 г. на прамысловых прадпрыемствах Гомельскай акругі былі ўведзеныя абавязковыя агляды рабочых з мэтай выяўлення хворых на пранцы. Тады ж у вёсцы Свяцілавічы Веткаўскага раёна адкрылі першы ў Гомельскай акрузе вясковы венералагічны пункт.

### Дом беспрытульнай жанчыны імя Розы Люксембург

Неўзабаве пасля абвяшчэння БССР, у лютым 1919 г., Народны камісарыят аховы здароўя рэспублікі планаваў правесці медыцынскі агляд усіх мінскіх прастытутак дзеля таго, каб хворых адправіць у шпіталь, а здаровых перадаць у распараджэнне Наркампрацы. У верасні 1920 г. у кіраўніцтве Народнага камісарыята асветы БССР упершыню абмяркоўвалася магчымасць адкрыцця ў Мінску Дома працы для рэабілітацыі прастытутак. У Магілёве рабочая камуна для прастытутак існавала са жніўня 1922 г. Тады ж губернскі савет па барацьбе з прастытуцыяй, а таксама камісія па барацьбе з прастытуцыяй пры гаррайсавеце ўзніклі ў Гомелі. Савет і камісія планавалі адкрыць у горадзе дом для «беспрацоўных жанчын» і майстэрні, а таксама скараціць прыток маладых жанчын з вёскі ў горад.

У 1922 г. у сталіцы рэспублікі ўтварыліся Цэнтральны савет па барацьбе з прастытуцыяй пры Народным камісарыяце аховы здароўя БССР, а таксама Савет па сацыяльных хваробах, які быў закліканы вырашаць тую ж праблему. У наступным годзе ў Мінску па вуліцы Камунальнай, 18 ужо дзейнічаў адкрыты Цэнтральным саветам лячэбна-працоўны прафілакторый для прастытутак пад назвай «Дом беспрытульнай жанчыны імя Розы Люксембург». У гэтым доме жыло каля 30 жанчын. Іх тыповы дзень выглядаў наступным чынам: ранні пад'ём, сціплы сняданак, біржа працы альбо выпадковыя заробкі, вячэрняя гарбата, чытанне газет, сон. У наступныя гады Цэнтральны савет па барацьбе з прастытуцыяй пры падтрымцы сваіх аддзяленняў у акруговых цэнтрах адкрыў сетку лячэбна-працоўных прафілакторыяў у Віцебску, Магілёве, Гомелі і некаторых іншых буйных гарадах рэспублікі, дзе прастытуткі лячыліся, працавалі, вучыліся грамаце. Іх вадзілі ў кіно, на экскурсіі і нават на святочныя дэманстрацыі. У прафілакторыях існаваў жорсткі рэжым, за прастытуткамі сачылі, каб яны не збягалі на начныя падпрацоўкі.

### Кавалерыст быў збіты мінскімі прастытуткамі за недаплату

Важны ўнёсак у справу спынення гандлю жаночым целам быў закліканы зрабіць перыядычны друк. «Звязда» ў выхаваўчых мэтах друкавала споведзі прастытутак. Рэгіянальныя газеты змяшчалі артыкулы асветніцкага характару. Часопіс «Беларуская мэдычная думка» прапаноўваў чытачам спосабы абароны ад венерычных хвароб, у тым ліку найбольш надзейны — прэзерватыў, які ў той час вырабляўся з рыбінага пузыра альбо гутаперчы.

Асаблівая ўвага надавалася растлумачальнай рабоце сярод чырвонаармейцаў, якія актыўна карысталіся паслугамі прастытутак. Палітрукі і ўрачы Беларускай вайсковай акругі тлумачылі чырвонаармейцам, што палавое ўстрыманне не шкоднае для іх здароўя, а «каханне», набытае за грошы ў прастытутак — амаральнае і небяспечнае з медыцынскага пункту гледжання. На старонках газеты «Чырвонаармейская праўда» рэгулярна змяшчалі павучальныя гісторыі на тэму каварнасці пранцаў і іншых венерычных захворванняў. Выхаваўчы эфект, паводле задумы рэдактара газеты, мусіла мець змешчаная ў ёй у 1925 г. інфармацыя пра байца 72-га кавалерыйскага палка Беларускай вайсковай акругі Мінакова, які быў збіты мінскімі прастытуткамі за нядобрасумленнасць у фінансавых разліках з імі.

Барацьба з прастытуцыяй як сацыяльнай з'явай знайшла сваё адлюстраванне ў мастацкай творчасці 1920-х. Менавіта гэтай тэме была прысвечана кінастужка «Прастытутка», якая падзяляе з «Лясной быллю» славу першага беларускага мастацкага фільма. Знятая ў 1926 г. рэжысёрам Фрэліхам на фабрыцы «Белдзяржкіно», яна мела выразна акрэслены дыдактычны характар. У тым жа самым годзе газета «Чырвоная змена» змясціла нарыс пад назвай «Мярзотнік», у аснову якога быў пакладзены сапраўдны эпізод з жыцця паэта Анатоля Вольнага. У нарысе ў белетрызаванай форме быў апісаны шлях, які давялося прайсці 19-гадовай жонцы паэта ад багемнай музы да вулічнай прастытуткі. 24 сакавіка 1927 г. падчас свайго выступлення ў Віцебску Уладзімір Маякоўскі прачытаў уласны верш «Сифилис».

Але ўсе гэтыя меры нагадвалі вычэрпванне акіяна лыжкаю. Сацыяльнае, эканамічнае і культурнае дамінаванне мужчын ва ўмовах таталнага дэфіцыту ў савецкім грамадстве стваралі стабільную прапанову для іх сексуальных паслуг. Акрамя вайскоўцаў, студэнтаў, а таксама адзінокіх мужчын з іншым прафесійна-сацыяльным статусам, жаночае цела на кароткі час набывалі таксама тыя, хто імкнуўся дапоўніць рэгламентаваныя сексуальныя адносіны ў сям'і вольным сексам.

